Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 10 ліпеня 1987 г. ⊙ № 28 (3386) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

СВЯТА ПРАЦЫ, ПАМЯЦІ, МІРУ

ДРУГІ РАЗ У БЕЛАРУСКАЙ СТАЛІЦЫ ПРАЙШЛО СВЯТА ГОРАДА

Іграе аркестр імя Жыновіча.

Можна паглядзець і набыць мастацкі твор.

Летась упершыню на вуліцы і плошчы Мінска прыйшло масавае мастацка-спартыўнае свята — «Мінск-86». Яно развеяла сумненні скептыкаў: такое свята сталіцы рэспублікі неабходна. Свята гэтае — і адпачынак, і магчымасць узважыць набыткі, і жаданне мінчан зрабіць родны горад яшчэ больш прыгожым і маладым.

І сёлета да свята горада рыхтаваўся кожны працоўны калектыў, набліжэнне яго адчувалася ў кожным мікрараёне, кожным двары. Былі пасаджаны дзесяткі тысяч дэкаратыўных кустоў і дрэў, абсталявана больш за 270 дзіцячых гульневых і спартыўных пляцовак. Поруч працавалі рабочыя і інжынеры, студэнты і настаўнікі, вучні і мастакі, прадстаўнікі партыйных і савецкіх органаў — усе, хто любіць свой горад.

У штабе па правядзенні свята аднадушна пагадзіліся, што дэвізам яго будзе — «Пачуццё сям'і адзінай». Рыхтавалася яно ў рамках II Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, прысвечанага 70-годдзю Вялікага Кастрычніка. Правесці яго было вырашана 4—5 ліпеня, у дні, калі Мінск і ўся рэспубліка адзначаюць чарговую гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтыя дзве падзеі — юбілей Вялікага Кастрычніка і вызвалення ад ворагаў — найлепшым чынам сведчаць, што беларускі народ за свой светлы дзень, за свабоду і незалежнасць змагаўся поруч з прадстаўнікамі іншых народаў, і сёння ў дружнай брацкай сям'і ўпэўнена крочыць наперад.

Свята пачалося 4 ліпеня на плошчы Перамогі. Адсюль гірлянда Славы рушыла па Ленінскім праспекце, вуліцы Леніна, праспекце Машэрава да другога святога месца ў Мінску — манумента-абеліска «Мінск — горад-герой». У ганаровым эскорце, які суправаджаў гірлянду Славы, — Герой Савецкага Саюза, маршал бранятанкавых войск А. Лосік (ён камандаваў легендарнай чацвёртай танкавай брыгадай, якая вызваляла Мінск у памятным сорак чацвёртым), Герой Савецкага Саюза, былая падпольшчыца М. Осіпава, Герой Савецкага Саюза, адзін з арганізатараў партызанскага руху на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі рэспублікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны Р. Мачульскі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай прэміі, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Максім Танк.

Ля манумента-абеліска сабраліся члены аргкамітэта свята, прадстаўнікі партыйных і савецкіх органаў, грамадскасці. Намеснік старшыні Мінгарвыканкома П. Кішкурна прымае рапарты ад працаўнікоў усіх раёнаў сталіцы, аб'яўляе свята «Мінск-87» адкрытым. Белыя галубы імкліва рвуцца ў блакіт неба, гучаць дзевяць залпаў святочнага салюта — у гонар кожнага з раёнаў горада. Зводны мужчынскі хор у суправаджэнні духавога аркестра штаба Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі выконвае «Слаўся» з оперы М. Глінкі «Іван Сусанін».

Адначасова свята пачынаецца ў дзесятках месцаў горада — у парках і скверах, на агітацыйных і танцавальных пляцоўках. Спынены рух грамадскага транспарту, і Ленінскі праспект, праспект Машэрава, іншыя вуліцы ў цэнтры горада запаланіў суцэльны людскі паток. Кожны спяшаецца туды, дзе, упэўнены, можа знайсці адпачынак па густу. Арганізатары свята паклапаціліся, каб улічыць самыя розныя запатрабаванні. Ля Палаца спорту, напрыклад, як і летась, размясціліся шматлікія гандлёвыя рады. Тут жа раскінуўся маляўнічы «Кірмаш рамёстваў». Ён вабіць не толькі багаццем твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, але і магчымасцю самім паназіраць за ўмелымі рукамі народных майстроў, прасачыць, як літаральна на вачах нараджаюцца прыгожыя сурвэткі, маляўнічыя ручнікі, іншыя традыцыйныя народныя вырабы.

Цэнтральны дзіцячы парк імя Горкага быў аддадзены (дзеці зараз у піянерскіх лагерах) у распараджэнне навучэнцаў сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Тут таксама быў своеасаблівы «Кірмаш рамёстваў», ды такі, які красамоўна сведчыў: выдатнае папаўненне атры-

(Заканчэнне на стар. 2).

Ганаровыя грамадзяне горада-героя Мінска

Мінскі гарадскі Савет народных дэпутатаў прыняў рашэнне аб прысваенні званняў «Ганаровы грамадзянін горада-героя Мінска». Сярод адзначаных гэтым званнем — кампазітар, народны артыст БССР, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Уладзімір АЛОЎНІКАЎ і акадэмік, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, народны паэт Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай, Дзяржаўных прэмій СССР і БССР Максім ТАНК.

У. Алоўнікаву званне прысвоена за стварэнне музычных твораў ваенна-патрыятычнай тэматыкі, прысвечаных працоўным і ратным подзвігам савецкага народа і гораду-герою Мінску, актыўную педагагічную і грамадскую дзейнасць; Максіму Танку — за вялікі ўклад у развіццё савецкай літаратуры і культуры, прапаганду ратнага і працоўнага подзвігу беларускага народа, актыўную грамадскую дзейнасць.

АЎТАР ПЕСНІ— САКРАТАР ГАРКОМА

Незвычайны вечар, на які ўпершыню сабраліся маці-гераіні з усяго раёна, адбыўся ў Лунінцы. Задушэўнай песняй пра мацярок, што нарадзілі і выхавалі дзесяць і больш дзяцей, адкрыў урачыстасць народны хор налгаса імя Калініна. Словы песні напісаў першы сакратар Лунінецкага гаркома КП Беларусі М. Прасмыцкі, музыку — брэсцкі кампазітар А. Шутаў.

М. Прасмыцкі даўно піша вершы пра свой родны край, пра людзей стваральнай працы. Многія з іх друкаваліся ў «Сельской газете», у брэсцкай абласной газеце «Заря». Песня ж, якая прагучала на сустрэчы маці-гераінь, кранула сваёй цеплынёй, лірызмам.

У ДАРУНАК ДЗЕЦЯМ

Саюз мастакоў Беларусі перадаў у дарунак Жлобінскай школе-інтэрнату для сірот і дзяцей, якія засталіся без апякунства бацькоў, творы вядомых жывапісцаў. Сярод іх — пейзажы «Вясна» М. Казакевіча, «Жытнёвае поле» П. Масленікава, палотны «Мінск. Дарога ў Загор'е» В. Вярсоцкага, «Ля калодзежа» Л. Асядоўскага, камплект дэкаратыўных талерак Э. Фокінай «Цырк», габелен Г. Стасевіч «Купалле» і інш.

Усяго перададзена твораў амаль на восем тысяч рублёў.

УНУМАРЫ:

Узбагачаць духоўнае жыццё народа
Справаздача з партыйнага сходу СП БССР 3—4

Час праўды
Развагі А. СІДАРЭВІЧА пра паэмы А. БАЧЫЛЫ і С. ГРАХОЎСКАГА 5—6

На крылах паэтычнай рамантыкі
Да 105-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы 7

ПАЭЗІЯ
Урывак з паэмы А. ЗАРЫЦКАГА
Новыя вершы Р. ТАРМОЛЫ 8—9

З пункту гледжання мэтазгоднасці
Нататкі М. ЗАМСКАГА з абмеркавання ў АН БССР праблем аховы прыроды 12

У АДЗІНАЙ СЯМ'І

«Мы, беларусы, з братняю Руссю разам шукалі к шчасцю дарог...» — гэтыя словы з Дзяржаўнага гімна Беларускай ССР І. Асінскі і А. Пальчэўскі згадваюць у самым пачатку брашуры «Мы — савецкія», выпушчанай выдавецтвам «Беларусь» на рускай мове і ў перакладзе на некаторыя замежныя мовы ў серыі «Савецкая Беларусь». Адрасаваная гасцям рэспублікі і, у першую чаргу, замежным турыстам, яна знаёміць з жыццём беларускага народа ў адзінай савецкай сям'і.

Аўтары нагадваюць асноўныя вехі фарміравання СССР, важнейшыя этапы вырашэння нацыянальнага пытання, паказваючы, што толькі дзякуючы Савецкай уладзе былыя адсталыя ўскраіны царскай Расіі, у тым ліку і Беларусь, у гістарычна кароткі прамежак часу змаглі дасягнуць свайго небывалага сацыяльнага, эканамічнага і культурнага развіцця, а з утварэннем Савецкага Саюза сталі роўнымі сярод роўных. Гэтая дружба, замацаваная ў час першых пяцігодак, яшчэ больш акрэпла ў гады Вялікай Айчыннай вайны, каб узняцца на новую вышыню сёння, калі краіна ўступіла ў перыяд свайго далейшага рэвалюцыйнага пераўтварэння.

Узнікла не толькі эканамічная інтэграцыя, але і духоўнае адзінства людзей розных нацыянальнасцей, той маральны свет, які, па словах Генрыха Мана, не ведае «ні прэцэдэнтаў, ні параўнанняў».

Раскрываючы значэнне культурнага супрацоўніцтва народаў СССР, аўтары найперш звяртаюцца да тых момантаў інтэрнацыянальнага жыцця, з якіх яскрава відаць, што дае беларускаму народу знаходжанне ў складзе Савецкага Саюза.

Сваімі думкамі дзеляцца на старонках кнігі старшыня Беларускага рэспубліканскага аддзялення садзеяння Савецкаму фонду міру народны мастак СССР З. Азгур і намеснік старшыні фонду М. Ягораў, дырэктар выдавецтва «Юнацтва» паэт В. Лукша і настаўніца беларускай літаратуры і мовы В. Кузьміч, супрацоўнік сакратарыята БССР па справах ЮНЕСКА А. Лапцёнак і кампазітар В. Помазаў (інтэрв'ю ўзята незадоўга да яго смерці) і іншыя.

У нашай рэспубліцы жыве нямала прадстаўнікоў іншых нацый, якія тут знайшлі другую радзіму. Аб гэтым гаворка ў нарысах «Справа майстра баіцца», «Сыны Фердынанда Шміта», «Зямля Ліпкіных» і іншых. «Мы — савецкія,— аднадушна мяркуюць беларус і рускі, украінец і армянін, яўрэй і немец, аб лёсах якіх мы расказвалі ў гэтай кнізе»,— гавораць аўтары. Гэтую размову аб паспяховым вырашэнні нацыянальнага пытання ў нашай рэспубліцы, аб інтэрнацыянальным выхаванні працоўных, аб дружбе і ўзаемаразуменні паміж прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей Савецкага Саюза добра дапаўняюць шматлікія каляровыя здымкі — мастацкі летапіс дружбы і братэрства.

К. РУДЗЕНЯ.

Дзень добры, Масква!

Днямі беларускай культуры ў Маскве можна назваць апошнія тыдні чэрвеня, калі масквічы мелі магчымасць не толькі пазнаёміцца, а і выказаць шчырае захапленне тым даволі шырокім гастрольным рэпертуарам, з якім прыехаў у Маскву Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Да гэтых Дзён быў прымеркаваны і літаратурны вечар, які адбыўся 27 чэрвеня ў Цэнтральным Доме літаратараў імя А. Фадзеева, прысвечаны 70-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Не трэба тлумачыць хваляванне (непакоілася кансультант па беларускай літаратуры СП СССР Г. Грыбоўская, непакоіліся мы, удзельнікі вечара)—дзень быў суботні, надвор'е надзіва летняе і не-не-ды і мільгала думка: а ці зацікавяцца масквічы нашым святам, бо для нас гэта сапраўды было свята. Не так ужо і часта гучыць беларускае паэтычнае слова ў маскоўскіх аўдыторыях. Але хваляванне было дарэмным. Зала была перапоўнена. І ад самых першых хвілін, калі слова ўзяў крытык В. Аскоцкі, выказвала цёплую зацікаўленасць да нашай літаратуры, якая з'яўляецца адной з самых яркіх старонак усёй шматнацыянальнай савецкай літаратуры, якая дала не толькі ўсесаюзнаму, але і сусветнаму чытачу не адзін выдатны твор прозы, паэзіі, публіцыстыкі. Пра гэта якраз і сказаў вядомы літаратуразнаўца ў сваім уступным слове.

Пра дасягненні нашай літаратуры, пра тыя задачы, якія ставіць перад ёю сённяшні дзень, глыбока і пранікнёна гаварыў старшыня праўлення СП БССР Максім Танк. І нібыта нейкая новая хваля цеплыні ўлілася ў залу, калі прагучалі вершы нашага народнага паэта. Яго натхнёнае паэтычнае слова адразу настроіла слухачоў на Паэзію, на шчыры эмацыянальны лад. І якімі ж шчодрымі, гарачымі былі воплескі, калі гучалі вершы У. Някляева і Т. Бондар. Урывак з паэмы У. Някляева «Зона», а таксама лірычны маналог Т. Бондар «Ты снішся мне, Няміга!» яскрава расказалі слухачам пра турботы сённяшняга дня і пра той боль, якім поўніцца наша гісторыя.

Усхваляванае пачуццё вялікай павагі і любові да нашай зямлі, да нашага народа чулася ў слове старшыні Савета па беларускай літаратуры Я. Хелемскага; у вершы, які прачытаў вядомы паэт і перакладчык, нібыта выткаўся светлы вобраз Беларусі.

Слова даецца А. Дудараву. Многія з прысутных паспелі паглядзець спектаклі па п'есах вядомага драматурга, цяпер іх чакала яшчэ адна сустрэча— са спектаклем «Вечар». А. Дудараў расказаў пра развіццё сучаснай беларускай драматургіі, адказаў на пытанні, пасля чаго ў самых цёплых словах расказаў пра акцёраў, занятых у спектаклі.

І ў заключэнне вечара, на той жа самай пранікнёнай хвалі, нібыта падсумоўваючы агульны настрой ветлівасці і сардэчнасці, выступіў сакратар праўлення СП СССР К. Скварцоў.

На вечары прысутнічалі інструктар сектара мастацкай літаратуры Аддзела культуры ЦК КПСС А. С. Філін, а таксама загадчык сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ А. І. Бутэвіч.

Несканчона доўга гучалі ўдзячныя воплескі пасля спектакля. У іх чуліся і душа, і сэрца. І, напэўна ж, яны былі сардэчным вітаннем, звернутым да ўсёй нашай рэспублікі, да ўсёй нашай літаратуры. Здавалася б, тут можна было б і паставіць кропку, але ж... Шкада, што тыя, хто прыйшоў на гэтае, несумненна, свята нашай літаратуры, не змаглі атрымаць аўтографы, не змаглі набыць кніжкі, скажам, той жа самы наш «Дзень паэзіі». Не было таксама і сувеніраў, што надало б усёй атмасферы вечара дадатковы каларыт.

Раіса БАРАВІКОВА.

СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ

Новыя і новыя пакаленні будуць далучацца да гістарычных дакументаў Вялікага Кастрычніка — газетных хронік 1917 года, успамінаў удзельнікаў рэвалюцыйнай барацьбы з самадзяржаўем, іншых матэрыялаў.

Гэтыя дакументы ўяўляюць цікавасць асабліва цяпер, калі ідзе падрыхтоўка да 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Яны і сабраны ў кнізе «Палыхала зара новай эры» (складальнік кандыдат гістарычных навук А. Кузняеў), выпушчанай выдавецтвам «Беларусь».

Матэрыялы ў храналагічнай паслядоўнасці адлюстроўваюць рэвалюцыйную абстаноўку ў Петраградзе і Маскве на працягу студзеня — лістапада 1917 года, а таксама расказваюць аб падзеях, якія адбываліся ў гэты час на тэрыторыі Беларусі і Заходняга фронту. Яны сведчаць аб тым, што барацьба працоўных Беларусі пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў была састаўной часткай агульнарасійскага рэвалюцыйнага працэсу, а беларусы за сваё сацыяльнае і нацыянальнае разняволенне ішлі ў агульнай шарэнзе з прадстаўнікамі іншых народнасцей, у першую чаргу з вялікім рускім народам.

А. ВІШНЕЎСКІ.

СВЯТА ПРАЦЫ, ПАМЯЦІ, МІРУ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1).

мае рабочы клас рэспублікі, на заводы і фабрыкі, у сферу абслугі прыйдуць не проста ўмелыя, а таленавітыя, ініцыятыўныя юнакі і дзяўчаты...

Парк імя Янкі Купалы стаў на два дні «Паркам мастацтваў». На набярэжных Свіслачы прафесійныя і самадзейныя мастакі выставілі дзесяткі сваіх работ. Выставілі не толькі на агледзіны, але і на продаж. Пры жаданні тут жа можна заказаць і атрымаць уласны партрэт — дастаткова папазіраваць некалькі мінут мастаку...

Непадалёку сабраліся аматары шахмат: там міжнародны гросмайстар В. Купрэйчык гуляе адразу з дваццаццю сапернікамі...

А ў глыбіні парку, адтуль, дзе ўзвышаецца помнік народнаму песняру Янку Купалу, плывуць мілагучныя, чароўныя мелодыі. Гэта «Беларускімі малюнкамі» М. Чуркіна пачаў сваё выступленне Дзяржаўны народны аркестр БССР імя І. Жыновіча.

Канцэрт збірае ўсё больш аматараў беларускай музыкі. Гучаць «Беларускія танцы» І. Жыновіча, кранае сваёй меладычнасцю вядомая песня Н. Сакалоўскага на словы А. Астрэйкі «Нёман» у выкананні саліста Беларускай дзяржаўнай філармоніі Ф. Савасцянава...

Эстафету ад жыновічаўцаў прымаюць пісьменнікі. Мінісвята паэзіі адкрывае сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі В. Зуёнак. Свае вершы чытаюць Я. Янішчыц, Б. Спрынчан, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, У. Паўлаў, С. Законнікаў, У. Някляеў, Г. Булыка, Н. Гілевіч, а таксама вядучы паэтычнага свята В. Зуёнак. Што творчасць іх знаюць і любяць чытачы, найлепшым чынам сведчыць чарга... па аўтографы,— балазе, у парку працавала шмат выязных кніжных кіёскаў з багатым выбарам беларускай літаратуры.

З самымі маленькімі чытачамі, а правільней сказаць, са слухачамі сустрэліся А. Вольскі, Н. Галіноўская, П. Прудзікаў, С. Шушкевіч...

Факел, запалены ля Вечнага агню на плошчы Перамогі, дастаўляецца на стадыён «Дынама», чашу якога познім вечарам запоўнілі звыш 50 тысяч чалавек. Да прысутных звяртаецца старшыня Мінскага гарвыканкома У. Міхасёў. Ён паведамляе, што нядаўнім рашэннем гарвыканкома прысуджана званне «Ганаровы грамадзянін горада-героя Мінска» тым, хто сваёй працай унёс асабліва важкі ўклад у жыццё горада. Дружнымі воплескамі вітаюць прысутныя маршала бранятанкавых войск А. Лосіка, вядомага далёка за межамі рэспублікі і краіны ўрача Т. Бірыч, будаўніка А. Громава, кампазітара, народнага артыста БССР У. Алоўнікава і народнага паэта Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Ленінскай прэміі Максіма Танка.

Праз некаторы час стадыён сустракае воплескамі прозвішчы пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, якое праводзілася напярэдадні свята «Мінск-87».

Прадстаўленне на стадыёне спалучала ў сабе элементы мастацка-спартыўнай відовішчнасці з ушанаваннем лепшых людзей горада, ім адрасавалі свае лепшыя нумары ансамблі «Верасы», «Песняры», «Сябры», «Сузор'е».

Напамінкам аб тым, як важна берагчы мір на зямлі, сумесна змагацца за тое, каб выратаваць наш агульны дом ад тэрмаядзернай катастрофы, прагучала ў фінале выкананая аб'яднаным тысячагалосым хорам песня «Пакуль не позна». Гэта напамінак жыў у сэрцы кожнага, хто прымаў удзел у свяце «Мінск-87», у свяце, якое паяднала ў сабе дзень учарашні і дзень сённяшні, якое ўшанавала памяць аб незабыўных гадах вайны і прадэманстравала працоўныя поспехі, з якімі сёння паўтарамільённы Мінск — горад-герой, горад-салдат, горад-працаўнік — ідзе насустрач 70-годдзю Вялікага Кастрычніка.

НАШ КАР.

В. Зуёнак і Н. Гілевіч сярод чытачоў.

Ткуцца ручнікі.



На выстаўцы антыкварных аўтамабіляў.

Фота А. КАЛЯДЫ.

ШЧЫРАЯ РАЗМОВА

Тэлемост «Мінск—Варшава»

Паняцце «тэлемост» даўно і трывала ўвайшло не толькі ў арсенал тэлевізійных сродкаў, але і зрабілася фактам нашага жыцця. Асабліва вялікую аўдыторыю збіраюць міжнародныя тэлемасты. Па форме перадачы гэтыя—жывы дыялог, у якім прымаюць удзел і тыя, хто знаходзіцца непасрэдна ў тэлестудыі, і тыя мільёны гледачоў, што ўдзельнічаюць у размове, так сказаць, за кадрам. З дапамогай тэлемастоў савецкія гледачы змаглі пагаварыць з жыхарамі Нью-Йорка і Бостана, Філадэльфіі і Сіэтла, Лондана і Токіо.

Зусім нядаўна тэлемасты звязалі Маскву і Сафію, Маскву і Дэлі, і вось — новая сустрэча ў эфіры. На гэты раз — паміж жыхарамі сталіцы Беларусі і варшавянамі. Падрыхтавала перадачу, якая выйшла ў эфір 4-га ліпеня, Беларускае тэлебачанне сумесна з Галоўнай рэдакцыяй прапаганды ЦТ.

Высокую рэпутацыю ў свеце заваявалі мінскія трактары «Беларусь». Добра вядома на сусветным рынку і марка варшаўскага «Урсуса». Работнікі гэтых перадавых сучасных прадпрыемстваў і сталі ўдзельнікамі тэлемоста. Ім было пра што сказаць адзін аднаму, пра што спытаць. Надзвычай высокую цікавасць аўдыторыі ў Варшаве выклікала ўсё, што звязана з перабудовай у нашай краіне, з рашэннямі апошніх Пленумаў ЦК КПСС. Рабочых МТЗ цікавіла, як ідуць пераўтварэнні ў эканоміцы ПНР, якія канкрэтныя дасягненні ёсць у рабоце «Урсуса», як укараняецца на заводзе брыгадны падрад, павышаюцца тэмпы росту прадукцыйнасці працы. У шчырай размове закраналіся не толькі дасягненні абодвух калектываў, але і праблемы, якіх нямала ёсць яшчэ у рабоце і беларускіх трактарабудаўнікоў і іх польскіх калег.

Польскіх і беларускіх рабочых цікавіла ўсё: умовы працы ў сваіх сяброў, тое, як вырашаюцца сацыяльныя пытанні— у прыватнасці, праблема жылля. Да размовы падключыліся віцэ-прэзідэнт Варшавы В. Лазінскі і намеснік старшыні Мінскага гарвыканкома М. Макаед. Яны расказалі, што робіцца дзеля вырашэння гэтай вострай праблемы ў сталіцы Польшчы і ў Мінску.

Многае звязвае беларускі і польскі народы. Пра гэта гаварылі ў перадачы і ветэраны вайны — удзельнікі сумеснай барацьбы супраць фашызму, і перадавікі вытворчасці МТЗ і «Урсуса». Паміж гэтымі прадпрыемствамі існуюць традыцыйныя сувязі. Сувязі гэтыя неабходна развіваць і надалей. Гэтую думку выказалі ўсе ўдзельнікі перадачы. Апладысментамі сустрэлі прысутныя прапанову правесці абмен маладзёжнымі брыгадамі паміж польскім і савецкім прадпрыемствамі. Развіццё дружалюбных кантактаў працоўных Савецкай Беларусі і братняй Польшчы будзе выдатным укладам у развіццё інтэрнацыянальных сувязей паміж краінамі сацыялізму, ва ўмацаванне міру ва ўсім свеце. Такой была ідэя тэлемоста «Мінск — Варшава».

Удзельнікі перадачы абмяняліся музычнымі прывітаннямі: у ёй выступілі ансамбль з Мінска «Верасы» і польскі ансамбль «Скальды».

Дапамаглі ўдзельнікам тэлемоста весці дыялог журналісты Беларускага тэлебачання І. Рудамётаў і А. Марозаў.

АБ ПАЛЕСКАЙ ЗЯМЛІ

Як і ўся Беларусь, багатая на народныя таленты Гомельшчына. Асабліва тут развіта ткацтва. Хто не ведае вядомых на ўсю краіну неглюбскіх ручнікоў! Гэты від творчасці любяць і ў такіх раёнах, як Хойніцкі, Калінкавіцкі, Лоеўскі, Жыткавіцкі і іншых.

Работы гомельскіх ткачых склалі адзін з раздзелаў абласной выстаўкі самадзейнага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прысвечанай 70-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Парадавалі і жывапісцы. Асабліва палотны дэбютанта Н. Асауляка, а таксама творы П. Шалюты, М. Хадановіча, М. Лапіцкага, Ф. Шклярава.

З разьбяроў хочацца адзначыць Б. Васількова (работы «Барабаншчык», «Мальчыш-Кібальчыш», «Няхай заўсёды будзе сонца») і Н. Цітова (цыкл «Кошт хлеба»).

А. ШЫРОКІ.

Узбагачаць духоўнае жыццё народа

Аб месцы пісьменніка-камуніста ў перабудове, ва ўзбагачэнні духоўнага патэнцыялу нашага грамадства, у барацьбе за сацыяльную справядлівасць, супраць застойных з'яў у эканоміцы і культуры зацікаўлена і страсна гаварылі ўдзельнікі партыйнага сходу, які адбыўся нядаўна ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі. Абмеркаваны задачы камуністаў саюза, якія вынікаюць з рашэнняў студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС.

З дакладам на сходзе выступіў сакратар ЦК КПБ В. А. Пячэннікаў. Роля пісьменніцкай арганізацыі ва ўсіх сферах грамадскага жыцця рэспублікі сёння вельмі высокая, сказаў ён. Такой жа высокай павінна быць і адказнасць кожнага літаратара за свае справы, учынкі, за ўсё напісанае і сказанае, за ўсё тое, што робіцца ў творчым саюзе.

Ва ўмовах дэмакратызацыі і перабудовы ўсіх бакоў грамадскага жыцця наш народ глядзіць на пісьменнікаў больш патрабавальна, чым калі-небудзь. Ён чакае ўдумлівага аналізу, добрай парады па многіх злабадзённых пытаннях — як жыць па праўдзе, асэнсавана і паўнацэнна, як спалучаць грамадскі і асабісты інтарэс. Сёння, як ніколі, усе чытачы, асабліва моладзь чакаюць ад пісьменніка мудрага слова аб сэнсе і мэце жыцця, аб справядлівасці і дабры, аб шчасці.

Значыць, пісьменніцкія клопаты аб сацыяльнай і грамадзянскай напоўненасці творчасці таксама павінны быць значна вышэйшымі. Каб выхоўваць людзей, фарміраваць іх погляды і густы, трэба самому быць перакананым барацьбітом за новыя пераўтварэнні, з дакладных пазіцый марксізму-ленінізму ацэньваць усё, што адбываецца цяпер, трэба не на словах, а ў першую чаргу сваёй творчасцю ўсталёўваць асноватворныя прынцыпы савецкай літаратуры — партыйнасць і народнасць, гуманізм і высокую духоўнасць. Мы будуем новае сацыялістычнае грамадства і, як і раней, непахісна верныя яго асноватворным каштоўнасцям і ідэалам.

На чэрвеньскім Пленуме ЦК КПСС адзначалася, што настаў час кардынальных змяненняў, рашучага пераадолення застойных працэсаў, стварэння надзейнага, эфектыўнага механізма паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця, працягваў дакладчык. Па сутнасці справы размова ідзе аб якасна новай канцэпцыі гаспадарчага кіравання. Скажу без перабольшання: поспехі на гэтым напрамку, тэмпы вырашэння накопленых сацыяльна-маральных і эканамічных праблем, авалодання новымі метадамі гаспадарання залежаць таксама і ад ідэалагічнай работы, ад работнікаў навукі, культуры, у тым ліку і ад пісьменнікаў. Ад таго, як вы іх бачыце, як аб іх разважаеце, якую грамадскую думку фарміруеце, наколькі кампетэнтна пішаце аб іх.

Рэалізацыя задач паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу патрабуе ўздыму на больш высокі ўзровень усёй сістэмы ідэйна-выхаваўчай, арганізацыйнай і гаспадарчай работы. Ці ёсць тут поле дзейнасці для пісьменнікаў? Безумоўна. І публіцыстычнае слова, і вуснае выступленне літаратара, і публікацыі ў часопісах павінны быць накіраваны на тое, каб не даць прарасці зярнятам сумнення і абывацельскага кансерватызму: «занадта высокія рубяжы», «занадта вялікія тэмпы», «аб'ектыўныя ўмовы не дазваляюць» і іншае.

Сёння неабходна памятаць, што вялікія справы пад сілу толькі людзям, маральна і псіхалагічна падрыхтаваным, упэўненым у іх ажыццяўленні. Дасягнуць новых вышынь у гаспадарча - эканамічнай, сацыяльна - культурнай дзейнасці можна толькі настроіўшыся на іх належным чынам. Ажыццявіць такую ўсвядомленую настроенасць магчыма намаганнямі ўсіх кадраў, якія вядуць выхаваўчую работу, у тым ліку і пісьменнікаў. Да слова пісьменнікаў сёння прыслухоўваюцца, яно фарміруе грамадскую думку. Трэба толькі хацець і ўмець бачыць рэальнае жыццё, мець жаданне ў яго ўрывацца. І тады паявяцца і новыя кнігі публіцыстыкі, і нарысы, і, хочацца верыць, творы больш буйных мастацкіх форм аб характары нашага сучасніка — тварца і ўдзельніка перабудовы.

Усіх нас непакоіць, працягваў дакладчык, што творы высокага грамадзянскага гучання і сапраўды мастацкага майстэрства ўсё яшчэ з'яўляюцца рэдкасцю, належаць у асноўным асобным дзеячам літаратуры і мастацтва. Хіба мы не бачым і не павінны задумвацца над тым, што ў беларускай літаратуры вялікі паток прадукцыі па сваіх ідэйна-мастацкіх якасцях арыентаван на так званы «сярэдні» ўзровень?

Не сакрэт, што сёння агульнаадукацыйная і прафесіянальная школы не могуць нармальна функцыяніраваць без цеснай сувязі з творчымі саюзамі. Пытанні маральнага, эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення сталі вызначальнымі, і вырашаць іх трэба ўсім разам, супольна. Цяпер ідэалагічныя міністэрствы і ведамствы, творчыя саюзы ўнеслі на разгляд у Савет Міністраў БССР «Комплексны план эстэтычнага выхавання насельніцтва рэспублікі на перыяд да 2000 года». Ён прадугледжвае ажыццяўленне мер па эстэтычнаму выхаванню людзей у працоўных калектывах, у навучальных установах, па эстэтызацыі навакольнага асяроддзя, па арганізацыі вольнага часу, удасканаленню выхаваўчай работы па месцы пражывання, стварэнню і распаўсюджанню мастацкіх каштоўнасцей. Рэалізацыя мерапрыемстваў, прадугледжаных комплексным планам, дазволіць стварыць сістэму няспыннага эстэтычнага выхавання насельніцтва рэспублікі, умацаваць яго матэрыяльна-тэхнічную базу.

Чакаецца вялікая работа. Удзел у ёй — гэта і абавязак літаратараў, сацыяльны заказ грамадства, ажыццяўленне якога будзе садзейнічаць духоўнаму станаўленню моладзі. Перш за ўсё ў яе трэба фарміраваць і развіваць высокія маральныя каштоўнасці, якія заўсёды былі ўласцівы нашаму народу і якімі мы па праву ганарымся, — ідэйную перакананасць, працоўны энтузіязм, савецкі патрыятызм.

Сённяшні чытач з асаблівай цікавасцю звяртаецца да тых твораў, у якіх з усёй вастрынёй узнімаюцца праблемы маралі, сацыяльнай справядлівасці, духоўнасці. Ёсць такія творы і ў беларускай літаратуры. Аднак пабудаваны яны больш на гістарычных фактах, звернуты ў мінулае. А вось твораў, у якіх на матэрыяле сучаснасці, сённяшняй рэчаіснасці ярка і памастацку выразна сцвярджаліся б асноватворныя маральныя прынцыпы, усё яшчэ востра не хапае.

Асабліва трэба спыніцца на праблеме адносін да праўды ў мастацкай творчасці. Усталёўваць праўду — значыць з навуковага пункту погляду растлумачваць непарыўнае адзінства мінулага, сучаснага і будучага ў інтарэсах патрыятычнага, інтэрнацыянальнага выхавання людзей, правільнага фарміравання іх светапогляду. Гэта значыць спакойна, без лішняга ажыятажу і сенсацыйнасці асэнсоўваць усе перыяды нашай гісторыі. Гэта павінен быць сумленны, мастацкі, захапляючы летапіс, які б раскрываў гераічны шлях нашага народа.

У апошні час мы больш прадметна пачынаем займацца пытаннямі глыбокага асэнсавання літаратурна-мастацкай спадчыны, сказаў далей В. А. Пячэннікаў. Узрасла да яе цікавасць грамадскасці, што зусім заканамерна. Прэзідыуму Акадэміі навук і прэзідыуму праўлення Саюза пісьменнікаў БССР даручана падрыхтаваць і выдаць лепшыя творы Алеся Гаруна.

У тонкай справе асэнсавання мастацкай спадчыны, з аднаго боку, мы не павінны страціць ніводнага дастойнага твора, напісанага нашымі папярэднікамі. З другога боку, гісторыю трэба вывучаць, памятаючы аб метадалагічных арыенцірах марксізму-ленінізму, з класава-партыйных, прынцыповых пазіцый. Няма і не павінна быць даравання людзям, якія заплямілі сябе супрацоўніцтвам з гітлераўскімі акупантамі, з ворагамі Савецкай улады, людзям, якія выступалі і словам, і справай супраць нашага ладу.

Сёння цікавасць да беларускай культуры, да яе вытокаў, гісторыі народа шырыцца і расце. Гэта знаходзіць сваё выражэнне, у прыватнасці, ва ўтварэнні шматлікіх аб'яднанняў па вывучэнню літаратурнай і гістарычнай спадчыны, клубаў па краязнаўству і іншых. Разумныя пачынанні ў гэтым руху трэба падтрымліваць, ствараць для іх праяўлення неабходныя ўмовы. Не варта, аднак, забываць, што тут часам узнікаюць пытанні, да якіх трэба адносіцца з класавых пазіцый, з грамадзянскай і партыйнай прынцыповасцю.

Партыйным арганізацыям, камуністам, усім творчым работнікам трэба даваць рашучы адпор усякім спробам пад выглядам клопатаў аб нацыянальнай культуры адраджаць варожыя нам ідэйныя канцэпцыі, усёдаравальна адносіцца да людзей, вядомых як прамыя і бескампрамісныя ворагі і Савецкай улады, і беларускага народа.

Напярэдадні 70-годдзя Вялікага Кастрычніка, па меры таго, як у савецкім грамадстве ўсё больш рашуча бяруць верх стваральныя асновы, нашы праціўнікі за рубяжом робяць адчайныя спробы да ачарнення працэсу перабудовы, практыкі эканамічнага і культурнага будаўніцтва. Як адзначаў у дакладзе на чэрвеньскім Пленуме ЦК КПСС М. С. Гарбачоў, «...галоўную стаўку робяць на тое, каб, выкарыстоўваючы працэс дэмакратызацыі, публічнасці, падкінуць нам ілжывыя мэты і заганныя каштоўнасці, пасеяць сумненні ў нашых людзей у правільнасці і шчырасці палітыкі партыі, лініі на перабудову, на паляпшэнне спраў у краіне».

Яны груба фальсіфікуюць наша гістарычнае мінулае, расхвальваюць уяўныя заслугі буржуазных нацыяналістаў, з усіх сіл стараюцца адшукаць антысаветызм або «скрытае супраціўленне» праводзімым пераўтварэнням у класікаў і сучасных дзеячаў савецкай, у тым ліку беларускай, літаратуры і мастацтва. Калі ж па зразумелых прычынах яны іх не знаходзяць, тут жа пускаюцца ў ход самыя гнюсныя выдумкі, падтасоўкі. Цяпер вастрыё «радыёгаласоў» накіравана на кампраметацыю нацыянальнай палітыкі нашай партыі, распальванне нацыяналістычных і шавіністычных настрояў, на тое, каб пасеяць у савецкім грамадстве варожасць і недавер'е адзін да аднаго.

Прынцыповая пазіцыя па нацыянальнаму пытанню была выражана на XXVII з'ездзе КПСС, падкрэсліў дакладчык. Партыя выказалася за паважлівыя адносіны і да нацыянальнага пачуцця, і да гісторыі, і да культуры, і да моў усіх народаў, за іх поўную і фактычную роўнасць.

Паслядоўнае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі прадугледжвае і своечасовае вырашэнне ўзнікаючых у сферы нацыянальных адносін праблем. Арыентацыя на іх беспраблемнасць памылковая. Таму давайце з гэтых пазіцый, спакойна паспрабуем разабрацца ў пытаннях, якія ўзніклі ў нас. Вялікі Кастрычнік, сацыялізм далі беларускаму народу, як і ўсім народам краіны, фактычную і юрыдычную роўнасць ва ўсіх сферах жыцця. Толькі пасля Кастрычніка пачалося паўнацэннае і бурнае развіццё беларускай мовы як мовы зносін, літаратурнай, навуковай мовы. На нашай роднай мове створаны багацейшая літаратурная класіка, мастацтва. На нядаўнім пленуме Саюза пісьменнікаў БССР адзначаліся бясспрэчныя поспехі беларускай філалагічнай навукі, гаварылася аб шматлікіх выданнях розных слоўнікаў і даведнікаў, 30-томнага збору нацыянальнага фальклору, збору помнікаў гісторыі і культуры, значным расшырэнні выдання літаратурнай класікі і многім іншым.

Разам з тым нельга не сказаць, што ў апошнія гады адзначаюцца тэндэнцыі звужэння сферы карыстання беларускай мовай як сродкам зносін. На гэта ёсць сур'ёзныя аб'ектыўныя прычыны. Паглыбляецца інтэрнацыяналізацыя грамадскага жыцця ў нашай краіне. У рэспубліцы ў працэсе урбанізацыі значная частка насельніцтва, асабліва маладога ўзросту, стала гараджанамі, дзе традыцыйна складваліся многанацыянальныя працоўныя калектывы і пераважала руская мова. Расце абмен кадрамі паміж брацкімі рэспублікамі. Усё больш становіцца рознанацыянальных шлюбаў. Гэтыя і іншыя аб'ектыўныя працэсы абумоўліваюць развіццё нацыянальна-рускай двухмоўнасці.

Былі і суб'ектыўныя прычыны. У пяцідзесятых і шасцідзесятых гадах узмацнілася бескантрольнае вызваленне вучняў ад вывучэння беларускай мовы, што прывяло да скарачэння беларускамоўных школ. Органы народнай асветы своечасова не заўважылі і па сутнасці пусцілі на самацёк гэты працэс. Таму галоўныя намаганні сёння трэба сканцэнтраваць перш за ўсё на тым, як выправіць становішча, а не на пошуку вінаватых.

Хацелася б напомніць, што пытанні развіцця нацыянальных моў і культур нельга разглядаць у адрыве ад іх узаемаўплыву і ўзаемаўзбагачэння, па-за сувяззю з працэсам інтэрнацыяналізацыі грамадскага жыцця. Гэта аксіёма. Ігнараванне яе можа прывесці да нацыянальнай абмежаванасці. Каб гэтага не адбылося, трэба бачыць сітуацыю, што склалася ў рэспубліцы, у дыялектычным адзінстве і разнастайнасці фактараў, якія зрабілі ўплыў на яе. У нас існуе практыка двухмоўнасці, паважлівых адносін да рускай мовы, шырокага яе распаўсюджання ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і ў быце. Гэта аб'ектыўны працэс.

Ва ўмовах нацыянальна-рускай двухмоўнасці міністэрствы і ведамствы прымаюць меры, накіраваныя на забеспячэнне аптымальных суадносін беларускай і рускай моў у навучанні і выхаванні дзяцей і моладзі. Намечана расшырыць падрыхтоўку спецыялістаў-мовавед

(Заканчэнне на стар. 4).

САЦЫЯЛЬНЫЯ І МАРАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ Ў ЖЫЦЦІ І ЛІТАРАТУРЫ

Пастанова пленума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР

Як вядома, 4 чэрвеня адбыўся чарговы пленум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, на які было вынесена пытанне: «Сацыяльныя і маральныя праблемы ў жыцці і літаратуры» (матэрыялы пленума надрукаваны ў «ЛіМе» за 12 чэрвеня). На пленуме была створана камісія па выпрацоўцы канчатковай рэдакцыі пастановы і прынята рашэнне аб тым, каб яна была разгледжана і зацверджана прэзідыумам праўлення СП БССР. На нядаўнім пасяджэнні прэзідыума пастанова была прынята. Ніжэй друкуем яе.

За час, які прайшоў пасля IX з'езда пісьменнікаў Беларусі, адбыліся вялікія змены ў жыцці нашага грамадства. Заклік партыі да перабудовы, да паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны знайшоў глыбокі і жывы водгук у нашых пісьменніцкіх сэрцах. Стратэгічны курс, прыняты на XXVII з'ездзе КПСС, красавіцкім (1985) і студзеньскім (1987) Пленумах ЦК КПСС, лёг у аснову творчых пошукаў беларускіх пісьменнікаў, надаў новы імпульс удасканальванню арганізацыйнай дзейнасці СП БССР.

Абмеркаванні творчых пытанняў паказваюць усё больш узрастаючую актыўнасць пісьменнікаў, іх зацікаўленасць у рашэнні задач, пастаўленых перад грамадствам. Усталёўваюцца ў паўсядзённай дзейнасці нашай пісьменніцкай арганізацыі прынцыпы дэмакратызму, галоснасці, развіваецца крытыка і самакрытыка. Стварэнне атмасферы ідэйна-мастацкай патрабавальнасці і прынцыповасці ўсё смялей заваёўвае пазіцыі ў ацэнцы дасягнутага нашай літаратурай і ў вызначэнні перспектыў яе развіцця.

Аднак працэсы гэтыя, асабліва калі параўноўваць іх з размахам і тэмпамі перабудовы ў грамадстве, патрабуюць яшчэ больш рашучых захадаў для ўздыму нашай арганізацыйна-творчай работы на якасна новую ступень, каб стаць упоравень з маштабамі задач, якія рашаюцца сёння народам. Мала яшчэ напісана твораў, якія б сваімі ідэйна-мастацкімі якасцямі адпавядалі духу часу. Героі, што здзяйсняюць ідэі перабудовы, пакуль што не занялі на старонках нашых кніг дастойнага месца. Маральнае ачышчэнне грамадства, пераадоленне сацыяльнай інертнасці, што пранікла ў наша жыццё ў перыяд застою, яшчэ не сталі па-сапраўднаму прадметам пісьменніцкай увагі, мастацкага даследавання ў новых раманах, апавяданнях, вершах, паэмах, п'есах, публіцыстычных і крытычных артыкулах. Ёсць спробы дэмагагічна выкарыстаць галоснасць у асабістых інтарэсах. Пленум падзяляе занепакоенасць пісьменніцкай грамадскасці тым, што часам назіраецца блытаніна паняццяў нацыянальнага і нацыяналістычнага, якая перашкаджае вырашэнню жыццёва важных пытанняў нармальнага развіцця сацыялістычнай нацыянальнай культуры.

Добрасумленны і прынцыповы аналіз новых сацыяльных з'яў і маральна-этычных зрухаў — важны і неабходны крок на шляху далейшага развіцця нашай літаратуры. Вопыт перабудовы чакае мастакоўскага асэнсавання і абагульнення. Пярэдадзень сямідзесяцігоддзя Вялікага Кастрычніка ставіць перад майстрамі слова важную задачу раскрыцця арганічнай сувязі, пераемнасці рэвалюцыйных здзяйсненняў у нашай сацыялістычнай гісторыі, паказу сённяшніх пераўтварэнняў як новага этапу на шляху рэвалюцыі.

Пленум праўлення Саюза пісьменнікаў БССР пастанаўляе:

1. Лічыць, найпершым, адказным і ганаровым абавязкам кожнага пісьменніка напісанне твораў, якія б перадавалі ўсю веліч і стваральны пафас рэвалюцыйных перамен у краіне, услаўлялі дружбу народаў СССР, подзвіг народа-будаўніка, змагаліся за сцвярджэнне сацыяльных і маральных ідэалаў нашага грамадства, прынцыпаў савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму.

2. Выданням СП БССР пастаянна павышаць патрабавальнасць да ідэйна-мастацкіх якасцей публікуемых твораў, дамагацца іх глыбокай праўдзівасці і сацыяльна-маральнай змястоўнасці. Асаблівую ўвагу звярнуць на творы публіцыстыкі, маючы на мэце перш за ўсё іх грамадзянскую напоўненасць, шырыню погляду на з'явы і працэсы, звязаныя з перабудовай і паскарэннем у нашым грамадстве.

3. Лічыць важнейшай задачай Саюза пісьменнікаў — выхоўваць літаратурную змену, клапаціцца аб ідэйна-маральнай загартоўцы маладых літаратараў, спрыяць усталяванню іх на пазіцыі барацьбітоў за ўсё новае, перадавое, супроць ідэйна-культурнай агрэсіі імперыялізму, дбаць аб іх творчым росце, аб пашырэнні іх жыццёвых далягляданў. У гэтых мэтах найлепшым чынам выкарыстоўваць пастанову ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР аб тым, што Дзяржкамвыд БССР забяспечвае штогод да 12 дадатковых рэзервных пазіцый для выдання кніг маладых пісьменнікаў і бібліятэчку «Маладосці», якая пачне выходзіць з 1988 г.

4. Лічыць недастаткова аб'ектыўным і аператыўным асвятленне і асэнсаванне сучаснага літаратурнага працэсу ў крытыцы і на старонках перыядычных выданняў. Абавязаць выданні СП БССР рашуча падняць узровень работы сваіх крытычных аддзелаў у адпаведнасці з сённяшнімі патрабаваннямі.

5. Пастаянна клапаціцца аб тым, каб у пісьменніцкай арганізацыі панаваў здаровы маральны клімат. Прэзідыуму праўлення, сакратарыяту і творчым секцыям даваць прынцыповую ацэнку паасобным выступленням, якія вядуць да нездаровых канфліктных сітуацый.

6. Пленум выказваецца за больш шырокае выкарыстанне беларускай мовы ў дашкольных установах і абавязковае вывучэнне яе, пачынаючы з першага класа ва ўсіх школах рэспублікі, за пашырэнне выкарыстання яе ў справаводстве, за выхаванне павагі да беларускай мовы нароўні з рускай у насельніцтва, ва ўсіх кадраў, што працуюць у рэспубліцы.

Прасіць Урад рэспублікі ўвесці выкладанне асноўных прадметаў на гуманітарных факультэтах ВНУ і ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах на беларускай мове.

Пленум СП БССР звяртаецца ў Вярхоўны Савет, Урад рэспублікі з просьбай узмацніць кантроль за выкананнем заканадаўчых актаў, якія гарантуюць развіццё нацыянальнай культуры, асветы, роднай мовы і ўдасканальваць адпаведнае заканадаўства.

7. Прасіць ЦК КПБ стварыць рэспубліканскую камісію па праблемах беларускай мовы, культуры і гісторыі, у якую б увайшлі прадстаўнікі грамадскасці, навуковай і творчай інтэлігенцыі. Надаць гэтай камісіі статус кансультатыўнага, навукова-даследчага, з дастаткова шырокімі паўнамоцтвамі органа па пытаннях стану і развіцця нацыянальнай мовы і культуры ва ўмовах двухмоўя.

8. Пленум рэкамендуе ўсім органам друку СП БССР, пісьменнікам і крытыкам прадоўжыць працу па актыўнаму растлумачэнню грамадству ролі беларускай і рускай моў у справе развіцця нацыянальнай культуры, нацыянальнай і інтэрнацыянальнай свядомасці, па асвятленню становішча беларускай мовы і выхаванню павагі да яе.

9. Пленум лічыць неад'емным абавязкам пісьменніцкай арганізацыі дбаць аб пашырэнні і ўмацаванні сувязей з братнімі літаратурамі народаў СССР, вывучэнні, навуковым асэнсаванні і шырокай прапагандзе духоўнай спадчыны беларускага народа, тым самым уключаючы яе ў дзейсныя сродкі патрыятычнага выхавання.

10. Пленум рэкамендуе кіраўніцтву СП звярнуцца ў дырэктыўныя органы з просьбай аб тым, каб на радзіме вялікага першадрукара і асветніка Скарыны, у мэтах актывізацыі прапаганды роднай і іншых славянскіх культур, гісторыі, мовы і літаратуры праводзіць штогод Свята славянскай пісьменнасці — па прыкладу свята, што пачало праводзіцца з 1986 года ў РСФСР.

11. Пленум ставіць пытанне аб тым, каб прасіць Дзяржкамвыд БССР выдаць стэнаграмы з'ездаў пісьменнікаў Беларусі (з IV па IX).

12. Пленум даручае прэзідыуму праўлення СП Беларусі ва ўстаноўленым парадку вырашыць пытанне аб літаратурных прэміях СП БССР: па драматургіі імя В. Дуніна-Марцінкевіча, па дзіцячай і юнацкай літаратуры імя Алаізы Пашкевіч (Цёткі), па нарысу і публіцыстыцы імя Кузьмы Чорнага, па крытыцы і літаратуразнаўстве імя Максіма Гарэцкага, па мастацкаму перакладу імя Максіма Багдановіча.

Узбагачаць духоўнае жыццё народа

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 3).

даў, выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры, павысіць якасць выкладання беларускай мовы ў сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школе. Расшыраюцца таксама даследаванні па актуальных праблемах гісторыі і культуры Беларусі, функцыяніравання беларускай і рускай моў. Будзе палепшана дзейнасць органаў культуры, творчых саюзаў па павышэнню ідэйна-мастацкага ўзроўню ствараемых твораў. Робяцца канкрэтныя крокі для актывізацыі прапаганды літаратуры і мастацтва сярод насельніцтва. Удасканальваецца рэпертуарная палітыка. Будзе палепшана кнігавыдавецкая і часопісная справа ў рэспубліцы.

У Закон БССР аб народнай асвеце, прыняты на нядаўняй сесіі Вярхоўнага Савета БССР, унесена палажэнне аб тым, што ў школах, дзе выкладанне вядзецца на рускай мове, для вучняў ствараюцца неабходныя ўмовы для вывучэння беларускай мовы. У гэтым плане будзе адбывацца і пераарыентацыя дзіцячых дашкольных устаноў. У тых жа дзіцячых садах, дзе выхаванне вядзецца на рускай мове, павялічыцца час на азнаямленне дзяцей з беларускім фальклорам, творамі нацыянальнай літаратуры, выяўленчым і музычным мастацтвам, народнай творчасцю.

Калегія Міністэрства асветы БССР прыняла рашэнне аб увядзенні ў школах з рускай мовай навучання вывучэння беларускай мовы з другога класа. Вядзецца распрацоўка новых навучальных планаў для 1—4 класаў і праграм па беларускай і рускай мовах. Будуць дадаткова выдадзены дзесяткі назваў падручнікаў, метадычных дапаможнікаў, дыдактычных матэрыялаў, серыя кніг Бібліятэкі настаўніка беларускай мовы і літаратуры. З новага года пачне выходзіць часопіс «Беларуская мова і літаратура ў школе».

У гэтай сувязі хацеў бы заклікаць вас да плённай сумеснай работы з органамі народнай асветы, працягваў дакладчык. Пакуль што пісьменнікі лічаць за лепшае толькі крытыкаваць Міністэрства асветы БССР за нежаданне ўключыць у праграму таго або іншага аўтара, а самі не праяўляюць актыўнасці ў павышэнні культуры, якасці выкладання беларускай мовы і літаратуры, жадання ўдзельнічаць у падрыхтоўцы новых падручнікаў. У 1986 і пачатку 1987 г. Міністэрства асветы БССР паслала ў Саюз пісьменнікаў пяць рукапісаў новых падручнікаў з просьбай выказаць сваю думку. Два з іх былі адразу ж адпраўлены назад з-за таго, што ў саюзе, ніводнага спецыяліста, а на тры да гэтага часу няма ніякага адказу.

Для паляпшэння падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў факультэты педагогікі і методыкі пачатковай адукацыі ў педінстытутах пераведзены на новыя навучальныя планы з павелічэннем колькасці гадзін на беларускую мову і методыку яе выкладання. З 1987 года павялічан прыём у педінстытуты на спецыяльнасць «беларуская мова і літаратура».

Ва ўсіх ВНУ рэспублікі прадугледжваецца арганізаваць больш глыбокае вывучэнне студэнтамі гісторыі беларускай культуры і літаратуры як у лекцыйных курсах, так і факультатыўна. Міністэрству вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэспублікі даручана ўнесці прапановы аб павелічэнні аб'ёму курсу «Гісторыя БССР» у вышэйшых навучальных установах і перш за ўсё ў інстытутах культуры і тэатральна-мастацкім.

Міністэрства культуры БССР прымае меры па ўзбагачэнню рэпертуару самадзейных і прафесіянальных калектываў творамі на нацыянальнай мове, развіццю аркестраў народных інструментаў. Распрацоўваецца праграма манументальнай прапаганды да 2000 года.

Дзяржкамвыд БССР прадугледжвае ажыццявіць комплексную праграму выпуску кніг на нацыянальнай мове, у тым ліку літаратурнай спадчыны і беларускай класікі, перакладной літаратуры. Рыхтуецца да выдання 100-томная бібліятэка на беларускай мове «Скарбы сусветнай літаратуры».

Я назваў, сказаў дакладчык, толькі частку мер, прымаемых у сферы развіцця беларускай літаратуры і мовы як складаючай часткі нашай многанацыянальнай культуры. Мяркую, вы са мной згодзіцеся, што ёсць яшчэ і вялікія пісьменніцкія рэзервы. Перш за ўсё ў павышэнні ідэйнага і мастацкага ўзроўню ствараемых твораў.

Далей дакладчык спыніўся на рэалізацыі патрабаванняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС па паляпшэнню работы партыйных арганізацый з кадрамі. Гэта патрабаванне датычыць у поўнай меры і Саюза пісьменнікаў. Сярод літаратараў вялікая партыйная праслойка. Пісьменнікі-камуністы павінны задаваць тон у жыцці творчага саюза, аказваць большы ўплыў на стварэнне сапраўды творчай абстаноўкі. Аднак гэтыя магчымасці выкарыстоўваюцца далёка не поўнасцю. Многія камуністы слаба ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, не праяўляюць актыўнасці ў пастаноўцы і рэалізацыі актуальных пытанняў развіцця літаратурнага працэсу. Партбюро павінна папраўляць гэта становішча.

Партыйны ўплыў на мастацкі працэс — гэта не раздача ацэнак агулам, а сур'ёзны аналіз удач і дасягненняў, хібаў і недахопаў, выяўленне рэзерваў, уменне тактоўна ўказаць на памылкі і знайсці шляхі іх выпраўлення.

Нельга не заўважыць, што сёння да глыбокай грамадскай дыскусіі, якая разгарнулася вакол рада наспеўшых праблем нашага жыцця, спрабуюць прымазацца асобныя дэмагагічна настроеныя людзі. І робяць гэта пры дапамозе метадаў і сродкаў далёка не бездакорных. Іх трэба папраўляць.

Эмацыянальны экстрэмізм — дрэнны саюзнік у нашай рабоце па пераадоленню ўзнікшых механізмаў тармажэння і застою ў культурнай сферы. Ён сам з'яўляецца фактарам тармажэння магутнай абнаўленчай работы, якая разгарнулася ў нашым грамадстве, у ідэалогіі, навуцы і культуры.

На XXVII з'ездзе адзначалася, што партыя імкнецца так будаваць работу, каб кожны на даручаным участку дзейнічаў прафесіянальна, энергічна, не баючыся ўзяць адказнасць на сябе, сказаў у заключэнне В. А. Пячэннікаў. Гэта датычыць і камуністаў, якія працуюць у сферы культуры, літаратуры і мастацтва. Павышэнне адказнасці і расшырэнне правоў дазваляюць абнавіць метады дзейнасці творчых саюзаў, сканцэнтраваць увагу на сапраўды творчых пытаннях. Партыя ж у поўнай меры павінна ажыццяўляць ролю палітычнага кіраўніка, які вызначае генеральную лінію, генеральную перспектыву развіцця.

Выбіраць шляхі і метады вырашэння канкрэтных пытанняў — гэта неад'емнае, гарантаванае ўсім ходам перабудовы права кожнага органа кіравання, кожнага працоўнага калектыву, у тым ліку і творчага саюза. Карыстацца гэтым правам трэба ўмела і актыўна.

У дыскусіі па праблемах, якія абмяркоўваліся, выступілі пісьменнікі І. Навуменка, А. Жук, А. Клышка, В. Адамчык, Я. Скрыган, Б. Сачанка, А. Грачанікаў, Т. Бондар, В. Гігевіч, П. Прыходзька, В. Казбярук, дырэктар Беларускага аддзялення Літфонду СССР В. Вільтоўскі.

Сход прыняў пастанову, у якой вызначаны канкрэтныя меры ўдасканалення партыйнага ўплыву на развіццё беларускай літаратуры, павышэння яе ролі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці рэспублікі.

БЕЛТА.

КНІГАПІС

В. КОЎТУН. Белы гром. Вершы. Драматычная паэма. Пераклад з беларускай. М., «Советский писатель», 1987.

Пазнаёміцца з творчасцю Валянціны Коўтун атрымаў магчымасць усесаюзны чытач. Кніга «Белы гром» — выбраныя старонкі лірыкі паэтэсы, якая плённа працуе ў беларускай паэзіі вось ужо дваццаць гадоў.

Творы В. Коўтун на рускую мову пераклалі У. Арцем'еў, І. Бурсаў, Ю. Скорадумаў, Б. Крывялевіч, С. Кузняцова, П. Кошаль.

І. НАВУМЕНКА. Развітанне ў Кавальцах. Аповесці. Раман. Аўтарызаваны пераклад з беларускай. М., «Советский писатель», 1986.

Чытачу добра вядомы аповесці Івана Навуменні «Апошняя восень», «Развітанне ў Кавальцах», «Інтэрнат на Нямізе», «Замець жаўталісця» і іншыя. Гэтыя творы разам з раманам «Смутак белых начэй» склалі кнігу пісьменніка, што выпушчана выдавецтвам «Советский писатель».

Над перакладамі працавалі Л. Салавей, А. Астроўскі, М. Гарбачоў, В. Элькін, Я. Мазалькоў і іншыя.

Я. СІПАКОЎ. І сёння стане ўчора. Аповесці. Аўтарызаваны пераклад з беларускай. М., «Советский писатель», 1987.

Чарговы зборнік «І сёння стане ўчора» склалі чатыры аповесці пісьменніка «Крыло цішыні», «Усе мы з хат», «Пыл пад нагамі» і «Даверлівая зямля», перакладзеныя Т. Залатухінай, І. Кірэенкам і М. Гарбачовым.

Я. КАРШУКОЎ. Ішоў цеплаход. Апавяданні і гумарэскі. Аўтарызаваны пераклад з беларускай. М., «Советский писатель», 1987.

Зборнік апавяданняў і гумарэсак Яўгена Каршукова «Ішоў цеплаход», перакладзеных Э. Карпачовым, першая кніга пісьменніка, якая выйшла ў Маскве. Гэта свайго роду выбранае аўтара.

КРЫТЫКА БІБЛІЯГРАФІЯ

Анатоль СІДАРЭВІЧ

ЧАС ПРАЎДЫ

Пра паэмы Алеся БАЧЫЛЫ і Сяргея ГРАХОЎСКАГА

А. Бачыла. Паэма тугі. «Полымя», 1987, № 6.
С. Грахоўскі. Балючая памяць. «ЛіМ», 15 мая 1987 г.

ТОЙ, ХТО ЎВАЖЛІВА чытае літаратурна-мастацкую перыёдыку, будзе здзіўлены супадзеннем паасобных думак у рамане Уладзіміра Цендракова «Замах на міражы» і ў другой кнізе рамана Барыса Мажаева «Мужыкі і бабы». Той, хто чытаў раман «Дзеці Арбата» Анатоля Рыбакова і раман Юрыя Трыфанава «Знікненне», будзе здзіўлены збегам думак і тым, што ў гэтых творах нават агульныя дзейныя асобы. Аповесці Уладзіміра Амлінскага «Апраўдана будзе кожная гадзіна...», Даніла Граніна «Зубр» і раман Уладзіміра Дудзінцава «Белае адзенне» яднаюцца і тэматычна, і прысутнасцю ў іх калі не асобы, дык духу нядобрае памяці Трафіма Лысенкі. Той, хто прачытае ў шостым нумары «Полымя» пасмяротна апублікаваную «Паэму тугі» Алеся Бачылы, будзе ўражаны яе генетычнаю еднасцю з паэмаю Аляксандра Твардоўскага «Па праву памяці», таксама надрукаванай пасмяротна, будзе ўражаны тым, што займеннік «ён», які замяняе прозвішча Сталіна, напісаны гэтак, як і ў рамане А. Рыбакова: вялікімі літарамі. Праблематыка паэмы А. Бачылы прымушае нас згадаць таксама «Мужыкоў і баб» Б. Мажаева і раман Івана Акулава «Касьян сцюдзёны».

Значыць, само жыццё патрабавала ад літаратуры асэнсавання тых ці іншых падзей: яно, жыццё, ставіла пытанні і фармулявала своеасаблівы сацыяльны заказ. У нетрах літаратуры выспявалі думкі, каб потым, у новых грамадскіх умовах, загучаць на поўны голас.

Ведаю, што няўдзячная справа — параўнанне аднаго твора з іншымі — больш прыдатнаю была б у літаратуразнаўчай працы, а не ў рэцэнзіі, ды цалкам унікнуць параўнанняў нельга.

У паэме А. Бачылы, як і ў паэме А. Твардоўскага, два агульныя вобразы: вобраз бацькі, працаўніка, аратага, вывезенага ў Сібір, і вобраз Сталіна. Але калі ў А. Твардоўскага бацькаў лёс — адзін з эпізодаў, дык твор А. Бачылы цалкам прысвечаны бацьку. Паэмы адрозніваюцца сваёй кампазіцыяй, стылем. Апрача вобразаў бацькі і Сталіна, у «Паэме тугі» ёсць вобразы маці, зямлі, грамады (талакі, таварыства).

«Свая зямля...» За зямлю і за волю бацька пайшоў на вайну. «Калі ж яго, як грамацея, шмат гартаванага ў вайне, зрабіць вайскоўцам захацелі, рукамі замахаў: — Не, не!» «Свая зямля... Зямля, што столькі сумавала па ім... Заняцца ёй пара». Як кара божая — малазямелле. «Ні стужкі вольнае зямлі». У чырвоным войску чуў бацька ад таварышаў: у Сібіры ёсць вольная зямля, урадлівая, шчодрая. І наважыўся ехаць туды з сям'ёю. Ды маці, працавітая, ашчадная маці, якая «чарагавала пост і скорам», добра ведала, што і «камень мохам абрастае, калі яго не варушыць». Яна — яшчэ невядома, на шчасце ці на гора — адгаварыла бацьку. І гэтая яе адмова прывяла бацьку да думкі аб грамадзе, аб талацэ.

Цяпер, калі мы вяртаемся— у думках і на практыцы — да ленінскага кааператыўнага плана, да Ільічовай мары аб «ладзе цывілізаваных кааператараў», цяпер, калі мы зноў вяртаемся да ідэі сацыялістычнага самакіравання, трэба аднавіць праўду пра кааператыўны рух у 20-я гады. Літаратура пачала рабіць гэта першая. Пра кааператыўны рух напісаў у «Мужыках і бабах» Б. Мажаеў. Розныя формы добраахвотнай і самакіруемай кааперацыі ахапілі большасць сялян. Краіна багацела, рос дабрабыт, рубель быў цвёрды, збожжа вывозілі за мяжу... Вось і ў паэме А. Бачылы паказаны сялянскі пачын. «...божа мілы, якою сілай адразу стала грамада! Тады ж, у радасці ўрачыстай па шчырай згодзе ўпершыню на вёсцы ўзнікла таварыства, а бацька стаў за старшыню».

Сяляне самі асушылі балота, на супольным лузе супольна касілі, і «не патрэбен быў прымус». Натхнёны поспехам, бацька марыў пра супольную малатарню і жняярку...

Як гэта ўсё прадбачыў Ленін,
Як ад бяды засцерагаў,
Як у крутыя дні цярпліва
Вучыў няспешліва рашаць.
Бо выспяваць не толькі ніва,
Але... павінна і душа.
Не выспела — зачахне згода,
Не даўшы парастка дабра.

Сялянскія душы спелі спакваля, бо селяніну трэба ўсё памацаць сваімі рукамі, паспытаць на зуб — пераканацца на практыцы. Ды Троцкі, «левыя» спяшалі будаваць агульнашчаслівую будучыню. Сталін, які ў барацьбе за ўладу перамог Троцкага, «левых», сам пераняў іх метады і палітыку «адзяржаўлення», сацыяльнай нівеліроўкі.

Так, не было ўжо Ільіча.
А той, хто месца Ільічова
Займаў, як свой пачэсны кут,
Быў крут на справы і на словы
І на расправы зноў жа крут.
І ён, хто мог, не меўшы згоды,
Пайсці і плыні насупроць,—
Рашыў уласнасць, як калоду.
Адзіным махам раскалоць.
Ад гаспадарак — каб ні звання.
А каб і дух іх нават згас,
Адзінай формай аб'яднання
Быў скрозь зацверджаны калгас.

Таварыствы і суполкі рамеснікаў і сялян былі распушчаны. Заможныя сяляне (не кулакі!), тыя, хто не хацеў ісці ў калгасы, абкладваліся надзвычайнымі падаткамі, у іх рэквізавалі «лішкі». Пра гэтую драму ў жыцці вёскі, селяніна пісалі І. Акулаў і Б. Мажаеў. Паэтычнымі сродкамі А. Бачыла паказвае, як ламалася супраціўленне сялян кааперанню на новы лад — лад прымусовы:

...ні прасвету на парадні
Ці на павагу да правоў.
Нібы чужы... Сплаціў падаткі,
Пастаўкі здаў — наклалі зноў.
І зноў выконвай тэрмінова,
А не... Не ўспееш і міргнуць.
Як загрыміш да месцаў новых...
Здаў гэта — зноўку накладуць.
На змор! Пакуль, як жаўталісце,
На сухадол не упадзеш.

Парадокс заключаўся ў тым, што калгасы стваралі насляпую: «Тады ж і Стáтуту арцелі — асноў асновы — не было». Сяляне законна сумняваліся: «Ці будзе хоць які гарант? Ці толькі абяцанняў словы? То ж нават парабак, а знаў наперад, на якіх умовах сам гаспадар яго наймаў». Сяляне сумняваліся. У тыя, ленінскія, суполкі прымалі працавітых, правераных, а тут: «Збяруцца ж розныя натуры, пот не з усіх палье цурком. Адзін вылазіць будзе з скуры, другі — мянташыць языком». У гэтых абставінах пачалося нябачанае і нечуванае — як перад канцом свету: «А па хлявах разня да рання: што не ў агул — усё на ўбой, на тлумны рынак, за паўсвету, за паўцаны...» Гэткую праяву сялянскага адчаю апісвае, дарэчы, і Б. Мажаеў, што яшчэ раз сведчыць пра тыповасць узноўленых у паэме А. Бачылы падзей.

Бацька пайшоў працаваць на чыгунку. А тым часам на гаспадарку накладваліся ўсё новыя і новыя абавязкі, бо «час суровы спагаднай логікі не меў», бо «злосць злосці пазірала ў вочы, бяда аплаквала бяду». Як даўжнік перад дзяржавай, бацька трапляе пад суд. Ён пачуў там холад слоў: «Ва ўсім віноўны...» і вывад: «Выслаць у Сібір». Горкая іронія лёсу: колісь хацеў па добрай волі ехаць у Сібір, а цяпер «змушаны, як зэк».

На заканчэнне паэмы перад намі паўстае вобраз сына, які быў на тым судзе, які стаў сведкам Дваццатага з'езда, сведкам таго, як з п'едэстала «аслаблы, захістаўся і назем цяжка рухнуў ЁН».

«Паэма тугі» — гэта адначасна і паэма праўды. Туга па бацьку зрабіла сына сацыяльна відушчым. Вінаватым за трагедыю свайго бацькі сын лічыць таго, хто парушыў ленінскія запаветы, прынцыпы і нормы. Апісваючы, як «ЯГО цягнулі цягачы», паэт бачыць у гэтым акт ачышчэння, акрылення светлых душ. «Паэму тугі» я ўспрымаю як грамадзянскі подзвіг А. Бачылы, як праяву яго мастакоўскай прынцыповасці і яго веры ў перамогу светлых ідэалаў, бо твор, нагадаю, пісаўся тады, калі спадзеючыся на нашу няпамяць, зноў пачалі ставіць сабе помнікі пры жыцці, узнагароджваць сябе і прысвойваць сабе званні. Паэму А. Бачылы я ўспрымаю і як запавет, як ягонае палкае жаданне —

Каб не цярпеў няпраўды вен
І каб не меў правоў глуміцца
Над чалавекам чалавек.

«Балючая памяць», паэма Сяргея Грахоўскага, таксама пісалася ў гады застою, калі пра культ асобы і яго вынікі забаранялася пісаць, калі Сталін зноў паўстаў перад намі з экранаў як мудры стратэг.

С. Грахоўскі, як і А. Бачыла, як і рускія пісьменнікі, адчуваў настойлівую патрэбу сказаць праўду пра той час. У паэме паэт вядзе дыялог з чытачом:

Спытаеце: «Нашто кляпаеш
Пра перажытае даўно?»
Калі злачынства прыхавае,
Глядзіш, — узыдзе зноў яно.

У паэме А. Бачылы сын «не стаў растрачваць сіл на тое, каб шукаць за светам магілу, дзе няма магіл». У паэме С. Грахоўскага паказана тое «за светам», куды, пэўна, трапіў і бацька з «Паэмы тугі». Паэт піша:

Лірычных адступленняў годзе.
Пакуль відзён былога цень,
Я з клятага дзесяцігоддзя
Хачу адзін прыпомніць дзень.

Адзін дзень... Узнаўляючы падзеі таго дня ў сібірскім лагеры, паэт у сціслай форме паказвае нам парадкі і звычаі гэтай установы, вязням якое здаваўся лепшым **той,** бесканвойны, свет. Невыносныя ўмовы існавання, пагарда да асобы чалавека, да яго правоў... Цяжка было ў такіх умовах выжыць, яшчэ цяжэй — застацца чалавекам. Быццё ў лагеры пачыналася з пошукаў хоць якога посуду для ежы. «Калі здабудзеш лыжку з кружкай, дык да вясны і дажывеш». «А што вясной? Вясна-красуня падсцеле цёплае травы, падкіне шчаўя, грыб падсуне, з'ясі, глядзіш, — яшчэ жывы». Непасрэдная фізічная патрэба брала падчас верх над этычнымі ўяўленнямі і нормамі маралі. І не здзіўляешся, калі чытаеш пра тое, як «да нар прыпнутага папружкай дні па чатыры мерцвяка хавалі хлопцы пад дзяружкай сабе для лішняга пайка».

У той установе, дзе прымушалі працаваць «амаль што тузіну гадзін» «за пайку, лапці і бахілы і целагрэйку да пупа», «за міску баланды», людзі ўсё ж спадзяваліся на справядлівасць, на правадырову ласку. Яму пісалі заявы. «Але з «яжовых рукавіцаў» не вылузацца, хоць памры... Заявы нашыя ў сталіцу ідуць да гэтае пары».

Паэт з горкай іроніяй піша, што вязняў «нібы каштоўнасць, лічаць на дзень, бывае, дзесяць раз». Лічаць не таму, што вязні сапраўды каштоўнасць. Колькі іх загінула — ад працы, голаду, холаду — «ніхто не скажа, бо гэта тайна і сакрэт». Ахоўнікі баяліся, каб савецкім людзям не стала вядомаю праўда, а таму, зноў з іроніяй піша паэт, «як нас ахоўвалі, ніколі так не ахоўвалі цара». Баяліся праўды не толькі пра ўмовы жыцця ў лагерах, але і праўды пра тое, што іначай называецца прыпіскамі, падманам.

Туфта — для кожнага удача:
У зводках акругляй нулі.
І за такія справаздачы
Начальству прэміі былі.

Без круглых лічбаў не пахваляць,
Без гучных рапартаў — скандал,
Дзялянку без туфты не зваляць,
Нідзе не пракладуць канал.

Уладзімір Караткевіч у рамане «Нельга забыць» пісаў, што самым здзіўляючым у нашай гісторыі з'яўляецца тое, што сыны рэпрэсіраваных сталі ў рады абаронцаў Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Успомнім сыноў Максіма Гарэцкага і Браніслава Тарашкевіча... Дадамо, што і самі рэпрэсіраваныя пры першым зручным выпадку станавіліся ў шэрагі байцоў. Згадаем Змітрака Астапенку і Рыгора Бярозкіна... У сваёй паэме С. Грахоўскі яшчэ раз сведчыць пра гэты патрыятычны парыў:

Прасіўся я ў штрафную роту
І марыў днём і ўначы
Пра тую страшную работу,
Дзе гінуць, каб перамагчы.

Каб у крутой віхуры бою
Усім паклёпнікам назло
Мне змыць уласнаю крывёю
Віну, якое не было.

Але і там, за дротам, таксама «для Перамогі, сіл не шкадуючы жылі». Гісторыкі, мабыць, яшчэ скажуць пра ролю лагераў у эканоміцы краіны, пра іх ролю ў эканоміцы ваеннай пары. Але, як гэта часта бывае, першыя словы прамаўляюць паэты і празаікі (прыкладам, Аляксандр Бек у рамане «Новае прызначэнне»).

Паэмы А. Бачылы і С. Грахоўскага багата цытаваліся тут. Той, хто будзе чытаць іх, захоча, мабыць, працытаваць і іншыя мясціны, бо творы напісаны быццам на адным дыханні. На адным дыханні і чытаеш іх. Праўда, відаць, што раздзел «Пара сапраўднай праўды», якім пачынаецца паэма С. Грахоўскага, напісаны нядаўна, што паэт спяшаў выказацца. Таму тут ёсць колькі алагізмаў.

(Заканчэнне на стар. 6).

Памфлет аб жывых прывідах

А. Бажко. Жывыя прывіды. Аповесць. Мн., «Мастацкая літаратура», 1986.

НОВАЯ КНІГА Алеся Бажко прысвечана людзям, на долю якіх у свой час гісторыя ўсклала нялёгкую задачу змагацца супраць ворагаў сацыялізму, аддаваць усе сілы, нярэдка і жыццё барацьбе за народную справу. Паводле прызнання аўтара, гэта рэквіем па тых, «хто загінуў або прапаў без вестак у барацьбе за станаўленне Савецкай улады ў Заходніх абласцях Беларусі ў першыя пасляваенныя гады».

Аповесць «Жывыя прывіды» мае істотную асаблівасць—востры палітычны змест, характэрны для літаратурнай публіцыстыкі, якая вядома пад назвай памфлета.

Першая частка яе, якая носіць назву «Позняе ворыва», друкавалася яшчэ ў 1963 годзе як самастойны твор. У складзе аповесці «Жывыя прывіды» яна выступае ў якасці экспазіцыі: тут чытач сустракаецца з большасцю персанажаў, што дзейнічаюць ў творы. Другую частку аповесці займае расказ пісьменніка аб палітычнай сітуацыі ў Заходняй Еўропе пасля заканчэння другой сусветнай вайны. Гэтая частка падаецца пераважна ў публіцыстычнай форме.

Прытрымліваючыся ўласцівага памфлету спосабу распрацоўкі зместу, А. Бажко ўключае ў твор публіцыстычныя адступленні, а таксама гістарычныя рэмаркі. У такіх адступленнях пісьменнік дае палітычныя ацэнкі дзеянням і паводзінам персанажаў аповесці — беларускім і польскім нацыяналістам, іх замежным гаспадарам — кіраўнікам разведак капіталістычных краін, буйным дзеячам Ватыкана.

Праз увесь твор праходзіць вобраз заходнебеларускай вёскі і адлюстроўваецца яе жыццё на значным адрэзку гісторыі, які супаў з самымі цяжкімі этапамі—з часоў пілсудчыны, затым нямецка-фашысцкай акупацыі і, нарэшце, пасляваеннага абнаўлення жыцця ў БССР і суседняй ПНР. Аўтар добра ведае гэты час, і яго персанажы знаходзяцца ў самай гушчыні тагачасных палітычных падзей. Іх грамадзянская пазіцыя, якая акрэслілася ў часы панскай санацыі ў Заходняй Беларусі, яскрава выяўляецца ў барацьбе супраць пілсудчыны і супраць фашызму.

Нямала ўвагі ў сваім творы пісьменнік надае выкрыццю дзейнасці рэакцыйнага каталіцкага духавенства ў Заходняй Беларусі, Народнай Польшчы і ў замежнай эміграцыі, ацэньвае ролю Ватыкана і вышэйшых яго дзеячаў у антысавецкай прапагандзе. Розным нацыяналістам — польскім і беларускім—гэтым пярэваратням, як называе іх пісьменнік, — адведзена ў аповесці, бадай, найбольш увагі. Гэта людзі, для якіх «няма нічога святога на зямлі», хоць многія з іх маюць высокі духоўны сан. Пісьменнік расказвае, як пасля падзення германскага фашызму ваяўнічыя дзеячы Ватыкана рушылі ў новы «крыжовы паход» супраць камунізму.

У кнізе паказана, як у 50-я гады знайшлі прытулак «на задворках капіталістычнага свету» каталіцкія і уніяцкія ксяндзы, былыя праваднікі фашысцкага «новага парадку», у Беларусі разам з нацыяналістычнымі дзеячамі «вышэйшага рангу»—Абрамчыкам, Кушалем, Рагуляй, Надсонам (ён жа Бучко), Серафімовічам. Пісьменнік выкрывае іх авантурыстычную антысавецкую дзейнасць. Пад камандай ЦРУ многія з іх і зараз паклёпнічаюць на свае народы, шкодзяць ім.

Праўда, сустракаюцца ў аповесці А. Бажко расцягнутыя апісанні, якія ў пэўнай ступені абцяжараюць чытанне твора.

А. Бажко досыць добра валодае жанравымі асаблівасцямі памфлета. Адчувае пісьменнік і асаблівасці стылю і мовы — як аўтарскай, так і персанажаў. Ён шырока ўводзіць у твор народную лексіку і фразеалогію, пры гэтым не цураецца і дыялектнай.

Варта прыгадаць, што яшчэ ў 1957 годзе ў сувязі са з'яўленнем у друку першага буйнога празаічнага твора А. Бажко «Перад вераснем» у штотыднёвіку «ЛіМ» адзначалася добрае веданне пісьменнікам жывой беларускай мовы. Красамоўныя і каларытныя народныя словазлучэнні ўжывае пісьменнік і ў аповесці «Жывыя прывіды», напрыклад: «...у яго ад слоў да справы было сто вёрст—і ўсё лесам». У моўным арсенале А. Бажко народнае параўнанне — дзейсны сродак у стварэнні вобраза: «...уваліўся даўгі, як вудзільна, чалавек у паношаным шэрым паліто», альбо: «...падлетак у вялікай, як буслінае гняздо, зімовай шапцы».

Аднак нельга не адзначыць той факт, што кніга А. Бажко выдадзена неахайна. Па нейкай невядомай прычыне ў кнізе не знайшлося месца для «зместу». Рубрыкацыя непрадуманая. Нечакана для чытача пасля эпілога ў творы з'яўляюцца новыя раздзелы. Усё гэта, вядома, ідзе не на карысць чытацкаму ўспрыманню.

Леанід ЦАРАНКОЎ.

«ПРОМНІ ЛІТАР НА ПАЛЕТКУ ПІСЬМА»

М. Бусько. У Нёмна на плячах. Лірыка. Мн., «Мастацкая літаратура», 1986.

МІКОЛА БУСЬКО прыйшоў у беларускую паэзію без лішняга, як часта здараецца ў маладых, «шуму з нічога». Мастак па прафесіі, ён сумленна займаецца сваёй зямной справай і—ад выпадку да выпадку, у часіны душэўнай узрушанасці—занатоўвае на паперы свае чарговыя вершаваныя радкі... Радок да радка, верш да верша, публікацыя да публікацыі — і назбіралася, выспела ў яго першая паэтычная кніжка «У Нёмна на плячах». Пазнаваты, канечне, дэбют, але ўжо і без спадзеўкі на скідку, якая звычайна робіцца на маладосць. Дарэчы, разуменне гэтага мы сустракаем у адным з вершаў паэта: «Спагады аніколі не прашу...» Так, паэт не выпрошвае ў нас спагады да сваёй творчасці, але жыве ў яго душы прага справядлівасці, што мне вельмі імпануе. Вось, чытаю зборнікі маладых беларускіх паэтаў і, параўноўваючы іх з лепшымі ўзорамі сучаснай савецкай паэзіі, думаю аб тым, што ПАЭЗІЯ ўсё-такі ёсць справа ПРАФЕСІЙНАЯ. Яшчэ Бацюшкаў у XIX стагоддзі пісаў: «Паэзія патрабуе ўсяго чалавека». Менавіта так — УСЯГО, без астатка. Таму і патрабаванні да творчасці кожнага з тых, хто мае называцца паэтам, павінны быць самыя сур'ёзныя. А то чытаеш занадта эмацыянальныя нататкі У. Някляева пра новы зборнік вершаў Л. Дранько-Майсюка («ЛіМ», 29 мая 1987 г.) і пачуваеш сябе не надта ёмка, асабліва калі даходзіш да завяршальных радкоў артыкула, да той самай скідкі на маладосць (а паэту—трыццаць гадоў!): «Бо гэта ж не «богам створаная проза», а «д'яблам высненыя вершы», справа трошкі грэшная... Не ў грамавым гэтым РАННІМ (словы ў цытаце выдзелены мной.—**Л. Г.**) вершы, а ў пазнейшых, дзе паэт сам для сябе АДКРЫЕ, што спавядальнасць — і ёсць ягоная сутнасць». Як не раз гэта ў нас бывае: не сам паэт сваёй творчасцю ўпэўнівае чытача ў сваіх дасягненнях, а—рэцэнзент ягонай кніжкі. Шкада. Лепш бы наадварот. Хачу зазначыць, што ў дадзеным выпадку я не маю нічога супраць сапраўды цікавай кніжкі здольнага аўтара, я—супроць тэндэнцыі падобнага рэцэнзавання. Бо і яна нямала садзейнічала таму, што ў нашай паэзіі з'явілася нямала дутых велічынь, у той час, калі сапраўдная паэзія не без намаганняў, па каліве прабіваецца да чытацкай аўдыторыі.

Таму ў сваёй рэцэнзіі на першы зборнік Міколы Бусько я пастараюся быць прынцыповым і справядлівым. Кніжка заслугоўвае ўвагі як аўтарскімі ўдачамі, так і пралікамі. Тым больш, што паэт жыве на перыферыі, і, у адрозненне ад сталічных паэтаў, яму ўсё ж цяжэй спадзявацца на чый-небудзь водгук у рэспубліканскім друку.

Паэт піша ў традыцыйнай класічнай манеры. Эмацыянальнае падабенства і чуйная камернасць яго вершаў патрабуюць ад чытача засяроджанасці і ўдумлівага прачытання. Звычайныя зямныя болі, трывогі і хваляванні звычайнага зямнога чалавека... І калі ўсяму глыбока перажытаму аўтар знаходзіць адэкватную форму, то—хоць і не так часта, як хацелася б,—здараюцца паэтычныя адкрыцці:

Ледзь усход заняўся—
Птушцы сон
не сніцца
І вісіць зямля ўся
На срабрыстай нітцы.
Шар зямны, ён трэсне,
Згасне ўсход, здаецца,
Калі нітка песні
Раптам абарвецца.

Да падобных паэтычных адкрыццяў можна аднесці і такія вершы з гэтай кніжкі, як «Аўтобус на Пагарэлку», «Сакавік», «Эцюд», «Захмаранае лета», «Перад навальніцай», «Адвячорак», «Налібокі», «Шугавей» і «Памяці сястры». Ёсць і выдатныя, запамінальныя радкі ў некаторых іншых вершах. Я ўжо ўпамінаў вышэй, што паэт—мастак па прафесіі, і нездарма ў яго атрымліваюцца зрокавыя прыродныя замалёўкі, якія ўражваюць непрыдуманасцю, натуральнасцю і гарманічнасцю. Хоць бы вось такія радкі: «...Сумёт выпростваецца ў лужыне», «Жаўтлявая вада гудзе, буянячы на лысым грудзе», «Неба сіняе, як сліва, дым глытае ад кастра», «...І сумка, як сабачаня, міжволі шыецца пад ногі»...

Умее паэт ствараць і адпаведныя настроі душы, падсвядома змяняючы рытміку і мелодыку паэтычнага радка. Вось зрокавы і пачуццёвы вобраз бацькі-Нёмана:

Быстры Нёман
пад ялінавым
Шатром
Закіпае
успамінамі
Ля стром.
Дзеля новага
разгоннага
Рыўка
Б'ецца,
сціснутая згонамі,
Рака.

Альбо гэтая замалёўка з вясковага жыцця, з успамінаў маленства, дзе карціна вяртання з кірмашу рэальна паўстае перад вачыма:

Ды ратунак мой едзе—
Хопіць слёзных згрызот.
Тё з базару суседзі —
— Тпрру!—
І лейцы на плот.

У М. Бусько выразна вобразнае мастакоўскае мысленне. У яго вершах няма надуманасці і фальшу ў адносінах да суровай рэчаіснасці. Але, разам з тым, бракуе яму і летуценнасці, празорлівасці, поўнага духоўнага самараскрыцця (як чалавек, які ведае паэта, я не маю права гэтага не заўважыць). Біяграфія паэта намнога шырэй яго паэтычнай кніжкі, намнога цікавей і намнога змястоўней. Яму ёсць што сказаць людзям. Вось толькі ці хопіць у яго для гэтага майстэрства і здольнасцей? Патэнцыяльна гэты запас творчых сіл адчуваецца нават у тых вершах, дзе яго падсцераглі няўдачы, але... Многія вершы ў зборніку сведчаць пра абыякавасць у рабоце над паэтычным словам. Цяжка знайсці паэзію ў такіх вершах, як «Палітра восені». «Спрадвечная загадка», «Калісьці час трымаў навуку...», «Паштоўка», «Начлег», «Адцвітанне». Паэт, як бы прадчуваючы няўдачу, ставіў канчатковую кропку ў гэтых вершах адразу ж пасля першай страфы. Прывяду некаторыя з іх поўнасцю, каб не быць галаслоўным:

Я ведаю, каму збярог
Святую вернасць пачуцця...
Хай тчэцца
З пройдзеных дарог
І твой,
І мой
Узор жыцця.

Альбо:

Калісьці час трымаў
навуку,
Рэлігіяй звязаўшы рукі;
Хапаў яе
заўжды аберуч,
Народжаную на паперы...
Ідзе
наперадзе навука,
Узяўшы час
трывала ў рукі.

Яшчэ на пачатку XX стагоддзя Валерый Брусаў пісаў: «У нашы дні ўжо не перакладаюць у вершы арыфметыку; чаму ж некаторыя ўсё яшчэ хочуць увасобіць у паэтычную форму тое, што выдатна можна выявіць у іншай форме?» Не ўдаліся паэту і многія вершы пра каханне. А якраз у такіх вершах, як мне здаецца, і праяўляецца найбольш поўна АСОБА творцы. Бусько ж у вершах пра каханне не хапае акрыленасці пачуцця, стыхійнасці, не абцяжаранага побытам мыслення. Невядома па якой прычыне ўключана ў кніжку і дзіцячая «Казка», хоць яна і напісана вельмі добра. Думаю, работнікам выдавецтва «Юнацтва» варта звярнуць увагу на гэтую адметнасць творчай натуры М. Бусько. Шкада, што паэт у сваіх вершах рэдка выходзіць за межы практычнага і надзённага. Яму бракуе нестэрэатыпнага светабачання, без чаго няма сапраўднай паэзіі. Хацелася б, каб паэт пераадолеў мяжу магчымага і выйшаў на прастор сапраўднай творчасці.

Слабым суцяшэннем аўтару гэтай першай паэтычнай кніжкі можа паслужыць хіба той—бязрадасны для нас, чытачоў, — факт, што сёння большасць зборнікаў маладых паэтаў знаходзіцца на такім жа малаадметным паэтычным узроўні. Суцяшэннем паэту, але не чытацкай аўдыторыі. Мяне ж у апошні час абнадзеіла нізка вершаў М. Бусько ў часопісе «Полымя», якая засведчыла паступовае ўдасканаленне майстэрства паэта. Як я ўжо адзначаў, патэнцыял для паэтычнага росту ў М. Бусько ёсць—адчуваецца, але патрэбна яшчэ нястомная і пакутлівая праца душы і поўная самааддача на СЛУЖБЕ ЯЕ ВЯЛІКАСЦІ ПАЭЗІІ, каб «промні літар на палетку пісьма» давалі жыццядайныя ўсходы.

Леанід ГАЛУБОВІЧ.

в. Вароніна.

ЧАС ПРАЎДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5).

У дзесятай страфе паэт піша:

Адбедаваў, і больш
не плачу
Ні па сабе, ні па сябрах.
Мне лёс наканаваў удачу,
Сябры ж развеяліся ў прах.

Згадзіцеся: калі б паэт адбедаваў і больш яму не балела, то наўрад ці сеў бы ён пісаць свой твор. Паэту баліць, не адбедаваў ён. Сведчаннем таму — дванаццатая страфа:

Мае сябры, я вас пайменна
Збярог у памяці сваёй.
Я — сведка ваш, я —
ваша змена,
Мы доляй скутыя адной.

Раздзел «Уцякач», відаць, пісаўся даўно і «для шуфляды». Мусіць, не маючы надзеі на галоснасць, С. Грахоўскі не стаў у той час развіваць тэму. Таму цяпер, набыўшы ўступны і заключны раздзелы, паэма выглядае ўсё ж як частка больш шырокае задумы, не ажыццёўленае тады, на пачатку 80-х.

Гэтыя прыватныя заўвагі, вядома, аніяк не змяншаюць грамадзянскай і паэтычнай каштоўнасці паэмы С. Грахоўскага. Яе, як і «Паэму тугі» А. Бачылы, я ўспрымаю як смелы грамадзянскі акт, бо ў нас мала хто пісаў, не спадзеючыся, што слова яго пачуюць і ацэняць пры ягоным жыцці. Пафас паэтаў (а пафас — нагадаю — гэта боль) перададзены шчыра, па-мужчынску сурова і лаканічна, асабовы пачатак у гэтых творах арганічна зліты з эпічным, публіцыстычным, радкі поўныя пачуцця і думкі, іх хочацца цытаваць, чытаць уголас.

«Прыйшла пара сапраўднай праўды...» — піша С. Грахоўскі. У гэтым пераконваешся, чытаючы не толькі расійскую, але і беларускую літаратурнамастацкую перыёдыку. У А. Бачылы чытаем:

Нельга далеч ясна бачыць,
З вачэй не зняўшы
слепаты.

Праўда не толькі ачышчае—праўда робіць нас відушчымі і ўдумлівымі. А відушчасць і ўдумлівасць вельмі патрэбны нам, калі мы сапраўды хочам пераадолець шматгадовую інерцыю, хочам пазбавіцца ад старых стэрэатыпаў, калі сапраўды хочам выйсці на новы прастор.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

На крылах паэтычнай рамантыкі

Да 105-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы

Мы, можа, і не задумваемся над пытаннем: чаму вершы і паэмы Купалы, напісаныя ў пачатку нашага стагоддзя, хвалююць нас і сёння, не пакідаюць раўнадушнымі? Сказаць, чаму —і складана, і ў той жа час проста. Складана таму, што мы ніколі да канца не здолеем пранікнуць у свяшчэнную тайну ўздзеяння сапраўднага мастацкага слова, гармоніі гукаў, жывапіснага палатна ці нават велічнага пейзажа на нашы пачуцці, на нашу душу. Кажучы словамі Якуба Коласа:

Ды ніхто не знаў тых струнаў,
Патайных ніцей душы,
Што злучаюць гук пярунаў
З немым голасам цішы...
(«Сымон-музыка»)

Але мы можам сказаць таксама, што адказ на пытанне і просты, бо Купала, як ніхто раней, паказаў наша мінулае, нашых продкаў — і не толькі такімі, якімі яны былі ў той час, але і такімі, якімі сталі ў будучым, калі лёс дазволіў ім праявіць усе свае якасці і дараванні.

Яшчэ на зары нашага стагоддзя, у такі далёкі, але і такі памятны 1905 год Янка Купала як прарок абуджэння свядомасці беларускага народа з упэўненасцю, якую так блішча пацвердзіла гісторыя, заявіў:

Ніколі, братні, не забуду,
Што чалавек я, хоць мужык.
(«Мужык»)

Першы купалаўскі верш «Мужык», апублікаваны ў маі 1905 г. у Мінску, у прагрэсіўнай рускай газеце «Северо-Западный край», з'явіўся тым вытокам, ад якога пачалася беларуская літаратура нашага стагоддзя. Ён як быццам прадвызначыў магістральны напрамак не толькі творчасці самога аўтара, але і развіцця ўсёй беларускай перадкастрычніцкай літаратуры наогул. Галоўным героем яе становіцца селянін, а самай важнай тэмай — тэма яго духоўнага росту, удзелу ў вызваленчай барацьбе, усведамлення сваёй годнасці — сацыяльнай, нацыянальнай і проста чалавечай.

У першых паэтычных радках Купалы на пярэдні план вылучаецца сацыяльная праблема, якая на працягу ўсёй яго творчасці, побач з нацыянальна-патрыятычнай, будзе займаць галоўнае месца. Пройдуць дзесяцігоддзі, неабмежавана пашырацца паэтычныя далягляды Купалы, ён стане прызнаным уладаром беларускай песні, але лёс селяніна, яго доля-нядоля, радасці і гора будуць прысутнічаць усюды.

У паэзіі Купалы, Коласа, Цёткі беларускі мужык паказаў, заявіў на ўвесь свет, што ён хоча — ды не толькі хоча, але і патрабуе,—каб яго лічылі чалавекам, бо ён зразумеў, што зямлю ён павінен араць сваю, і збожжа малаціць сваё, і будаваць не толькі палацы камусьці і касцёлы для славы божай, але і хатку сабе. Яго крэда выказана ў такім, здавалася б, простым вершы-праграме, вершы-надзеі, як «Хто ты гэткі?»

Хто ты гэткі?
— Свой, тутэйшы.
Чаго хочаш?
— Долі лепшай.
Якой долі?
— Хлеба, солі.
А што болей?
— Зямлі, волі.

Чым быць хочаш?
— Не быць скотам.

Тут і сацыяльныя патрабаванні беларускага мужыка і ўсведамленне яго чалавечай годнасці.

У вершы ўлоўліваюцца тыя імпульсы, што будзілі творчую думку песняра. Твор гэты ўспрымаецца як перафразіроўка, а можа, нават і травестацыя так добра вядомага кожнаму беларусаў аўтар «Жалейкі» таксама сказаў на ўвесь голас — моцна, пераканаўча, каб чуў увесь свет. Як гімн адроджанага народа прагучаў верш «А хто там ідзе?». Але і ў перыяд «Жалейкі» беларускі пясняр усвядоміў, што вырашаць нацыянальныя праблемы, не думаючы аб сацыяльных, — немагчыма.

Нельга тут не нагадаць яшчэ адзін добра вядомы ўсім нам верш «Я не паэта» — нагадаць у сувязі з тым, што іменна ім адкрываецца зборнік «Жалейка». Гэтым самым ён і закліканы быў сцвердзіць нешта важнае для самога аўтара, бо ў зборніку не было прадмовы, якая б выкладала чытачам нейкую грамадскую ці эстэтычную праграму, як гэта было, скажам, у зборніках Багушэвіча ці Цёткі. Дык вось і ў гэтым вершы Купала не пазбег пераклічкі з польскай паэзіяй, у якой ёсць два творы з такой жа назвай: у Леа Бельманта (пра што ўжо ў нас пісалася) і ў Артура Бартэльса — таго самага, байку якога «Свінні і бараны» пераклаў у свой час Багушэвіч. З творам Бартэльса і пераклікаецца ў нейкай ступені верш Купалы. Агульнае для іх — прызнанне вялікай і ганаровай грамадскай ролі паэзіі і аднолькавае жаданне падкрэсліць сваю сціпласць, як быццам бы схавацца ад славы, якой сапраўдныя паэты карыстаюцца ўсюды заслужана, па праву.

Сімвал веры беларускага песняра выказаны ў такіх, здавалася б, простых, але вельмі ж багатых зместам словах:

Долю б каб бачыў у родным народзе,
А быў бы шчаслівы
Янка Купала.

Вяршыняй усёй беларускай паэзіі дакастрычніцкага перыяду з'яўляецца зборнік «Шляхам жыцця» (1913 г.). У ім — і роздум аб долі працоўнага селяніна, яго чалавечай годнасці і бяспраўным становішчы, трывогах і спадзяваннях. Унутраны свет беларускага мужыка, багацце яго перажыванняў нідзе і ніколі яшчэ не былі паказаны так усхвалявана і так пранікліва, як у вершах і паэмах, што ўвайшлі ў зборнік. Цэнтральнае месца ў ім займае тэма Радзімы, вобраз «Маладой Беларусі», якая ўзнялася да свядомага гістарычнага дзеяння, змагаецца за волю і лепшую долю, за права заняць ганаровае месца ў свеце, «стаць раўнёю славай і сілай іншым народам».

Ёсць у Купалы два вершы пад назвай «Маладая Беларусь» — два гімны, дзве ўрачыстыя песні, што ўвабралі ў сябе найбольш усхваляваныя і ўзнёслыя пачуцці аўтара, які ўсім сэрцам вітае абуджэнне роднай старонкі да барацьбы за шчасце, яе парыванне да светлай будучыні. Ён непахісна верыць, што ўсе змрочныя сілы будуць змыты магутнай паводкай усенароднага гневу. Сама Беларусь усвядоміла, што яна мае права і павінна гаспадарыць на сваёй зямлі:

Свету цэламу лжывыя вочы пратру,
Што ўладарка я тут, не ўмярла і не ўмру.

І ад краю да краю ўсё далей і далей
Моц мая разальецца нязможанай хваляй...

Імкненне заняць ганаровае месца ў сям'і народаў свету бачыцца і ў самім тэрміне «Маладая Беларусь», які выкарыстоўваўся ў тагачаснай паэзіі і публіцыстыцы. Адна такая назва засведчыла, што настала чарга і беларускай літаратуры ўключыцца ў шырокі еўрапейскі працэс. Бо ўжо да гэтага часу на хвалі рэвалюцыйнага ўздыму пачатку 30-х гадоў XIX ст. узнікла «Маладая Германія» — літаратурная плынь, што аб'ядноўвала прагрэсіўных пісьменнікаў. У канцы XIX ст. з'явілася «Маладая Бельгія» як вынік росту нацыянальнай самасвядомасці ў краіне і імкненне стварыць новую, самабытную літаратуру.

Але найбольш непасрэдна Купала сутыкнуўся з творчасцю пісьменнікаў так званай «Маладой Польшчы». Гэта быў напрамак польскай літаратуры канца XIX — пачатку XX ст. (1890—1918). Ён не з'яўляўся чымсьці аднародным, бо аб'ядноўваў і рэалістычную літаратуру і розныя мадэрнісцкія плыні. Беларускі пясняр жыва цікавіўся польскай класічнай і сучаснай яму літаратурай, добра яе ведаў. Але ён заставаўся ў кожным творы, у кожным радку непахісным змагаром за лепшую долю свайго народа, за хлеб, зямлю і волю, за права беларусаў карыстацца роднай мовай і ствараць сваю культуру.

Якой жа бачылася Купалу Маладая Беларусь? Яна ўяўлялася паэту ў рамантычным вобразе «сакалінай сям'і», што з «вольнымі песнямі», з «новай верай» «у час буры, нягод і вялікіх надзей зацвіла, расцвіла доўгажданая...»

Так Купала — натхнёна, прароча — вітае світанне, нараджэнне новага дня сваёй зямлі. Маладая Беларусь увасоблена і ў жывых вобразах такіх прадстаўнікоў новага пакалення, як Паўлінка і Якім з камедыі «Паўлінка». Іменна яны ўвабралі ў сябе найлепшыя рысы таго пакалення, якому суджана было гісторыяй самім адказваць за свой лёс, а праз гады, у час цяжкіх выпрабаванняў — за лёс народа і краіны.

А пакуль што яны яшчэ паказаны ў бытавым, будзённым плане: яны як быццам не здзяйсняюць нічога незвычайнага, гераічнага, не робяць ніякіх подзвігаў. Але ўжо адно імкненне пераадолець, адкінуць заскарузлы, патрыярхальны лад жыцця, іх выступленне супраць адсталых уяўленняў можна лічыць подзвігам. Іх непахіснасць выяўляецца ў бытавых справах.

Традыцыйны канфлікт бацькоў і дзяцей становіцца ў творы Купалы канфліктам паміж старымі сіламі, усім тым, што аджыло, перашкаджае развіццю грамадства, — і тым маладым пакаленнем, якое імкнецца да новага ладу жыцця, да права самім вырашаць свой лёс. Сам канфлікт усведамляецца не як проста чалавечая ці сямейная справа ўзаемаадносін пакаленняў, а як гістарычная з'ява, ад якой залежыць лёс нацыі.

Янка Купала — паэт-рамантык. У яго творах чытача ў аднолькавай меры захапляе багацце зместу і незвычайная музыкальнасць радка, разнастайнасць мастацка-вобразных, выяўленчых сродкаў, метафар, эпітэтаў, параўнанняў, рытму і рыфмаў. У яго вобразнай сістэме здзіўляюць паэтычнае багацце і шматзначнасць. Але не тая сімвалісцкая, у якой сэнсу ніколі не дашукаешся. А тая асаблівая філасофская глыбіня, у якой дапытлівы розум будзе знаходзіць усё новыя і новыя паэтычныя скарбы.

Аўтар драматычных паэм «Адвечная песня» і «Сон на кургане» засвоіў прыёмы мадэрнісцкай паэтыкі, але адкрыў у ёй такія якасці, пра якія нават найбольш адданыя прыхільнікі яе ніколі і не снілі. Прадстаўнікам мадэрнісцкіх напрамкаў дастаткова было шукаць і знаходзіць у слове нейкае нечаканае значэнне, новае адценне чагосьці вядомага, бачанага, чутага. Такое новае значэнне або адценне ўяўлялася для іх каштоўнасцю самой па сабе, існавала само для сябе, а сімвалісцкая ўмоўнасць і шматзначнасць адгароджвала аўтараў ад жыццёвых трывог і пакут. Паэты-мадэрністы, паэты-сімвалісты, як правіла, не думалі пра трывогі жыцця, пра гаротны лёс дзіцяці, пра тое, якой цаной здабываецца хлеб надзённы. Што ж датычыць Купалы, дык ён усё народнае гора ўспрымаў сваім сэрцам, усімі пачуццямі. І кожная яго думка, кожнае мастацкае слова адклікалася на пакуты цёмных і загнаных, бедных і нешчаслівых.

Паэтычная шматзначнасць купалаўскага вобраза — тое багацце, якое ён прынёс у нашу літаратуру, тое адкрыццё, што небывала паскорыла ўвесь наш літаратурны працэс. І наша літаратура, як паўнаводная рака, убіраючы ў сябе розныя плыні, нястрымна рвалася наперад, адбіваючы ў сабе, адлюстроўваючы і вёскі з іх сярмяжным людам, з іх трывогамі, горам, надзеямі, і ўсё багацце беларускай прыроды.

Але паэзія не толькі адлюстроўвала. Як тая рэчка, што нясе палям, лугам, вёскам жыццядайную сілу, так і мастацкае слова Купалы рабіла багацейшай мову народа, узнімала селяніна духоўна.

Дакастрычніцкая творчасць аўтара зборнікаў «Жалейка», «Гусляр», «Шляхам жыцця», паэм «Курган», «Бандароўна», «Магіла льва», «Яна і я», драматычных паэм «Адвечная песня» і «Сон на кургане», камедыі «Паўлінка» і драмы «Раскіданае гняздо» арганічна засвоіла і ўвабрала ў сябе найвышэйшыя дасягненні паэзіі рэалістычнай, рамантычнай і мадэрнісцкай. Вершы, паэмы, п'есы Купалы, такія разнастайныя і багатыя па змесце, па формах вобразнасці, непаўторныя па сваёй мілагучнасці, сведчылі аб жывой сувязі ўсёй творчасці песняра з найбагацейшымі традыцыямі славянскай і наогул еўрапейскай класікі і ў той жа час — аб нястомным наватарскім пошуку, аб плённым імкненні паэта ўзбагачаць беларускую літаратуру ўсё новымі і новымі адкрыццямі.

У новую савецкую літаратуру Купала ўвайшоў паэтычным зборнікам «Спадчына» (1922), у якім так арганічна праклаў масты і працягнуў ніці паміж усёй сваёй ранейшай творчасцю і тым, што ўжо яму навеяла новая эпоха. Повязь з Айчынай, што з такой сілай пачуцця заявіла пра сябе ў санеце «Бацькаўшчына» (1915) — «І калі здзекваецца нада мною хтосьці — над Бацькаўшчынай здзекваецца ён маей, калі ж над ёй — мяне тым крыўдзіць найцяжэй» — зноў нарадзіла шчымлівыя радкі верша «Спадчына».

Новай рэчаіснасцю навеяны шырокавядомыя вершы «На смерць Сцяпана Булата», «Арлянятам», «Дзве сястры» з іх услаўленнем змагароў за справу Кастрычніка, з рамантычным заклікам да моладзі змятаць «цень мінуўшчыны праклятай», касіць «да ўпаду» «пустацвет і зелле, што сваім пякучым ядам труцяць кроў у целе».

А калі нашу зямлю пачалі спусташаць фашысцкія орды, пясняр увесь свой талент прысвяціў справе змагання з ворагам.

«Зноў будзем шчасце мець і волю» — прароча прадказваў Купала. Сам ён светлага дня перамогі не пабачыў. Але ў вялікую справу яе здзяйснення ўнёс сваю важкую даніну.

Уладзімір КАЗБЯРУК.

ЛЯ КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

«Я ЛЮБЛЮ БЕЛАРУСКУЮ ПАЭЗІЮ...»

У выдавецтве «Современник» пабачыла свет дакументальная аповесць Аляксея Кандратовіча «Равеснік любому пакаленню». Аўтар яе на працягу многіх гадоў ведаў Аляксандра Твардоўскага, працаваў разам з ім у рэдакцыі часопіса «Новый мир». Расказваючы ў аповесці пра Аляксандра Трыфанавіча, ён паказвае яго не толькі выдатным паэтам, вядомым грамадскім і культурным дзеячам, але шмат увагі аддае раскрыццю вобліка Твардоўскага-чалавека, грамадзяніна, гаворачы аб яго ўзаемаадносінах з сябрамі па пяру, таварышамі, пісьменнікамі з саюзных рэспублік.

Даўнія сувязі, як вядома, былі ў А. Твардоўскага і з беларускай зямлёй. Больш таго, як заўважае А. Кандратовіч, «той, хто чуў Твардоўскага, лёгка мог заўважыць у яго вымаўленні і моцнае «аканне», і мяккае «г», і шмат іншае, што ніяк не было падобна на гаворку масквіча... Ён ведаў шмат беларускіх песень і любіў іх спяваць. Гэтыя песні жылі ў ім ад бацькі і дзеда і былі прынесены на Смаленшчыну з Бярэзіны ці яшчэ аднекуль, магчыма, і на захад ад яе...»

Аб гэтым гаворыцца ў вялікім раздзеле «Я люблю беларускую паэзію...» А. Кандратовіч спасылаецца на артыкулы і іншыя публічныя выступленні самога Аляксандра Трыфанавіча, выкарыстоўвае ўласныя запісы, зробленыя адразу ж пасля сустрэч і гутарак, сведкам якіх быў.

«Любоў да беларускай мовы, да беларускага фальклору і выдатнейшае, не па кнігах веданне яго, якое даецца, як кажуць, з дзяцінства, уваходзіць у свядомасць з малых гадоў, натуральна злівалася ў Твардоўскага з гэткай жа моцнай і пастаяннай любоўю да беларускага народа, да яго літаратуры, перш за ўсё паэзіі», — падкрэслівае аўтар, перад тым, як расказаць аб першай паездцы Аляксандра Трыфанавіча ў нашу рэспубліку, што адбылася ў лютым 1934 года. Тады «ЛіМ» падрабязна інфармаваў чытачоў аб прыездзе дэлегацыі смаленскіх літаратараў на чале з Міхаілам Ісакоўскім. У нумары за 12 лютага на першай паласе газеты быў змешчаны артыкул «Брыгада пісьменнікаў Заходняй вобласці ў Менску», у якім паведамлялася, што яны прыехалі для заключэння «сацдагавору». «ЛіМ» змясціў падборку твораў гасцей, сярод іх быў і верш А. Твардоўскага «Госць», перакладзены С. Дарожным — увогуле першы пераклад твора паэта на іншую мову.

Пад час той паездкі А. Твардоўскі блізка пазнаёміўся з Янкам Купалам, якога перад гэтым бачыў у Смаленску. А. Кандратовіч падрабязна расказвае аб уражанні, якое зрабіў беларускі пясняр на Твардоўскага. Прыводзяцца таксама выказванні рускага паэта і аб творчасці Якуба Коласа.

Доўгая і моцная дружба звязвала А. Твардоўскага з Аркадзем Куляшовым, аб чым шмат гаворыць аўтар. Піша А. Кандратовіч і аб падтрымцы, якую ў свой час аказаў А. Твардоўскі Васілю Быкаву, як уважліва сачыў за ўсім, што выходзіла з-пад пяра пісьменніка, будучы перакананым, што «ўсё мінецца, а праўда застанецца».

Са старонак кнігі можна даведацца пра іншыя факты, што тычацца сувязі з Беларуссю А. Твардоўскага, выдатнага рускага савецкага пісьменніка, які быў перакананы, што «рэспубліка, якая вырасціла сваю літаратуру, сваю цудоўную паэзію, мае права чакаць ад сваіх паэтаў яшчэ больш значных, яшчэ больш выдатных здзяйсненняў».

С. АСТАПЧУК.

З РАБОЧАГА СТАЛА ПІСЬМЕННІКА

Аляксей ЗАРЫЦКІ

Мая новая паэма «А ці далёка да Марса?» складаецца з трох раздзелаў. Першы раздзел сягае аж у дарэвалюцыйны час: там ідзе гаворка пра дзяцінства галоўнага героя паэмы. Асноўны змест другога раздзела стварэнне камуны ў пачатку дваццатых гадоў у былым памешчыцкім маёнтку. А ў трэцім раздзеле падзеі разгортваюцца ўжо ў сённяшні час. Прапаную ўвазе чытачоў старонкі з другога раздзела.

АУТАР.

Замошша мяняе імя

Не страчаліся мы, хлапчукі, столькі год.
Не кране нас, відаць, выпадковая
стрэча?..

Сёння сход у сяле,
Сёння экстранны сход,
І спяшае Замошша на сельскае веча.

І стары і малы ў доўгім шэсці відзён.
Там—картуз, тут—хусцінка, абноўка,
вядома.
І мы з Юзікам разам з дзядзькамі ідзём
На пляцок, што ля панскага дома.

Юзь падрос, і на твары ягоным ляжыць
След, пакінуты нейкаю мройлівай
думкай.
Зімняй раніцай хлопчык у школу бяжыць
З палатнянаю сумкай.

А зіма і вясна прамінуць пакрысе,
Лета прыйдзе, радоўку Юзук здбывае.
Як запраўскі пастух, ён скаціну пасе.
Ён ужо і трубу берастовую мае.

Урачыста, паважна сход Біруля адкрыў.
Ганак панскага дома прамоўцам —
трыбуна.
Сход шумеў,
Сход цішэў,
Сход ізноў гаварыў.
Важка новае слова гучала:
— Камуна!

Колькі тут каля ганка бывалых салдат,
Што чужынцаў нядаўна адгэтуль
прагналі,
Ніл Біруля яшчэ не знасіў свой бушлат,
Пагайдалі матроса балтыйскія хвалі.

І прыйшоў і Адам Іванашка сюды.
Шчасны: куля не драпнула, штык
не пераніў.
А на фронце ён быў аж чатыры гады
Ды пасля і ў тутэйшых лясах
партызаніў.

І, праходзячы гэты агнёвы іспыт,
Думаў ён:
— Пасабляе гасподзь мне нібыта...
Дзе мянушка старая — Кабылін Капыт,
У Замошшы дасюль не забыта.

Рэй Біруля вядзе, густа сцелецца бас:
— Мы працоўны, спрадвеку мазолісты,
клас,
І камунай, у згодзе, нам лепш
зажывецца.
Засталося пытанне адзінае ў нас —
Нам праўленне абраць застаецца.

Прапаную, браткі, Іванашку: Адам
З беднякоў, партызан, даў ён ворагу
ў косці,
І паслужыць ён верай і праўдаю нам.
— А, Кабылін Капыт! — жартам
выгукнуў хтосьці.

— Кіньце смешкі! — Біруля ўскіпеў.—
Сёння ён
На кані, прадстаўнік пераможнага класа,
Ці інакш па-вучонаму ён — гегемон!..
Сход ахлынула хваля рашучага баса.

І забыта мянушка, і ўраз як адзвон,
Як адгук, як адпеў зацяжны, незагуслы:
— Наш Адам — Гегемон... Гегемон...
Гегемон...—
Паплыло, паплыло проста з вуснаў
у вусны.

Так яго ахрысціў канчаткова народ.
Рад Адам: гэты дзень стаўся святам
ягоным:
Капытом Кабылячым прыйшоў ён
на сход,
А дамоў прыйдзе ўжо Гегемонам...

Сход канчаўся, ды раптам ускоквае пан,
Той, што з конскай нагой за Адамам
ганяўся.
Называўся ў засценку той пан Фларыян,
У Замошшы папросту ён Хлёркаю
зваўся.

— Я сусед ваш, таварышы, верны ваш
друг,
Ды, здаецца, не будзе ў нас ладу
і згоды:
Вашы коні, баюся, патопчуць мой луг,
Ваша быдла наробіць у полі мне шкоды...

Павярнуўся Біруля да Хлёркі бачком:
— Ці даўно стаў паночак нам другам,
пытаю?
Мы ў гады маладыя такіх дружбачкоў
Выжывалі, браткі, палітанню...

●

Колькі планаў! Дрыгвянку пара
асушыць.
Трэба новы пасёлак. Пытаеш —
навошта?
Жыць дык жыць па-сапраўднаму,
каб не тужыць,
Каб пад старасць успомніць было што.

Будаваць—дык ужо ад душы будаваць,
За тапор брацца трэба рукою гарачай.
Толькі як гэты новы пасёлак назваць,
Каб і складна і гучна было.
Вось задача!

Рэй нанова вядзе неўгамонны марак.
Аглядаючы твары таварышаў зорка.
— Даць камуне імя трэба гэткае, як
На маёй бесказырцы чырвоная зорка...

Засталося да ночы кароткай няшмат:
Заміраюць ужо спаквяла ў задуменні
Вершаліны густых стогадовых прысад,
Зоры бліснулі на цьмяна-сінім
скляпенні.

І на жнівеньскім небе прыкметнейшы
быў
Слынны Марс.
Ах, які недаступны, вячысты,
І дасюль небывала буйны ён усплыў,
Афарбоўкай амаль барвяністы.

Гнеўным вокам злавеснага бога вайны
Ён у тыя гады мне яшчэ не здаваўся,
Колькі розных здагадак і рознай маны
Віравала тады вакол Марса.

Быў той год годам процістаяння, калі
І ў газетах уголас трубілі, і ў школе,—
Набліжаецца Марс, ад яго да Зямлі
Кіламетраў з паўсотні мільёнаў,
не болей.

І любы грамацей ужо ведаў тады,
Я і сам гэтых спраў знаўца быў
дасканалы,—
Там, на Марсе, квітнеюць сады,
Там пракладзены ўмела каналы.

Там амаль, як зямны, валатоўскі
прастор,
І вясной, як і ў нас, далеч насцеж
адкрыта.
Там смуткуе, стаіўшы пяшчотны дакор,
Па зямляніне любым дасюль Аэліта.

І мы чуем яе, далягляд не маўчыць,
У заўсёдным імкненні, у вечнай абнове
Пранікнёна і чыста гучыць і гучыць
Голас страснай надзеі, вялікай любові...

Разгараецца Марс з кожнай хвіляй
ярчэй,
Азіраючы нашы даліны і ўзгоркі.
І Біруля прымоўк, Ніл не зводзіць вачэй
З барвянцовай вялізарнай зоркі.

— Зор на небе,— ён кажа,— не злічыш,
іх цьма,
Ды такой, вунь, як тая з чырвоным
падсветам,
Апрача нашай маткі Зямлі, больш няма.
Гэта Марс.
Гэта ж брацкая наша планета.

Там, як тут, ёсць і паша, і ніва, і бор,
І як тут, там пытанне пастаўлена рубам:
Там узняў пад'ярэмных гаротнікаў Гор
На змаганне з каварным тыранам
Тускубам.

Там былі нашы людзі — і Гусеў і Лось,
Ды апаслівы Гор упусціў перамогу.
Паляцець бы туды, эх, калі б выпаў лёс,
Разам з нашай братвой на падмогу.

Гляньце, як ён свіціцца світальным агнём.
Там канчаецца ноч... Рэвалюцыя...
Золак...
Дык давайце мы імем яго назавём
Наш пасёлак...

Верыў Ніл, што не выдумка гэта,
не зман:
Машыніст быў ахвочы да слова жывога
І чытаў «Аэліту» — раман
Аляксея Талстога.

●

Ёсць камуна, імя ў яе гучнае ёсць,
Ёсць важак,
Ёсць задору і клёку багата.
Самы час, самы раз пачынаць,
маладосць,
Камунарскае першае свята...

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Раман ТАРМОЛА

З кнігі «У ПРАДЧУВАННІ СВЯТЛА...»

Побач з дачкой Дамінікай

Мая кроў у яе.
На далоньцы малой
Мае рыскі,
як фотаадбітак.
Падабенства вачэй,
Падабенства галоў,
Падабенства пражылачак-нітак.
Ды не копію бачу я
перад сабой,
Бо сабранае ўсё гэта разам,
Ужо мае аблічча,
характар свой,
Сілу волі і тонкасць вазы.
І адкуль у дачушкі дзівосны імпэт,
Гэта рухаў неўтаймаванасць!
Калі бацька паэт,
дык яна—прайдзісвет.
Бо прайшла паўсвету так рана...
Ні хвіліны спакою—
наперад, назад
Да адкрыццяў, да цацак розных.
І з усмешкай усё... І так рэдка ў слязах
У наш век,
можа,
самы слёзны...
Ад дзяцей, ад жыцця,
кажуць, мы адстаём.
Але цешыць спадзеўка на гены:
Усё тое,
што зараз маё ў ёй—маё
Пры любых жыцця пераменах.
Незнаёмы мне лёс,
пашкадуй дзіцянё
І на ўсіх чалавечых расстаннях
Не спалі яе сэрца хатынскім агнём,
Асвяці яе сэрца—каханнем.
Як за гэта
для нейкіх для чорных сіл
Трэба плата
жывым таварам,
У ахвяру,
прашу я,
мяне прынясі
Тым багам,
што прагнуць ахвяры.

●

Мы не язычнікі.
Нам не патрэбны ідалы.
Але каменным некалі бажкам
Паклонаў столькі і пакоры выдалі—
Кружылася каменная башка.

Не для таго ж рабілі рэвалюцыю—
Сусветнае народаў адкрыццё, —
Каб толькі з адным словам рэвалюцыя
Закрэслівала ўсё жыццё...

Было такое. Больш няхай не будзе
Ні ўнізе сярод нас і ні ўгары.

ПОШУКІ ЗНАХОДКІ

ГРУЗІНСКІМІ ДАРОГАМІ ПЕСНЯРОЎ

Сярод купалаўскіх твораў перадваеннага часу чытач не мог не звярнуць увагу на вельмі пранікнёныя, вельмі цёплыя і шчырыя вершы пра Грузію — «Сонечнаму Шата Руставелі», «Генацвале», «Грузія».

Грузія, дружная з сонцам краіна,
Як жа ты сэрца і думкі салодзіш!
Вочы тут бачаць цуды з'яў дзіўных,
Вушы тут чуюць напевы стагоддзяў.

Так мог напісаць толькі чалавек, які па-сапраўднаму палюбіў гэты дзівосны край, каму сапраўды стаў ён блізкі і родны.

Адкуль жа такая замілаванасць беларускага паэта да братняй рэспублікі, да яе народа?

Як вядома, упершыню Янка Купала наведаў Грузію 24 снежня 1937 года. Ён прыехаў сюды ў складзе дэлегацыі беларускіх пісьменнікаў на 5-ы пленум праўлення СП СССР, прысвечаны 750-годдзю паэмы Шата Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры». Паэт меў магчымасць бліжэй пазнаёміцца з грузінскімі пісьменнікамі і грузінскім народам, з гісторыяй і культурай Грузіі. Пасля заканчэння работы пленума ў студзені 1938 года ён разам з А. Новікавым-Прыбоем адпачываў у санаторыі ў Цхалтуба. У лістападзе таго жа года Янка Купала зноў прыехаў у Цхалтуба — адпачыць і падлячыцца. А ў сакавіку 1941 года разам з іншымі прадстаўнікамі Беларусі паэт прымаў удзел у святкаванні 20-годдзя Грузінскай ССР і пасля заканчэння юбілейных урачысцей прыехаў у Цхалтуба ўжо разам з Якубам Коласам.

Пра гэтыя паездкі былі, вядома, публікацыі ў друку. Але часцей за ўсё — інфармацыйнага парадку. А хацелася б больш падрабязна даведацца, што жывіла любоў паэта да грузінскай зямлі і народа, з якімі канкрэтна людзьмі сустракаўся там беларускі пясняр, як склаўся іх лёс, ці памятаюць яны што-небудзь пра тыя далёкія сустрэчы.

Мне пашчасціла натрапіць на след і атрымаць ліст ад былога ўрача санаторыя № 1 у Цхалтуба Эліко Метэхелі, якой, як сведчыць грузінскі паэт Аляксандр Шанідзе, і прысвяціў Янка Купала свой верш «Генацвале». З таго ліста і пацягнулася нітачка, якая прывяла да рэдкай удачы — знайсці новыя матэрыялы, аўтографы, арыгінальныя фотаздымкі, сустрэцца з людзьмі, якія ведалі паэта, амаль праз паўстагоддзе з таго часу, як ён быў у Грузіі.

Пра сустрэчу з гераіняй верша Я. Купалы «Генацвале» Аленай Міхайлаўнай Метэхелі-Джавахішвілі і яе сям'ёю ў Тбілісі я падрабязна расказала ў артыкуле «Ты лячыла ўсмешкай мілай...» («Беларусь», 1986, № 1). Алена Міхайлаўна перадала музею групавы фотаздымак, на якім Купала і Новікаў-Прыбой сярод супрацоўнікаў санаторыя, фотаздымак з аўтографамі пісьменнікаў і аўтограф верша «Генацвале», які Янка Купала падарыў ёй перад ад'ездам з санаторыя.

У Літаратурным музеі Грузіі імя Г. Леанідзе мне паказалі аўтограф верша «Сонечнаму Шата Руставелі». Старшы навуковы супрацоўнік музея Русіко Чантурышвілі растлумачыла, што аўтограф паступіў у музей разам з архівам літаратурнага крытыка Аляксандра Сулавы (1901—1942). Магчыма, Купала перадаў яму верш у час работы Руставелеўскага пленума, бо, як вядома, гэты верш паэт напісаў спецыяльна да юбілейных урачыстасцей яшчэ ў Кіславодску, адкуль ён і прыехаў у Тбілісі. Што ж, відаць, няма нічога дзіўнага ў тым, што рукапісы Купалы, прысвечаныя Грузіі, зберагліся менавіта тут.

4 сакавіка 1941 года Якуб Колас пісаў з Цхалтуба сваёй знаёмай Н. А. Нагіной: «Я не адзін: са мною Янка Купала. Ён ужо трэці раз тут, і чалавек,можна сказаць, свой. Таму мы акружаны ўвагаю з боку медыцынскага персаналу. Наша доктарка, Ціна Дзмітрыеўна, грузінка, вельмі мілы чалавек і цудоўная дзяўчына, якою можна толькі захапляцца».

«Ціна Дзмітрыеўна — мая залоўка, сястра майго мужа,— растлумачыла мне Алена Міхайлаўна Метэхелі. — Так, яна была лечачым урачом Янкі Купалы ў лістападзе 1938 года, а ў сакавіку 1941 года — Купалы і Коласа. Я пазнаёмлю вас».

Ды ёсць яшчэ рэліктавыя людзі,
Што прагнуць, хоць каго, багатварыць.

Як не любіў такіх прайдохаў Ленін!
У іх жа філасофія свая:
Мільёны паўздымаліся з каленяў,
Яны ж—на ўсякі выпадак, стаяць.

І гэты від не выведзецца скора,
Не пойдзе ў небыццё ён сам сабой.
Стагоддзі сведчаць: рабская пакора
Спрадвеку выратоўвала рабоў.

●

Уцэньваюцца зборнікі,
Паэты не ў цане...
Змаркела Музы сонейка,
Не свеціць, як раней.

Даўно ў будзённым клопаце
Не на душы рубец,
А мора слоў і копаці,
І да рубля рубель.

Эпітэтаў, метафараў
Не залаты запас
Пяе сабе анафему...
Прадбачыць трэба Час!

Так яву прыхарошвалі,
Што ў роднай старане
Паэтаў-слуг пабольшала,
А вось прарокаў—не...

Развага вечная мужчыны

У неабсяжнасці Айчыны
Змяшчаецца і плач,
і спеў,
Развага
вечная
мужчыны,
Што меў ён
і чаго не меў.
Што мог зрабіць ён для Радзімы,
А толькі час прамарнаваў:
Усё спазняўся на радзіны
Дакладных слоў,
канкрэтных спраў.
І неабсяжнымі вачыма
Гады
самота
абвяла.
І замаркотнела Айчына
Ля ненакрытага стала.
На палатняным
на абрусе
Хіба што кветак нацюрморт,
Якіх так многа ў Беларусі—
Не прагуляе нават мот.
А можа, гэта —
самамэта,
Самазнішчэнне напаказ,
Каб не ходзіць у прайдзісветах
Каторы год,
каторы раз...

●

Нараджаюцца смелыя людзі,
Справы смелыя, смелы пагляд.
Ёсць надзея,
што смелымі будзем,
Як адзін...
праз год пяцьдзесят.

Скажам праўду адзін другому,
Не пакрывім ні ў чым душой,
І не будзе маланак
з громам:
Знайце, смеласці час прыйшоў!

Да яго мы ішлі так доўга...
Каб з нас кожны вымавіць мог:
Над самім сабой перамога —
Найцяжэйшая з перамог...

Пасля кінафільма «Пакаянне»

Пакайцеся,
хто вінаваты
Ці можа вінаватым быць!
Не засыпайце хітраю лапатай
Свае грахі
пад сцягам барацьбы...
Было такое—чалавек загіне,
Зусім сатрэцца ў памяці людской...
Але страшней,
чым не застацца ў гімне,
Быць не прынятым роднаю зямлёй!
Калі і вочы нават не глядзелі б.
І адварочваўся праменны дзень,
Хаваючы на лепшае надзею
Сярод неміласэрнасці падзей.
О гэтыя гісторыі урокі...
Сціскаюць сэрца і займаюць дых.
Нас глушаць іх прыцішаныя крокі.
Не паўтарыць бы нам ніколі іх...

Не толькі роспач...

Якое шчасце, што ў часы пакут
Не толькі роспач за спіной стаяла,
Што не застаўся тлець душэўны трут,
Што сэрца і надзею напаткала.

І вывела надзея на бальшак
Спрадвечнай чысціні і праўды
Такое занядбанае спярша,
Падмаляванай часта для парада.

А зараз моцы зноў,
хоць адбаўляй!
І сэнс вялікі у вялікім руху,
Без утрапёнага: «Ат, пі-гуляй,
Не час—дык людзі возьмуць на парукі».

Не, супраць праўды я не саграшу,
Калі скажу сумленна, вінавата:
Мы занядбалі некалі душу,
Лічылі больш здабыткі,
а не страты...

Аванс

Я ад маўклівасці ахрып.
А крыкуны замоўклі.
Свабода запрасіла ўглыб
Калодзежа,
што ад работы мокры.

Не можа рэха паўтарыць
Раптоўна анямелых,
Ні мудрых самых да пары,
Ні самых смелых.

Нас апярэдзіў проста час,
Якога не чакалі.
І не зароблены аванс
Гняце нас,
быццам камень...

●

Запішыце ў «Чырвоную кнігу»
Сумленне,
Як яшчэ адзін
людзям святы напамін,
Што яно—
нашых душ,
нашых спраў апярэнне,
Без якога не ўзняўся ўгару—
ні адзін.
Запішыце ў «Чырвоную кнігу» Спагаду.
Так патрэбна цяпер
чалавецтву яна,
Калі атамнай бомбы
маўклівая ўлада
Пахавала жывых нас
пад словам «вайна».

Запішыце ў «Чырвоную кнігу» радзіму,
Што вялікай была,
а празвалі «малой»
За пустую
недзе ля рэчкі хаціну
З цеплынёю былой,
і з любоўю былой...

На жаль, тады, у час першай паездкі, я не змагла сустрэцца з Цінай Дзмітрыеўнай. Але яна перадала праз Алену Міхайлаўну фотаздымак, на якім яна сфатаграфавана з Купалам і Коласам і супрацоўнікамі санаторыя. Фотаздымак гэты падарыў ёй Якуб Колас, на адвароце яго аўтограф. Тады ў Тбілісі я не змагла прачытаць усе словы, бо ад часу чарніла выгарала. Да канца прачытала я аўтограф ужо ў Мінску, пасля дапамогі спецыяліста Навукова-даследчага інстытута судовай экспертызы Міністэрства юстыцыі БССР Л. М. Гулякевіча. Ён з ахвотаю і вельмі хутка выканаў нашу просьбу. І вось перад нашымі вачамі — невядомы аўтограф Якуба Коласа:

Міламу, дарагому
Доктару
Ціне Дзмітрыеўне.
Мілая Ціна, сэрца Цхалтубо!
Прыміце падзяку Вы ад Якуба.
За Вашу ўвагу, за ласкі і лекі
Я буду насіць Вас у сэрцы навекі.
Якуб Колас,
благодарный пациент
14. III. 1941
Цхалтубо

На мае просьбы напісаць успаміны Ціна Дзмітрыеўна не адказвала. А вясною нечакана зноў парадавала — перадала новы фотаздымак. Прывёз яго сын Ціны Дзмітрыеўны Атар. Атар Шаматава, па прафесіі архітэктар і рэжысёр, працуе на кінастудыі «Грузія-фільм». У Мінск ён прыехаў як мастак афармляць спектакль «Прыручэнне сокала» па п'есе Л. Табукашвілі ў Рускім тэатры БССР імя М. Горкага.

Сустрэлася я з Цінай Дзмітрыеўнай у апошнія дні 1986 года. Яна і цяпер вельмі прыгожая, статная, падцягнутая і маладжавая.

Цінацін Дзмітрыеўна нарадзілася ў 1914 годзе ў Тбілісі ў сям'і прафесара Д. В. Джавахішвілі, аднаго з заснавальнікаў Інстытута курорталогіі ў Грузіі. У 1937 годзе пасля заканчэння медыцынскага інстытута яна стала працаваць у Цхалтуба ў тым жа санаторыі, што і Эліко Метэхелі. Янку Купалу яна ўжо ведала па яго першаму прыезду ў санаторый. А ён адразу запытаў: «Дык вы цяпер будзеце маім урачом? А дзе ж Эліко?» Эліко Метэхелі тады была ўжо замужам і збіралася пераязджаць у Тбілісі. Неўзабаве Янка Купала запрасіў Ціну Дзмітрыеўну з сяброўкамі-калегамі адзначыць яго прыезд. Перад ад'ездам у Кутаісі, дзе ўжо чакалі грузінскія пісьменнікі, сфатаграфаваліся. «Я хацела стаць збоку, але Янка Купала папрасіў стаць побач з ім. Быў ён у цудоўным настроі, шмат жартаваў. Вось такі, сам увесь светлы, сонечны, як і гэты надзіва ласкавы, цёплы лістападаўскі дзень, ён на гэтым фотаздымку»,— успамінала Ціна Дзмітрыеўна.

Прыпамінае яна таксама, што Янка Купала вельмі цікавіўся жыццём грузінскага народа, пабываў у некалькіх вёсках, агледзеў помнікі архітэктуры паблізу Кутаісі. Аднойчы ён пабываў у музеі Маякоўскага і падзяліўся з ёю сваімі ўражаннямі.

Як памяць пра тыя дні, зберагла Ціна Дзмітрыеўна кнігу Янкі Купалы «Избранные произведения» (М., 1938 г.), якую паэт падарыў ёй перад ад'ездам з санаторыя з аўтографам: «Доктару Тине Джавахишвили славной златокудрой грузинке жить, как в сказке, вечно с песней радости и счастья. Янка Купала Цхалтубо. 30/XI-38 г.»

Пра апошні прыезд (у сакавіку 1941 года) Янкі Купалы ў Цхалтуба Ціна Дзмітрыеўна расказвае больш падрабязна. Да гэтага часу памятае яна яго рукі, «сінія, прыпухлыя», паэт скардзіўся на болі ў суставах. А аднойчы яна звярнула ўвагу на дрэнны выгляд свайго пацыента, і тады ён прызнаўся, што яго моцна мучыць бяссонніца. Яму прапісалі ванны, і праз тыдзень ён зноў быў бадзёры і вясёлы. Але за працу не браўся, «відаць, надакучыла дома». Больш адпачываў, любіў паслухаць, як у парку іграе аркестр.

Якуб Колас часцей заставаўся ў сваім пакоі, усё нешта пісаў. У вольны ж час шмат жартаваў, зачароўваў сваёй ветлівасцю, весялосцю. Аднойчы, прыйшоўшы на прыём, і напісаў ёй на фотаздымку гэтыя цудоўныя словы. Расказвае Ціна Дзмітрыеўна і пра паездку ў тэатр у Кутаісі. Была нейкая прэм'ера, і беларускія пісьменнікі запрасілі ўрачоў санаторыя разам паехаць у тэатр. Сядзелі ўсе ў ложы, абменьваліся думкамі, а пасля спектакля ўрач з Кутаісі Кацярына Чынгалішвілі запрасіла ўсіх разам павячэраць.

Але, бадай, больш за ўсё запомніўся Ціне Дзмітрыеўне дзень яе нараджэння. Яна да гэтага часу не ведае, адкуль даведаліся яе пацыенты, што яна імяніница. Але раніцою яны з'явіліся да яе пасвяточнаму апранутыя і горача і сардэчна павіншавалі. У руках у Якуба Коласа быў букет вельмі прыгожых кветак. Янка Купала трымаў вялікі альбом. Былі яшчэ цукеркі, духі і маленькая пудраніца. Але больш за ўсё была яна рада альбому. Гэта быў вельмі вялікі альбом з ілюстрацыямі да «Віцязя ў тыгравай шкуры» Ш. Руставелі, з дванаццаці карцін. На першай старонцы беларускія паэты зрабілі дароўны надпіс. «Які гэта быў надпіс! — вялікі, на ўсю старонку, у вершах. А якія цудоўныя словы!» — хвалюецца Ціна Дзмітрыеўна. Яна доўга берагла гэты альбом. Але прыкладна гадоў дваццаць назад да яе прыйшлі двое, адзін быў грузін, а другі рускі (ці беларус). Сказалі, што будуць пісаць пра Янку Купалу, збіраюць матэрыял пра яго. Як цяпер яна шкадуе, што не запытала і не запісала, хто яны, шчыра паверыла ім, дала альбом. «Я ж паверыла ім, як і вам, што гэта трэба для музея, для справы», — не можа супакоіцца яна.

Янка Купала сярод урачоў і адпачываючых. Цхалтуба. 1938.



Янка Купала і Якуб Колас з урачамі санаторыя. Цхалтуба. 1941 г.

Сапраўды, хто гэтыя людзі? І дзе можа быць гэты альбом? Калі б гэта быў хто-небудзь з беларускіх пісьменнікаў ці журналістаў, звесткі ўжо даўно трапілі б у друк. Застаецца толькі спадзявацца, што не мог бясследна згубіцца гэты альбом, і мы яшчэ зможам прачытаць аўтографы нашых песняроў.

Праз тры месяцы пасля ад'езду Купалы і Коласа з Цхалтуба пачалася вайна. Ціна Дзмітрыеўна расказвае, як цяжка было працаваць ёй у ваенныя гады. Цхалтуба стаў цэнтрам эвакуіраваных шпіталяў. Яна працавала начальнікам аддзялення хірургіі шпіталя № 1422. За сумленную працу ўзнагароджана медалямі, ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені. У 1963 годзе ёй прысвоена званне заслужанага ўрача ГССР. Ціна Дзмітрыеўна і цяпер працуе ўрачом паліклінікі IV Галоўнага ўпраўлення ГССР.

Муж Ціны Дзмітрыеўны П. Ю. Шаматава—заслужаны журналіст ГССР, ветэран вайны. Доўгія гады працаваў намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні ГССР.

Я не магла не наведаць Цхалтуба, гэтую мясціну, так хораша апетую паэтам. З цяжкасцю, з дапамогаю многіх людзей, я знайшла былы першы санаторый, які з 1957 года стаў пансіянатам. Зрэшты, гэта быў ужо не будынак, а хутчэй руіны. Калі б не адзін фотаздымак, які дала мне з сабой Алена Міхайлаўна, я магла б і не пазнаць яго. На месцы санаторыя будзе ўзведзена гасцініца для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Мяне пацягнула прайсціся ад санаторыя тымі сцежкамі, якімі хадзілі нашы песняры да прыродных крыніц, пагуляць у парку — любімым месцы іх адпачынку, пазнаёміцца з курортным горадам.

Дырэктар Цхалтубскага НДІ курорталогіі і фізіятэрапіі ГССР, кандыдат медыцынскіх навук А. Н. Шавіанідзе, намеснік старшыні Цхалтубтэркурортсавета Я. В. Самадалашвілі, загадчыца Цэнтральнай курортнай бібліятэкі М. А. Гардзезіяні, з якімі мне давялося сустрэцца, вельмі ўхвалілі прапанову Літаратурнага музея Янкі Купалы ўстанавіць у Цхалтуба бюст Янкі Купалы, зрабіць там куток ці выстаўку, прысвечаную Купалу і Коласу. «Гэта была б вялікая падзея ў культурным жыцці нашага курорта», — сказаў Я. Самадалашвілі. Станоўча аднёсся да гэтай прапановы і сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Грузіі Хута Берулава. Галоўнае, і бюст не трэба заказваць, бо Міністэрства культуры БССР перадало музею бюст Янкі Купалы работы народнага мастака БССР, скульптара А. Бембеля, і ён стаіць пакуль што ў вестыбюлі музея. Матэрыялы для выстаўкі ці кутка, прысвечанага беларускім песнярам, падрыхтавалі б навуковыя супрацоўнікі музеяў пісьменнікаў.

Ніна ЦВІРКА.

СТАРЫ ДОМ

Пасля мінскіх гастроляў Акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа

...І УСЁ-ТКІ самае дзіўнае ў тэатры — гэта глядач. Загадка з загадак. Таямніца з таямніц. Ну што мы ведаем пра яго? Што «наш глядач — самы патрабавальны і ўдзячны» і што «публіка дурніца»... Вось амаль і ўсё. Сутнасць жа тлумачэнню, мабыць, і не паддаецца. Як, скажыце, завецца тое вытанчанае шостае пачуццё, што раптоўна праразаецца ў чалавеку, калі яго пачынаюць лічыць па сацыялагічнай графе «патэнцыяльная глядацкая аўдыторыя»? Якія такія невядомыя навуцы флюіды выпраменьвае звычайная, з вострым пахам свежай друкарскай фарбы, афіша, аднаго позірку на якую хапае яму, каб зразумець, ці варта дзеля тэатра перакройваць расклад вольнага часу? Якім чынам спрытна абмінае ён усе рэпертуарныя пасткі і, наадварот, — якому імпульсу падпарадкоўваецца, менавіта сённяшні вечар ахвяруючы на візіт (як правіла, адзін з 2-3 штогадовых) у тэатральную залу?

Падобных пытанняў я мог бы задаць мноства. І ўсе яны хвалююць мяне ў сувязі з галоўным засмучэннем ад сёлетніх мінскіх гастроляў коласаўцаў — напаўпустой залай на спектаклях тэатра з Віцебска.

Не выпадае ідэалізаваць увесь комплекс якасцей, якія складаюцца ў адно з паняццяў нашай нацыянальнай культуры — «коласаўскі тэатр». Вартасці і недахопы тут з дзіўнай лёгкасцю мяняюцца месцамі, утвараючы адмысловы, часам надзвычай стракаты кангламерат. На творчае аблічча ўплывае, безумоўна, і «астраўное» становішча, якое займае калектыў у тэатральным працэсе рэспублікі, і, таксама, двухсэнсоўнасць ягоных акадэмічна-перыферыйных будняў...

І вось да гэтага тэатра я адчуваю штосьці большае, чым проста сімпатыю і прыхільнасць, а на назву аднаго са спектакляў — «Стары дом» — адгукаюся і ўвогуле да непрафесійнасці чулліва. Стары дом... Дом, дзе не ўсё даведзена да ладу, які жыве несалодка, — але захоўвае асаблівы водар, непаўторнасць. Адметнасць гэтая не ёсць нешта няўлоўнае — яна замацавана ў спосабе акцёрскага існавання, выяўляецца праз пэўнае вырашэнне сцэнічных канфліктаў. Можна і пра мае ўлюбёныя «няўлоўнасці» паразважаць, ды небяспечна збіцца на прэтэнцыёзна-напышлівы «штыль», бо сапраўдных слоў удзячнасці жыхарам дома я не адшукаў яшчэ.

Разумею, што манапалізаваць права любіць тэатр і як асабістую крыўду ўспрымаць ягоную непапулярнасць — недарэчна, калі не смешна. Але менавіта пустуючыя крэслы партэра наводзяць на роздум, надаюць адпаведны ракурс гаворцы пра сённяшні дзень коласаўцаў. І найперш — гаворцы пра рэпутацыю, прэстыж тэатра. Бо нават уявіўшы, што яркія з'явы кіно і літаратуры апошнім часам адкінулі сцэнічнае мастацтва на «другі план» грамадскай цікаўнасці, што тыя, каго віцябчане штовечар недалічваліся на сваіх спектаклях, пагалоўна былі заняты чытаннем «Дзяцей Арбата», альбо што спрацаваў высокі аўтарытэт выдатнага пісьменніка (дакументальны фільм «Васіль Быкаў. Узыходжанне»), і мінская публіка захварэла на «тэатрафобію», — усё роўна, гледачам нашай сталіцы стае «пораху», каб калі-нікалі выказаць свае прыхільнасці аншлагам. Самае цікавае — яны рэдка памыляюцца.

Непапулярнасць коласаўскага тэатра, з усяго відаць, успрымаць трэба не як крыўду, а як пастаянную велічыню. «Папраўку» на яе глядач зрабіў яшчэ да пачатку гастроляў і, баюся, не сёлетніх, а, магчыма, гастролі тут увогуле ні пры чым. І не пра рэкламу размова, якая не толькі ў віцябчан на прымітыўным узроўні, — пра ўменне працаваць рытмічна і ўпэўнена, выпускаць спектаклі, а не латаць раз-пораз рэпертуарныя дзіркі. Справа, мусіць, у няздольнасці тэатра стварыць і падтрымліваць вакол сябе поле высокага напружання. Стары дом, стары дом... Што сапраўды і крыўдна і прыкра— бязрадасны няпоспех. Не правал, а ніякасць.

Дзевяць назваў было пазначана на гастрольнай афішы Акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа. Афіша «тэматычна збалансаваная», сказалі б мы пазаўчора, паўшчуваўшы за няўвагу да рускай класікі. Учора — адзначылі б, што на афішы «ўсё нібыта ёсць», за выключэннем рускай класікі, школы акцёрскага майстэрства. Сёння... Сёння мы гатовы прыняць тэатр, здаецца, і без класікі, і без «дацкага» спектакля — але рэпертуар коласаўцаў не задавальняе ні паводле пазаўчарашніх мерак, ні паводле ўчарашніх. Чаму так сталася? Ці то слых наш патанчэў, ці то сапраўды іншаземны акцэнт афішы заглушыў усё, нават чыстую мелодыю «Вечара»?

Выбар такіх п'ес, як «Гэты страсна закаханы» П. Саймана і «Будзьце здаровы» П. Шэно, можна, вядома, аспрэчваць. І меркаваць, аскароміўся акадэмічны тэатр ці не. Спадзяюся, аднак, што некалі мы перастанем быць пурытанамі, бо драматургічная тэхніка (няхай піратэхніка) аўтараў замежных шлягераў — высокая. Імпартуем мы тое, у чым маем пэўны дэфіцыт. Праўда, камедыйнае шампанскае ў нас чамусьці прынята наліваць у гранёныя шклянкі, а не ў грацыёзныя танканогія фужэры... Што, прынамсі, і пацвердзілі пастаноўкі Д. Дзіджыокаса.

Вось і ўвесь «акцэнт». Увогуле, «касавыя інтарэсы» коласаўцаў не агрэсіўныя, нават досыць наіўныя. У тым сэнсе, што вялікія затраты акцёрскай энергіі — у спектаклях заняты выканаўцы, якія шмат у чым вызначаюць творчы і прафесійны тонус трупы: З. Канапелька, Г. Дубаў, У. Куляшоў, С. Акружная (у «Страсным закаханым» актрыса прапануе нязвыкла рэзкі, нават рызыкоўны трагікамічны малюнак ролі Бобі Мітчэл), Б. Сяўко, — сябе не апраўдваюць.

Не прынята залішне цікавіцца чужымі даходамі, наколькі яны пакрываюць выдаткі, але відавочна, што ў Віцебску не скупяцца, каб забавіць гледача. «Ах, які пасаж!»—відовішча багатае і яркае. Вечарам старадаўніх рускіх вадэвіляў два гады назад дэбютаваў на коласаўскай сцэне рэжысёр І. Баярынцаў. Не думаю, што гэта заяўка на мастакоўскую праграму, ды лёгкія камедыі з займальнай інтрыгай, танцамі і спяваннем («Аз і Ферт» П. Фёдарава і «Бяда ад пяшчотнага сэрца» У. Салагуба), бясспрэчна, ва ўсе часы могуць зрабіцца сапраўдным святам адмысловай тэатральнасці, парадам добрай весялосці. І наладзіць няпростае выпрабаванне рэжысёрскаму і акцёрскаму густу.

Густ і мера пастаноўшчыку не здрадзілі. І. Баярынцаў, здаецца, востра адчувае небяспеку «перабраць», выпусціць з-пад кантролю стыхію густанаселенага спектакля — і «недабірае». Усё нібыта па школе, дакладна разлічана і размеркавана, вытрымана ў спакойным рэчышчы — у той час, калі прагнеш кідкай формы, вынаходлівай смеласці і фантазіі.

На гэтым камедыйная лінія рэпертуару коласаўцаў перапыняецца. Астатняе — творы, што называецца, сур'ёзныя, добрыя і розныя. Чаму ж не пакідае адчуванне нейкага перакосу, няпэўнасці менавіта рэпертуарных шуканняў? Нават вынесеная за дужкі цяперашняя наша незадаволенасць тэатрам «увогуле» — за стылістычную і грамадзянскую бясплоднасць — не прыцішвае неўразумеласці сітуацыі, у якой знаходзяцца коласаўцы. Чаму зноў аказваюцца небеспадстаўнымі размовы пра тое, што пасуе акадэмічнаму тэатру, а што яму не да твару?

Магчыма, я задаю не тыя пытанні, карыстаюся не тым ключом, завельмі марудна адкрываючы замок зусім простай канструкцыі. Што зробіш, не люблю ўзлому... І хіба «зусім проста» — калі кампанія безумоўна таленавітых людзей не можа пераканаўча рэалізаваць свой творчы патэнцыял?

Героі п'есы Ю. О'Ніла «Любоў пад вязамі», думаецца, адрозніваюцца ад персанажаў віцебскага спектакля (пастаноўка Д. Дзіджыокаса). Найперш больш складанай нервовай структурай, хваравітай і напятай — як вядома, на мове арыгінала ў загалоўку замест «любоў» пазначана «страсці», што ўжо само па сабе, напэўна, трактоўка. Коласаўцы іграюць любоў пад вязамі, і дрэвы — вось яны, паўсталі абапал дыхтоўнага дома заможнага фермера Эфраіма Кэбата. Я назваў бы спектакль адаптацыяй вядомай п'есы (такім ён, па сутнасці, і з'яўляецца), ды яшчэ ўпікнуў бы рэжысёра за нежаданне даць хоць бы падабенства псіхалагічнай распрацоўкі сюжэта і кволую масоўку, — калі б на сцэне не ўзнікла жыццё. Усё было папраўдзе, тактоўна і без прэтэнзій на шматзначнасць выканана Ю. Куліком (Эбін) і Л. Цімохавай (Абі), В. Дашкевічам і П. Ламанам (браты Сімяон і Пітэр), Л. Трушко (Эфраім). Твор патрапіў на ўдзячныя акцёрскія індывідуальнасці, і тэатр, азваўшыся на штосьці генетычна знаёмае ў п'есе, прапанаваў гісторыю пра тое, як было ў бацькі тры сыны і прывёў ён маладую жонку...

Не хацелася б выдаваць нястачу за дабрачыннасць, але можна пазайздросціць стойкасці стваральнікаў спектакля «Цень гары». Мінулы сезон рэжысёр В. Мазынскі і акцёры Г. Шкуратаў, Г. Букаціна, Я. Шыпіла правялі ў лабараторыі нацыянальнай драматургіі. Метадам сцэнічнага эксперыменту было выяўлена, што дэбютная п'еса У. Халіпа кампазіцыйна рыхлая, груваткая, з вельмі прыблізнай псіхалагічнай матываванасцю ўчынку персанажаў.

У Злучаных Штатах Амерыкі адбываецца дзея п'есы. Героі — пілот Майкл Бэл і коміваяжор Бэнджамін Чэйз, ветэраны вайны ў В'етнаме, камандзір і штурман баявога экіпажа бамбардзіроўшчыка. Сябры сустрэліся праз шмат гадоў, але іх сустрэча — не радасная. Мінулае, якім яны ганарыліся, ганебнай плямай кладзецца на біяграфіі, перакрэслівае кар'еры, руйнуе адносіны з блізкімі людзьмі...

Сорамна прызнацца, ды мне, відаць, не ўдасца сцісла перадаць фабулу твора, а дакладней, шматлікія адгалінаванні ў дыялогах персанажаў. Ведаю, што гэта не аргумент, але я ўжо страціў надзею разгадаць сакрэт «Ценю гары» на коласаўскай сцэне. Што саграе ў п'есе стваральнікаў спектакля, які мае адбітак доўгай рэпетыцыйнай працы і вылучаецца надзвычай упартымі акцёрскімі работамі? Нязвыкласць сітуацыі? Нейкія алюзіі? Загадка...

Не выключана, што нехта з рэжысёраў здолее знайсці адпаведны падыход да гэтай «сумнай гісторыі, дзе любоў і смерць вядуць сваю спрадвечную спрэчку» (так напісана ў праграмцы спектакля, і ці няма тут блытаніны з «Рамэа і Джульетай») — і яна будзе ўваскоблена згодна з аўтарскай задумай. Шматслоўнасць абернецца інтэлектуалізмам, экзатычныя рэаліі — шырынёй кругагляду, настолькі ж натуральнай для нашай драматургіі, як і цяперашняя тэматычная збедненасць. Магчыма, магчыма...

Падалося, што найбольшым глядацкім поспехам карыстаўся сёлета «Стары дом» А. Казанцава. Не прэм'ера — спектакль пастаўлены В. Маслюком у 1981 годзе. Разам з «Вечарам» ён спрабуе пераадолець сацыяльную анемічнасць рэпертуару, адцяняючы лаўрэацкі твор коласаўцаў (і, даруйце, нагадвае пра цікавы перыяд у жыцці тэатра, калі аўтары гэтых пастановак працавалі побач). Паглядзець сёння «Стары дом», апроч усяго іншага, было нават павучальна. Аціхла цунамі вакол дзесятка п'ес, і стала зразумела, што іх аўтары вастрэй за іншых адчувалі супярэчлівасці нашай рэчаіснасці і мелі смеласць выказвацца ўголас. Рэжысёры, якія ўвасаблялі п'есы новых драматургаў, выяўлялі сваё стаўленне не да тэкстаў, а да сапраўдных жыццёвых канфліктаў. У выніку нараджаліся спектаклі, што прапанавалі новы ўзровень кантактаў з гледачом. «Стары дом» — і праз шэсць гадоў — жывы спектакль.

Сёння ў коласаўцаў (і не ў іх адных) няма сцэнічнага твора, які прывёў бы ўвесь калектыў у стан гатоўнасці «нумар адзін», — няма спектакля для ўсіх. Эскізы да гэтага гіпатэтычнага спектакля, ягоныя рысы і нават часткі існуюць — распыленыя па рэпертуарным «масіве».

...У старым доме такое здараецца: толькі што была тая ці іншая рэч навідавоку, а цяпер, пільна патрэбная, — як скрозь зямлю праваліласа. Варта пашукаць на гарышчы, бо з паважаючага сябе старога дома бясследна нічога не знікае...

І пашукаць, і знайсці, і стварыць той спектакль — абавязак В. Мазынскага. З часу мінулых гастроляў тэатра ў Мінску галоўны рэжысёр паставіў «Вечар» і «Радавых» А. Дударава, «Гаспадара» А. Дзялендзіка, «Зінулю» А. Гельмана, «Рамэа і Джульету» У. Шэкспіра і «Цень гары» У. Халіпа... Гады прайшлі не марна, але няроўна. І, бадай, ніколі яшчэ ў творчай біяграфіі лідэра коласаўцаў так імкліва не расла цана кожнай наступнай рэпертуарнай пазіцыі. І, напэўна, ніколі ў адказ на пытанне «а што заўтра?» не апускаліся так рукі (мяркую па інтэрв'ю «Звяздзе», 28 мая 1987 г.)... Спыню, аднак, таннае маралізатарства. Што асабліва бянтэжыць у апошніх пастаноўках В. Мазынскага, дык гэта «кароткае дыханне». Рэжысёра часам стае ўсяго на адну ролю. Так можа атрымацца досыць прывабная «Зінуля», але не шэкспіраўская трагедыя.

Адкуль чэрпаць энергію?

Нядаўна Беларускае тэлебачанне паказала перадачу, героем якой быў Анатоль Міхайлавіч Трус. І спыталі Анатоля Міхайлавіча нешта пра сённяшні дзень коласаўскай сцэны. «Дзед», як завуць яго ў гэтым доме, адказ даў на добры тузін падобных пытанняў: «Тэатр жыў, жыве і будзе жыць!».

Андрэй ГАНЧАРОЎ.

ЧАСОПІСЫ Ў ЛІПЕНІ

«ПОЛЫМЯ»

«Хлеб надзённы» — лірычныя мініяцюры Я. Брыля. Проза прадстаўлена таксама пачаткам рамана В. Супрунчука «Жывеш толькі раз».

Змешчаны вершы К. Камейшы, М. Стрыгалёва, А. Ставера, М. Пазнякова, паэма А. Зарыцкага «А ці далёка да Марса?»

У раздзеле «Новыя пераклады» — творы чувашскіх паэтаў, перакладзеныя П. Макалём, Ю. Свіркам, К. Камейшам, М. Маляўкам, Я. Янішчыц.

Артыкул Д. Сверкунова «Знойдзеныя мільёны» прапануецца пад рубрыкай «Кастрычнікам вывяраючы крок».

Нарыс «Памяць» С. Паўлава — асобныя моманты з жыцця П. М. Машэрава.

«Разведка працягвае пошук» — працяг успамінаў М. Фядотава.

Артыкул В. Каваленкі «Пафас і логіка перамен» і А. Васілевіч «Жыві, працуй і смейся» аб'яднаны ў раздзеле «Крытыка і літаратуразнаўства».

Новыя кнігі рэцэнзуюць У. Конан (энцыклапедычны даведнік «Янка Купала»), Л. Тарасюк (кніга паэзіі Г. Бураўкіна «Гняздо для птушкі радасці»), А. Марціновіч (зборнік «Сучаснік-86»), П. Васючэнка (гумарыстычная аповесць Р. Лазуркіна «Благаслаўскія салаўі»).

«Жывое народнае слова» — артыкул Г. Юрчанкі публікуецца пад рубрыкай «Культура мовы».

«МАЛАДОСЦЬ»

З вершамі выступаюць Г. Булыка, В. Шуткевіч, С. Кавалёў, К. Жук, з баладамі — Я. Сіпакоў.

У раздзеле прозы аповесць В. Гардзея «Жыта ганьбу не заслоніць», апавяданні М. Капыловіча, заканчэнне аповесці Г. Марчука «Паляшук».

Пад рубрыкай «На фронце паскарэння» прапануецца фотанарыс В. Ждановіча «Між тых азёр...». Нарыс У. Глушакова «Ля вытокаў Ловаці» змешчаны пад рубрыкай «Грані перабудовы».

Штрыхі да творчага партрэта Я. Брыля напісала Ю. Канэ — «Адгукнецца ў сэрцы чужы боль...» (да 70-годдзя пісьменніка).

«Карані бацькоўства і лісты... мяшчанства» — артыкул крытыка А. Русецкага.

Рэцэнзуюцца кнігі «Быў. Ёсць. Буду» У. Караткевіча і «На досвітку» І. Хадановіча.

«БЕЛАРУСЬ»

У нумары — фотарэпартаж Д. Лупача «Метал, бетон і дружба», фотарасказ Ю. Іванова «Мір нам патрэбен для дзяцей: а значыць — для будучыні!» з калгаса «Аснежыцкі» Пінскага раёна.

Друкуюцца апавяданні П. Ламана і А. Асташонка, вершы К. Камейшы, Х. Гурыновіча, В. Яраца, Л. Паўлікавай. Творы С. Шах прадстаўляе Р. Баравікова.

Раман В. Быкава «Кар'ер» рэцэнзуе В. Жыбуль — «Пайсці і вярнуцца».

Змешчаны заканчэнне нарыса В. Жука «Лыжка мёду, бочка дзёгцю...», працяг дакументальнай аповесці Ю. Іванова і І. Майданава «Аперацыя «Крот».

Прадстаўлены традыцыйныя рубрыкі «Спадчына», «Майстэрня», «Суб'ектыўны аб'ектыў».

Сярод іншых матэрыялаў — рэцэнзія Я. Гарадніцкага на энцыклапедычны даведнік «Янка Купала», карэспандэнцыя М. Няхая «У гацінным доме паэта», нарыс В. Лапіна «Прадаецца сакрэт шчасця».

«НЁМАН»

Падборку вершаў В. Зуёнка «Воблакі над раллёй» пераклалі Г. Бубнаў і У. Гардзейчаў. Байкі К. Крапівы прапануюцца ў перакладзе Б. Спрынчана. Паэзія прадстаўлена таксама вершамі Р. Гусевай.

Публікуюцца апавяданні У. Арлова і А. Кажадуба (пер. з беларускай), пачатак рамана М. Чаргінца «Торгар — Чорныя горы», нарыс Э. Каспяровіча «Вясковы тыдзень», успаміны В. Аніконава «Воўчая града».

Да 70-годдзя Я. Брыля думкамі аб яго творчасці дзеляцца Д. Гранін («Талент вялікі, добры, незалежны»), В. Казачэнка («Маладосць слова»), М. Стральцоў («І школа, і традыцыя»).

«Твары ў карціне» — артыкул А. Станюты.

Ёсць падборкі «Кніжны агляд», «Учора. Сёння. Заўтра».

«Жывіца» ў Заслаўі

Вольна і раскута дыхала матуліна песня на свяце народнай творчасці Міншчыны «Жывіца». Другі раз ладзіцца ў сталічнай вобласці фестываль народных талентаў. Старажытны Нясвіж, які мінулым летам расхінуў «Жывіцы» блакітныя далягляды, сёлета перадаў эстафету тысячагадоваму Заслаўю.

Тут, дзе ступала гісторыя, прытоена дыхае вечнасць. Тут сляды нашых продкаў, галасы іх і рукі жывыя... У маўклівых валах, у камянях і курганах... Кулямі працятая зямля заслаўская не раз падымалася з руін і пачынала новае жыццё. Аднаўлялася, буяла зеляніна, расцвіталі таполі — і вяршыўся вечны кругаварот: нараджаліся новыя песні і звычаі, каб прарасці сакавітым парасткам у будучыню. Тут, дзе студзіла гаручыя слёзы Рагнеды рака Княгінька, ажылі старадаўнія беларускія абрады, завіхурылі лявоніха і кадрыля, устрапянулася паўзабытая мелодыя гусляў.

Звычныя элементы масавых тэатралізаваных прадстаўленняў — вясёлыя поклічы зазывал, карнавал казачных персанажаў, пацешкі і жарты народных «любімцаў». Несцеркі з Цярэшкам — набылі ў «Жывіцы» новую афарбоўку, загучалі невыказна-шчыра, спавядальна. Бо як жа не паверыць валачобнікам, якія жадаюць шчодрага лета і вітаюць народ велічальнымі песнямі? Як не заслухацца ласкавым голасам зязюлі, што зычыць многа шчаслівых год?!

Шчодра засеялі заслаўскую зямлю зернем творчасці вясёлыя госці. Узыходзіла над плошчай гарачае сонца — асвятляла неабсяжны свет мастацтва, а потым звіней спорны дождж — і ўсміхаліся людзям кветкі — зоранькі нашага краю. Усцілалі дарогу зелянінай руплівыя гаспадары свята — прывячалі самадзейных артыстаў. Прычашчаўся святочны люд да хлеба — да святыні, выпеставанай нястомнай працай, далучаўся да вечнай чысціні простага, як жыццё, народнага майстэрства. Хто трапляў у палон задуменнай песні, хто не забыўся імклівых рухаў вірлівай полькі, той зразумее, як жывіла, уздымала над будзённасцю «Жывіца».

Ціхая, журботная песня з'яднала, сабрала пад адзін блакітны дах гараджан і вяскоўцаў, бацькоў і дзяцей. Нездарма прадзеды выдумалі святы, нездарма жылі па законах, адзіных з прыродай, з зямлёй. Нідзе так не пазнаецца злітнасць чалавека з усім светам, з наваколлем, нідзе не выспявае такая жыццедайная любоў да краю, як у агульнай працы. А свята — гэта ўзвышаная праца душы.

У чароўную казку на свяце траплялі дзеці. Урачысты парад фантазіі, калі малеча гуляла на плошчы ў адвечныя гульні з мячом і самалётамі, з караблямі і лялькамі, парушылі Баба Яга і Ліха са сваёй «чорнай» світай.

Як водар сасновых бароў валодае прыцягальнай сілай, так і шчырае свята вабіла да сябе непадробнасцю пачуцця і даверам. Азорвала нівы творчасці ахоўніца натхнення і любові Мілавіца, завівала руцвяны вянок абрадаў Паўлінка, наладжваў конкурсы гарманістаў, скрыпачоў, цымбалістак Сымон-музыка, надзяляла жыватворным агнём служэння людзям Гарывада — гераіня палескіх паданняў.

Гула, гаманіла плошча, спавітая старажытнымі валамі, не стамляліся людзі ад песень-танцаў. Нітавалася мінулае і сучаснасць. Урачыста ішлі ў будучыню сейбіты святла і высокай духоўнасці, сейбіты нязгасных народных традыцый. Працавала, як у даўнія часы, прадмесце рамёстваў...

Сталі традыцыйнымі на Міншчыне шматгалосыя святы народнай творчасці. Кожны год запальвае чашу творчасці Стаўбцоўскае свята «Красуй, Беларусь!», кожны год плыве ў далеч сімвалічны вянок дружбы і міру па Нёмане. І сёлета два дні жыло, дыхала водарам лета свята талентаў народных.

Антаніна ХАТЭНКА.

ЧЫТАЮЧЫ ПОШТУ

БЯЛІНСКІ ТУТ НІ ПРЫ ЧЫМ

Артыкул С. Букчына, надрукаваны на пачатку чэрвеня ў «Литературной газете» пад з'едлівай назвай «Причуды местных амбиций», не прайшоў незаўважаным нашымі чытачамі. Свае водгукі прыслалі пісьменнікі, настаўнікі, рабочыя... Прыйшло нават пісьмо з Таганрога за подпісам краязнаўцы А. Дымава. Чытачы абураюцца, выказваюць здзіўленне і збянтэжанасць, звяртаюцца праз газету да С. Букчына з пытаннямі і спрачаюцца з ім, просяць «ЛіМ» выказаць свае адносіны да артыкула. Пісьменнік Павел Прудзнікаў называе артыкул «шкодным», настаўнік Малькавіцкай СШ Ганцавіцкага раёна М. Купрэеў — «незразумелым выступленнем».

«Тон — душа размовы», гаворыць французская прымаўка. І аўтары водгукаў звяртаюць перадусім увагу на безапеляцыйны, амбітны, зняважлівы ў дачыненні да ўсёй пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі тон артыкула «Причуды местных амбиций». «Па-руску кажучы, — піша жыхар вёскі Сялец Бярозаўскага раёна М. Арахоўскі, — артыкул Букчына «дышит злобой». Пад маркай галоснасці тут спрабуюць сяго-таго ашальмаваць... Будзем спадзявацца, што раней ці пазней возьме ўсё ж сваё сапраўдная, а не такая галоснасць». «Як чытач, — цытуем ліст паэта Пятра Прыходзькі, — я і па сённяшні дзень знаходжуся пад уражаннем ад той крыўды, той знявагі, якую нанёс С. Букчын сваім таварышам па пяру — беларускім пісьменнікам, назваўшы ўсіх нас «правінцыяльнай глухаманню». Высакамерны, абразлівы тон я асабліва адчуў у тых мясцінах артыкула, дзе С. Букчын знарок падкрэслівае нашу «правінцыйнасць», дае знаць, што нам не пад сілу вырашаць хвалюючыя нас пытанні». «Настаўнікі рускай мовы і літаратуры ведалі і паважалі С. Букчына як аўтара кнігі «Народ издревле нам родной», кніга ім добра дапамагае, — пачынае свой ліст М. Купрэеў. — Але калі я прачытаў у «Литературной газете» артыкул С. Букчына «Причуды местных амбиций», то захацелася спытацца ў аўтара: «Таварыш Букчын! Мне незразумела, што з'яўляецца прычынай такога зласлівага прабачце — нават пыхлівага тону Вашых радкоў? Вонкава Вы як быццам змагаецеся за праўду, але між радкоў я адчуў нейкую незразумелую для мяне непавагу да таго асяроддзя, да той пісьменніцкай арганізацыі, якія, трэба думаць, дапамаглі Вам стаць літаратарам, спрыялі Вам у выданні кніг. Незразумелая мне, у прыватнасці, тая нянавісць, з якой Вы пішаце пра нашага вядомага драматурга і публіцыста А. Петрашкевіча. Хіба можна простую чалавечую слабасць (маю на ўвазе гісторыю з візіткай) узводзіць у ранг сур'ёзнай правіннасці, выстаўляць на старонках усесаюзнай газеты ў карыкатурна-знішчальным тоне? Да таго ж «Комсомолка» ўжо пісала пра гэтую самую візітку. Здавалася б — гэтага больш чым дастаткова. Дык не, Вы яшчэ раз б'яце аднаго і таго ж за адно і тое ж. Мне, як педагогу, гэта незразумела. І гэта, вядома, не ў правілах тых вялікіх людзей, пра якіх Вы пішаце ў сваіх кнігах. Ваш яўна недазволены прыём адносіцца хутчэй за ўсё менавіта да тых «причуд местных амбиций», супраць якіх Вы так змагаецеся».

«Некалькі пытанняў аўтару артыкула ў «Литгазете» С. Букчыну і супрацоўнікам газеты «Літаратура і мастацтва» — так назваў свой ліст у рэдакцыю рабочы механічнага завода імя Вавілава А. Папкоўскі. У нас ён пытаецца, якія кнігі напісаў С. Букчын, хто ён, пісьменнік ці крытык. «Другое пытанне, — працягвае аўтар. — Адкуль С. Букчын узяў такіх пісьменнікаў, як Місюк, Бабровіч? Я нешта не ведаю такіх беларускіх пісьменнікаў. Гэта, відаць, зусім маладыя аўтары, якія яшчэ не ўмеюць пісаць? Дык чаго ўжо тады так нападаць на іх? І кідацца такімі абвінавачваннямі ў адрас газеты «Літаратура і мастацтва»? «Бедныя беларускія пісьменнікі і рэдактары, — зазначае іранічна далей А. Папкоўскі. — За што ні возьмуцца, што ні пачнуць, усё ў іх не так, як у культурных людзей. І візітную картку не ўмеюць паднесці як след, і эстэтычнага слыху не маюць, і дыскусію не ў стане весці: абавязкова звернуць, па сваёй правінцыяльнай абмежаванасці, на «путь вульгарных упрощений». Як жа, хачу спытацца, сярод такой цемнаты, у такой глухой правінцыі нараджаюцца такія высокаадукаваныя крытыкі, як Сямён Букчын?» (Назіральны і дасціпны пайшоў чытач, нічога не скажаш, — **«ЛіМ»**).

Адзначаюць аўтары водгукаў і такія бакі артыкула С. Букчына, як слабасць аргументацыі, уяўная смеласць, прадузята-дылетанцкі погляд на важныя рэчы. «С. Букчын гучна абвяшчае вайну «шэрасці», — піша М. Купрэеў, — справа высакародная. Але з кім канкрэтна ён ваюе? З Бабровічам і Місюком, якія не толькі невядомыя шырокаму рэспубліканскаму, тым больш усесаюзнаму чытачу, але, здаецца, не з'яўляюцца прафесійнымі літаратарамі. Ваюе, словам, з бяззбройнымі». «Прыкрае пачуццё пакінуў у мяне артыкул Сямёна Букчына «Причуды местных амбиций», — піша паэт і празаік, супрацоўнік Рагачоўскай раённай газеты Мікола Янчанка. — Змешчаны ён пад рубрыкай «У пісьменніцкіх арганізацыях. Праблемы абнаўлення». Рубрыка абавязвала да адказнасці, вымагала аб'ектыўна і аргументавана ацаніць становішча спраў у беларускіх літаратараў, у тым ліку, вядома, і іх няўдачы. У артыкуле ж С. Букчына яўна бачны толькі пошук адмоўных «жучкоў». Прытым звяртае на сябе ўвагу тое, што ён карыстаецца не характэрнымі, а выпадковымі прыкладамі, спасылаецца вунь на аповесць М. Місюка «Начны выклік». І яшчэ. У пачатку артыкула С. Букчын бядуе аб нізкім узроўні дыскусійнасці, а некалькімі абзацамі ніжэй абураецца тым, што рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» змясціла пісьмо М. Місюка і каментарый да яго. Адным словам, прымай крытыку як належнае, а сам ні гуку. Якая ж тут дыскусійнасць?» І далей: «Калі ж гаварыць аб праблемах абнаўлення, то, як гэта ні дзіўна, аўтар артыкула спрабуе кінуць цень якраз на тых, хто гэтыя праблемы бачыць, хто іх ставіць. Відаць, па той простай прычыне, што сам ён іх не бачыць, або глядзіць на іх праз пальцы, ці, галоўнае, не адчувае набалелых праблем сэрцам». З гэтымі словамі пераклікаюцца і заключныя радкі пісьма М. Купрэева: «Цяпер адносна інсінуацый С. Букчына з нагоды моўнай сітуацыі. Якая яна «натуральная», мы, настаўнікі (і гарадскія, і сельскія), лепш ведаем, чым С. Букчын, і не раілі б яму гаварыць пра тое, чаго ён не ведае, ці, яшчэ горш, проста не адчувае».

Засталося дадаць яшчэ некалькі слоў ад рэдакцыі — не дзеля «гонару мундзіра», а дзеля ісціны, дзеля той самай праўды, пра якую так клапоціцца С. Букчын. Ён адрасуе «ЛіМу» грозную філіпіку: «Зреют гневные вопросы о принципиальности, об элементарном эстетическом слухе...» І робіць гэта пасля таго, як на поўным сур'ёзе паказаў чытачам «Литгазеты», што М. Місюк — не Горкі і нават — не Місько. Але ж тое самае было ўжо сказана-паказана на старонках «Літаратуры і мастацтва». І нават двойчы — адзін раз у рэцэнзіі В. Дубінкі, другі раз у рэдакцыйным каментарыі (народ у такім выпадку кажа: знайшоў сякеру пад лавай). Праўда, каментарый наш С. Букчын, спадзеючыся, відаць, на дрэнную памяць ці на абыякавасць чытача, падае ў перакручаным на свой лад выглядзе. «А что же редакция «Літаратуры і мастацтва»? — са штучным абурэннем ускліквае ён. — Она дала свой комментарий к письму Н. Мисюка, объявив, что несмотря на «серьезные недостатки» повести, «обиду автора приходится признать правомерной». Сэнс каментарыя скажоны. Маючы на ўвазе той факт, што ў рэцэнзіі на аповесць, па віне аўтара і рэдакцыі, дапушчаны недакладнасці і неэтычныя моманты, газета пісала: «Друкуючы ліст М. С. Місюка... мы тым самым прызнаём, што яго аповесць «Начны выклік» была аіцэнена не лепшым чынам. Аповесць напісана няроўна, мае сур'ёзныя недахопы, месцамі гучыць на ўзроўні абыватальскіх разважанняў. Але ў той час яна давала падставу для больш сур'ёзнага, у больш разважлівым, ва ўсякім выпадку не абразлівым для аўтара тоне, разгляду. **У гэтым сэнсе** крыўду аўтара аповесці даводзіцца прызнаць слушнай». Вось і ўсё. Гутарка, як бачым, ідзе пра тое, што крытыка павінна быць карэктнай, доказнай, неабразлівай, без асабістасцей. І дададзім — без перакручванняў, без падтасовак, якімі яўна не грэбуе С. Букчын у сваім артыкуле. Н. Гілевіч на нядаўнім пленуме праўлення СП БССР мусіў паскардзіцца, што С. Букчын адно яго выказванне «неяк хітра прывязаў да сваёй думкі». Тое ж самае, як бачым, ён робіць і з лімаўскімі публікацыямі. Каб неяк падмацаваць свае «гневные вопросы», ён — ужо другі прыклад — прыпісвае «ЛіМу» станоўчую ацэнку злачынаснай п'есы В. Бабровіча «Правілы гонару». Але ж такой ацэнкі на старонках штотыднёвіка проста няма. Наадварот, ёсць недвухсэнсоўна адмоўная ацэнка — і п'есы, і пастаноўкі па ёй. Каб у гэтым пераканацца, дастаткова разгарнуць нумар «ЛіМа» за 2 мая 1986 г. («Спробу асэнсаваць з пазіцый сённяшняга дня эпоху дзекабрысцкага паўстання зрабіў рэжысёр М. Кавальчык у спектаклі «Правілы гонару». На жаль, спроба атрымалася няўдалай... Карацей, «гістарычную драму» «Правілы гонару» назваць п'есай цяжка...» і г. д. і да т. п.). Выкладзеную тут пазіцыю «ЛіМ» пацвердзіў потым і яшчэ раз у нумары за 5 снежня 1986 года. Што ж датычыць фразы, за якую зларадна ўчапіўся С. Букчын (наконт «далікатнай сітуацыі драматургічнага дэбюту»), то яна толькі элементарна нагадвае аб тым, як спектакль быў ацэнены на тэатральным фестывалі. Ні больш ні менш.

Наогул, трэба сказаць, С. Букчын выяўляе ў сваім артыкуле дзіўную для сваёй прафесіі — вучонага-бібліёграфа — здольнасць абыходзіцца з фактамі, з чужым тэкстам, падтасоўваць і прыстасоўваць іх «да сваёй думкі». Звычайны, а ў пэўным сэнсе нават неабходны, непазбежны ў сённяшнім друку загаловак «Што мяне непакоіць» ён чамусьці абвяшчае іранічна «эпічным». Вытрыманы ў спакойным, карэктным тоне ліст у рэдакцыю са спакойным, нейтральным загалоўкам ён называе не інакш, як гнеўнай «отповедью автора критику под характерным названием «Критика бывает разная». А хіба гэта не так? — маем права спытаць мы ў С. Букчына. У перакручаным, скажоным выглядзе перадае С. Букчын палажэнні артыкула Т. Шамякінай, змешчанага ў «ЛіМе».

Як гэта разумець? Як разглядаць гэта? Як неабходную ўмову барацьбы з правінцыялізмам, жупелам якога размахвае С. Букчын? Хіба што.

Для большай пераканаўчасці С. Букчын патурбаваў цені Салтыкова-Шчадрына (у сувязі з галоснасцю) і Бялінскага (у сувязі з неабходнасцю лячыць хваробы «грозным словам праўды»). І тым не менш... Думаецца, правільна зазначыў адзін з аўтараў пісьмаў, пра якія гаварылася вышэй: «Вельмі шкада, што «Литературная газета» даверылася С. Букчыну. Ён увёў газету ў зман».

АДДЗЕЛ ПІСЬМАЎ «ЛіМа».

З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ МЭТАЗГОДНАСЦІ

Нататкі публіцыста з нагоды аднаго абмеркавання

КАБ ПАСТАВІЦЬ у рад самыя папулярныя цяпер словы, дык слова экалогія заняло б тут, бадай, адно з першых месц. Нават цяжка паверыць, што ў наш паўсядзённы ўжытак яно ўвайшло, фактычна, нядаўна (гэта можна праверыць па тлумачальных слоўніках).

Чым жа тлумачыцца сённяшні выбух незвычайнай цікавасці людзей да экалогіі? Відаць, тым, што мы пакрысе пачынаем разумець: калі гіне нават малы гаёк, мялее рачулка, вецер заносіць пяском і пылам яшчэ ўчора ўрадлівае поле, — збядняецца жыццё і кожнага з нас. Чалавек пачаў глядзець далей свайго носа, ён захацеў усвядоміць сваё месца ў гэтым вялізным, у многім яшчэ не пазнаным свеце, які завецца прыродай. Месца гэтага мы яшчэ, бадай, не знайшлі. Мо таму, што сярод нас шмат спажыўцоў, што ніяк не можам адкінуць прэч сфармуляваную калісь класікам «ісціну», што наш абавязак — не чакаць дарункаў ад прыроды, а ўзяць іх.

Узялі. Колькі — не пералічыць. І ўсё быццам у імя чалавека, дзеля чалавека. За гэтыя высокія словы хаваліся, як за браню, хто хацеў. Ды, нарэшце, надышоў іншы час. Хто гэта калі чуў, каб за «прыроду» пазбаўлялі партфеля намесніка саюзнага міністра, а самому міністру аб'яўлялі суровае спагнанне? Мо я памыляюся, але мне здаецца, што тыя «намы», калі іх знімалі з пасад, вельмі здзіўляліся такой неспадзяванцы. Прызвычаіліся, што знімаюць «стружку» за невыкананне плана, за зрыў пуску аб'екта, высокі сабекошт прадукцыі і г. д., але за прыроду? За такое глупства? За нейкі Байкал ці Ладагу? Што ім, скажыце, зробіцца?

Ведамасны падыход. З яго галоўным дэвізам: мэта апраўдвае сродкі. Пра гэты падыход гаварылася і на нядаўнім сумесным пашыраным пасяджэнні Навуковых саветаў Акадэміі навук рэспублікі. А было тое пасяджэнне прысвечана, як пісалася ў запрашальным білеце, абмеркаванню калектыўнага пісьма беларускіх літаратараў і вучоных у газету «Известия» і Камісію па прыродным асяроддзі Прэзідыума Савета Міністраў СССР па некаторых праблемах экалагічнай абстаноўкі ў рэспубліцы.

Перадаць увесь тэкст гэтага вялікага пісьма (яно было зачытана на пасяджэнні віцэ-прэзідэнтам АН БССР І. Ліштванам) не дазваляюць вузкія рамкі газетных нататак. Таму раскажам толькі пра яго асноўную думку: экалагічная сітуацыя на Беларусі пагаршаецца. У якасці асноўных прыкладаў аўтары пісьма назвалі ажыццяўленне праекта будаўніцтва Даўгаўпілскай ГЭС, што самым негатыўным чынам адаб'ецца на прыродзе некаторых паўночных раёнаў рэспублікі, сацыяльным і эканамічным становішчы мясцовага насельніцтва — трэба будзе перасяліць тысячы людзей, пад ваду пойдуць сотні жылых і грамадскіх будынкаў, гістарычныя і археалагічныя помнікі і г. д. Нельга гэтага дапусціць, пісалі аўтары ліста, асабліва памятаючы катастрофу, якая абрынулася на паўднёвыя раёны Беларусі ў сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС.

Пісьмо было абгрунтаванае, доказнае, падмацаванае глыбокім экалагічным і эканамічным аналізам. У ім была дадзена крытычная ацэнка і практычнай меліярацыі, якая праводзіцца на Палессі — унікальным прыродным краі Беларусі, у прыватнасці, праекту абвалавання, які пагражае, на думку аўтараў пісьма, існаванню самой ракі, экалагічнай раўнавазе рэгіёна.

Што хацелася б сказаць у сувязі з гэтым? «ЛіМ» ужо неаднойчы пісаў пра негатыўныя вынікі будаўніцтва Даўгапілскай ГЭС і вадасховішча пры ёй, «хвост» якога дацягнецца да самага Полацка —за дзвесце з гакам кіламетраў ад мяжы з Латвіяй. З самага пачатку пазіцыя газеты была адназначнай—будаўніцтва электрастанцыі ва ўсіх адносінах прынясе нам больш шкоды, чым карысці. Пазіцыю гэтую цалкам падзяляюць аўтары шматлікіх лістоў у рэдакцыю.

Намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Ю. М. Хусаінаў выказаў на пасяджэнні думку, што з'яўленне калектыўнага пісьма — вынік адсутнасці належнай інфармацыі аб сапраўдным становішчы спраў з будаўніцтвам Даўгаўпілскай ГЭС, прыхільнікам якога не з'яўляецца і ўрад рэспублікі.

Так, сапраўды, інфармацыі такой бракавала. Ды толькі, хто ж у гэтым вінаваты? Час цяпер такі, што вымагае гаварыць праўду да канца. А праўда — у наступным факце — Дзяржплан рэспублікі, а менавіта яму было даручана курыраваць падрыхтоўку чатырох раёнаў Віцебшчыны да затаплення (там, дзе павінна была прайсці траса будучага вадасховішча), у сваім адказе «ЛіМу» паведаміў, што праект Даўгапілскай ГЭС іх задавальняе і нічога рэспубліцы ад яго ажыццяўлення не пагражае.

Пячатка маўчання ў гэтым з самага пачатку лягла на вусны нашых вучоных-эколагаў і эканамістаў. Некаторыя з іх нават выязджалі ў Рыгу, каб параіцца са сваімі латышскімі калегамі наконт абставін, звязаных з будаўніцтвам станцыі. Тут, на пасяджэнні, высветлілася, што Навуковы савет па праблемах біясферы АН БССР з самага пачатку негатыўна ацэньваў вартасці праекта будаўніцтва ГЭС. Выдатна! Але ж чаму дасюль паважаныя вучоныя ігнаравалі законную цікавасць грамадскасці рэспублікі да гэтай праблемы, чаму абмяркоўвалі яе ў самым вузкім коле за зачыненымі дзвярамі?

Ці не даюць сябе адчуваць тут рэцыдывы старой «спрэчкі» «фізікаў і лірыкаў» — хто лепшы і разумнейшы, хто першы сказаў «э»? Некалі гэта выглядала смешна, сёння трывожыць, бо вельмі шкодзіць агульнай справе. Мне неаднойчы даводзілася чуць з вуснаў людзей, якія прысвяцілі сябе дакладным навукам, вельмі скептычныя, а часам, і проста варожыя водгукі аб пісьменніках, дзеячах культуры, якія ўзвышаюць свой голас у абарону прыроды, выказваюць на старонках прэсы свае меркаванні аб «спецыяльных» прадметах. «Хай лепш пішуць свае раманы, або выступаюць на сцэне, — даводзіць «вузкі» спецыяліст, — а не лезуць у нашыя справы, самі разбяромся, эмоцыі нам толькі перашкаджаюць...»

Думалася мне пра гэта і тады, калі слухаў некаторыя выступленні ў прасторнай канферэнц-зале акадэміі. Сёй-той з прамоўцаў не мог утрымацца ад крытыкі пісьма літаратараў і вучоных. Асабліва таго месца ў ім, дзе гаварылася пра меліярацыю. Рабілася спроба прадставіць пісьменнікаў, як прынцыповых яе праціўнікаў.

Ды на самай справе пафас пісьма быў слушны, пытанні, узнятыя ў ім, грунтаваліся на рэальнай глебе. Ну, вядома ж, не супраць меліярацыі ўзнялі свой голас пісьменнікі, узнялі супраць скажэнняў меліярацыйнай палітыкі на месцах, калі адбывалася не паляпшэнне зямлі, а, наадварот, яе рэзкае пагоршанне, узнялі свой голас супраць ведамаснага падыходу ў гэтай архіважнай справе. Пра гэта, між іншым, вельмі слушна гаварыла ў сваім выступленні літаратуразнаўца Т. Чабан.

Не будзем дыпламатнічаць— тут, на абмеркаванні пісьма, выявілася, што большасць тытулаваных вучоных—яны займаюць і адпаведна высокія пасады — была задаволена тым, як па іх распрацоўках, пад іх кіраўніцтвам праводзіцца меліярацыя на Палессі. Між тым, нямала прамоўцаў, хай і ў пачцівых танах, гаварылі пра сур'ёзныя пралікі ў планаванні і правядзенні меліярацыйных работ, выкарыстанні асушаных тарфянікаў. Вельмі каштоўным у гэтым сэнсе было выступленне практыкаў, што прыехалі з Палесся. І першы сакратар Пінскага райкома партыі Д. Руцкі, і галоўны агранам калгаса «Перамога» Жыткавіцкага раёна Н. Мельнікава, старшыня калгаса «40 гадоў Кастрычніка» Столінскага раёна І. Янкоўскі, надаўшы належнае меліярацыі, адзначалі, што перавагі асушаных тарфянікаў вельмі хутка можна згубіць, калі на іх няправільна гаспадарыць.

Я шмат чуў, што тут ёсць праблемы, народжаныя, менавіта, ведамасным падыходам. Калгасам, саўгасам, якія ўтвораны на асушаных тарфяніках, нярэдка «зверху» даводзяць планы па вытворчасці бульбы, гародніны, іншых прапашных культур, што для такіх глеб проціпаказана. Праз якія трычатыры гады пасля такога гаспадарання на гэтых палях плугі пачынаюць выворваць на паверхню жоўты пясочак. Шмат разоў перагорнуты, перацерты тарфянік падвержаны ветравой эрозіі — хто не бачыў, як нават не вельмі моцны вецер узнімае над тарфяным полем хмары пылу.

Многія недахопы ў «абжыванні» асушаных зямель — вынік заганнай сістэмы фінансавання меліярацыі. Пра гэта мне давёў адзін з вучоных, што сядзеў побач. Па некаторых рэпліках, якія ён адпускаў па адрасе асобных выступленняў, адчувалася, што чалавек у сваёй стыхіі, ведае праблемы не па чутках, і таму я ўважліва яго слухаў. «Я вам зараз адкрыю сакрэт таго, чаму меліяратары, не зважаючы ні на што, вымушаны фарсіраваць меліярацыйныя работы далёка не заўсёды звяртаючы ўвагу на іх якасць. Што за сакрэт? Усё вельмі проста — грошы і не малыя — сотні мільёнаў рублёў дзе на меліярацыю саюзнае міністэрства. Дае з умовай выкарыстаць сродкі строга па прызначэнні, згодна з абумоўленым пералікам работ. Вось і гоняць меліяратары план, а ўсё астатняе— будаўніцтва дарог, пасадка лясоў, залужэнне, узвядзенне селішчаў на асушаных землях— не іх клопат, на гэта ім грошай не ідзе».

Многія прамоўцы гаварылі аб праблемах абвалавання Прыпяці. На думку Віктара Казько, абвалаванне ракі не толькі парушыць экалагічную раўнавагу, што не зможа не адбіцца адмоўна на мясцовай флоры і фауне, а і нанясе непапраўную шкоду жыццёваму ўкладу мясцовых жыхароў, культуры, якая сваімі каранямі адыходзіць у сівую даўніну.

У канферэнц-зале АН у яго адразу з'явілася нямала апанентаў. Асабліва сярод вучоных, якія займаюцца воднымі праблемамі, асушэннем забалочаных зямель. Сярод іх і такі масціты, як акадэмік УАСГНІЛ, акадэмік-сакратар яе Заходняга аддзялення А. Мурашка. Адказваючы крытыкам, ён, між іншым, сказаў, што наша краіна па колькасці меліяраваных зямель адстае ад многіх заходніх дзяржаў, што тэмпы меліярацыі трэба ў нас тэрмінова нарошчваць. Ён папракнуў пісьменнікаў, што ім, маўляў, чамусьці хочацца, каб палешукі заставаліся жыць на балотах.

Жыць на балоце, вядома, не соладка, але і перасяленне людзей, якія «прыкіпелі» да зямлі, дзе жылі і пахаваны іх продкі, таксама няпростая справа. І было прыкра слухаць некаторых прамоўцаў, якія з лёгкасцю незвычайнай вырашалі лёс панадпрыпяцкіх вёсак і вёсачак. Таму, відаць, і ўзнікла пытанне да аднаго з дакладчыкаў — дырэктара «Белгіправадгаса» Л. Філіпава, ці праводзілася апытанне жыхароў вёсак, якіх будуць перасяляць на «сухое» месца? Па тым, як дакладчык не вельмі ўпэўнена адказаў на гэтае пытанне, можна было зразумець, што тое апытанне калі і рабілася, то рабілася фармальна. Па такім жа метадзе, што і на поўначы Віцебшчыны, у зоне ўплыву Даўгаўпілскай ГЭС. Жыхары там, — у «ЛіМе» пра гэта пісалася, — скардзіліся на невядомасць, на тое, што не ведаюць, куды і як будуць іх перасяляць, якая ім будзе выплачана кампенсацыя і г. д.

Так, няма сёння «чыстай» экалогіі, цесна перапляліся яе праблемы з праблемамі сацыяльнымі, эканамічнымі, жыццём і лёсам тысяч людзей.

Яшчэ да пачатку пасяджэння можна было ўбачыць, як ля схемы абвалавання Прыпяці, вывешанай недалёка ад трыбуны, тоўпяцца людзі, нешта горача абмяркоўваючы. Што і казаць, праект узвядзення ўздоўж Прыпяці дамбаў даўжынёй у 1160 кіламетраў вельмі няпросты і выклікае нямала пытанняў. Чаму іх узводзяць? Па словах дакладчыка, штогод на Палессі ў час паводак затапляецца больш як 400 тысяч гектараў зямель, чым наносіцца шкода на 30 з нечым мільёнаў рублёў. Пасля абвалавання пагроза затаплення, — зазначаў дакладчык, — будзе зведзена да нуля. Л. Філіпаў расказаў і пра тое, што ў распрацоўцы ТЭА — тэхніка-эканамічнага абгрунтавання абвалавання ракі—прыняло ўдзел аж 17 навукова-даследчых інстытутаў, дзе было зроблена прагназіраванне ўплыву спалучэння рака — дамба на прыроднае асяроддзе, сельскагаспадарчую вытворчасць і г. д.

Здавалася б, усё ясна. Ды доўга не давалі дакладчыку пайсці з трыбуны, абрынуўшы на яго дзесяткі пытанняў. Прысутных цікавіла, дзе і колькі трэба ўзяць зямлі на тыя дамбы, ці не атрымаецца, што ў час паводак у раку трапяць тысячы тон грунту, забрудзіўшы яе рэчышча, які лёс археалагічных помнікаў, што звычайна знаходзяцца на высокіх месцах, адкуль акурат і будуць браць зямлю на дамбы, ці рабіліся разлікі, як абвалаванне ракі паўплывае на мікраклімат, на эрозію глебы і г. д.

Большасць падобных пытанняў выклікана, па думцы многіх, недасканаласцю самога праекта, дзе шмат яшчэ «белых плям». Акадэмік Р. Гарэцкі, напрыклад, папярэдзіў, што могуць паўтарыцца мінулыя памылкі, калі пасля меліярацыі вельмі змяняліся глебы. Трэба ўлічваць, — сказаў ён, — што глебы тут пясчаныя, водная эрозія вымывае з іх арганічныя рэчывы, рэзка змяншаецца колькасць гумусу, мікраэлементаў, асабліва кобальту і медзі, павялічваецца кіслотнасць. Глебу трэба берагчы, як зрэнку вока, нанава яе стварыць немагчыма. Гэта бясцэнны дар прыроды.

Доктар навук В. Шэбека выказала слушную думку аб тым, што да складання праектаў па меліярацыі і абвалавання Прыпяці трэба было прыцягнуць спецыялістаў іншых профіляў, напрыклад, біёлагаў, дэндролагаў, гісторыкаў і г. д. Невядома,—сказала яна, — як абвалаванне ракі адаб'ецца на стане Палескага запаведніка.

Ніхто не ставіць пад сумненне саму неабходнасць меліярацыі, г. зн. паляпшэнне зямлі, сказаў навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР З. Пазняк, — але мы, не спецыялісты ў гэтай галіне, падабаецца гэта каму ці не падабаецца, маем права ставіць пытанні спецыялістам-меліяратарам — чаму вы так асушаеце, што зніклі з твару зямлі нашы малыя рэкі, зніклі многія помнікі археалогіі, гісторыі і культуры?

На пасяджэнні прыводзіўся прыклад, калі ва ўрочышчы Седра, што ў Жыткавіцкім раёне, пасля асушэння знікла рачулка, якая тут вякамі цякла. Добра, што прыехаў на пасяджэнне і мясцовы меліяратар. Яго паднялі з месца, але нічога ён растлумачыць не змог, нешта блытана расказваў пра работы, якія праводзіліся «па навуцы» і ў выніку якіх, маўляў, раптам тая канава знікла. У яго перапыталі: канава ці рачулка? «Ну, рачулка, — адказаў ён. — Якая розніца? Усё роўна маленькая».

Пра тое, якую шкоду наносіць водная эрозія глебе, гаварыў навуковы супрацоўнік Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР В. Пашкевіч. У сваім выступленні ён засяродзіў увагу прысутных і на росце забруджвання прамысловымі і бытавымі адходамі ракі. Пасля знішчэння пойменных тарфянікаў —выдатных прыродных ачышчальнікаў увесь бруд пайшоў у Прыпяць.

Адзначыў недасканаласць метадаў абвалавання ракі доктар біялагічных навук Л. Смаляк: «Ці не ранавата мы за гэта ўзяліся?» — спытаў ён. Вучоны заклікаў надаць больш увагі пытанням сацыяльнай і культурнай сферы на меліяраваных землях.

Акадэмік С. Скарапанаў гаварыў пра тое, што «экалогія— альфа і амега навукі, мы пра гэта забываемся і таму шкодзім матухне-прыродзе».

Факты, якія прывёў у сваім выступленні галоўны інжынер праекта Беларускага навукова-даследчага інстытута горадабудаўніцтва М. Кучук, нібы праілюстравалі словы акадэміка. Вось толькі два прыклады: пры пракладцы Вілейскай воднай сістэмы было затоплена 17 гектараў сасновага бору, які згніў на корані, акрамя гэтага затоплена 93 квадратныя кіламетры зямель. Або вось: Наваполацкія хімічныя прадпрыемствы атруцілі наваколле ў радыусе 22 кіламетраў.

Думаю, што такія факты могуць мець месца яшчэ і таму, што ў нас няма сапраўднай, як кажуць, экалагічнай галоснасці. Ведамства свае промахі не афішыруе...

На пасяджэнні з дакладамі выступілі таксама дырэктар «Саюздзіпрамеліявадгаса» Л. Шкабара і дырэктар «Галоўпалесвадбуда» І. Цітоў, якія расказалі, як праводзяцца асушальныя работы на Палессі.

Вынікі пасяджэння (а ішло яно амаль сем гадзін) падсумаваў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Ю. М. Хусаінаў.

Была прынята пастанова, у якой, у прыватнасці, адзначана немэтазгоднасць будаўніцтва Даўгаўпілскай ГЭС як не адпавядаючай экалагічным і сацыяльна-эканамічным патрабаванням. Што датычыць лёсу Прыпяці, дык у пастанове запісана, што тэхніка-эканамічнае абвалаванне ракі з мэтай інжынернай аховы зямель ад затаплення адпавядае новым навуковым распрацоўкам і практычнаму вопыту ў гэтай галіне. Падтрымана таксама ў пастанове прапанова групы вучоных АН БССР, пісьменнікаў, грамадскасці аб стварэнні пры Акадэміі навук БССР Інстытута прыроды.

Міхась ЗАМСКІ.

МУЗЫКА

ПУЦЯВОДНАЯ ЗОРКА—ПЕСНЯ

Выступае У. Яскевіч.

Выканаўчае мастацтва заслужанага артыста БССР, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, саліста Ансамбля песні і танца БВА Уладзіміра Яскевіча папулярнае не толькі ў Беларусі, а і ва ўсіх, каму дарагая савецкая патрыятычная песня.

Мы знаёмы ўжо больш за дваццаць гадоў. На маіх вачах ішло станаўленне і прафесійнае развіццё гэтага адметнага спевака. Я пачынаў педагагічную працу ў Гомельскім музпедвучылішчы, Уладзімір Яскевіч займаўся ў мяне харавым дырыжыраваннем... А потым сустрэліся за мяжой, дзе працавалі разам: я—хормайстрам, а ён—салістам у адным з ансамбляў песні і танца Групы Савецкіх Войск у Германіі. З таго часу захапляюся ягоным выканаўчым майстэрствам, яго пастаянным прафесійным ростам і сілай уздзеяння на слухача.

— Кольні сябе помню, люблю спяваць і слухаць савецкую песню,—расказвае Уладзімір. — Удзельнічаў ва ўсіх канцэртах школы і калгаснай самадзейнасці. Аднавяскоўцы гаварылі мне: «Артыстам будзеш!» Я спяваў свае любімыя «Арляня», «Школьны вальс», «Зорку Венеру», песні ваенных гадоў. Настаўнікі ў школе захвочвалі, падбадзёрвалі... Аднойчы летам прачытаў у газеце аб'яву, што Беларуская дзяржаўная кансерваторыя аб'яўляе прыём на падрыхтоўчае аддзяленне па спецыяльнасці «спевы». Маці дала мне сала, хлеба, сырых яек і сказала: «Вып'еш, сынок, як у тым кінафільме «Веселые ребята», каб лепш спявалася». Прыехаў я ў Мінск, пабачыў аб'яву пра набор на падрыхтоўчае аддзяленне, але з семнаццаці з паловай гадоў, а мне не было і семнаццаці. Не заходзячы ў кансерваторыю, паехаў у Гомель, у музычнае вучылішча, але і там прыёмныя экзамены ўжо скончыліся. Але дамоў я не вярнуўся, пакіраваў у Гомельскае музпедвучылішча, за адзін дзень у мяне прынялі ўсе экзамены і залічылі на першы курс, дзе харавым дырыжыраваннем я займаўся ў вас, а пастаноўкай голасу ў М. Маісеенкі—цяпер саліста нашага тэатра оперы і балета.

— Але Гомельскае музпедвучылішча не рыхтуе вакалістаў, а вы сталі прафесійным спеваком...

— Праз год перавёўся на вакальнае аддзяленне ў Гомельскае музычнае вучылішча імя Н. Сакалоўскага. На гэтым жа курсе займаліся і Яраслаў Пятроў—цяпер народны артыст БССР, Віктар Рабчанка—саліст Гомельскай абласной філармоніі. Гэта былі гады захопленага спявання, мы памагалі адзін аднаму і радаваліся поспехам. Ведаеце, я вясковец, і сумленнае стаўленне да працы ў мяне ў крыві, а калі праца любімая, яе дрэнна рабіць проста немагчыма!

— Так, я помню той час, калі вучылішча ўздрыгвала ад гукаў, бо Пятроў хацеў «перапець» Яскевіча, але пазней вы, здаецца, з'ехалі некуды?

— З трэцяга курса я пайшоў служыць у войска і трапіў у армейскі ансамбль песні і танца Групы Савецкіх Войск у Германіі. Мой дэбют быў у першы ж дзень службы: захварэў саліст, і мне прапанавалі праспяваць у канцэрце «Песню пра Леніна» А. Холмінава.

Вядома, вельмі хваляваўся.

— З таго дня радавы салдат становіцца вядучым салістам ансамбля? А як вы сталі займацца ў Веймарскай кансерваторыі імя Ф. Ліста?

— У Веймары на сумесным канцэрце ансамбля і кансерваторыі імя Ф. Ліста я праспяваў на нямецкай мове рускую народную песню «Степь да степь кругом» і два творы з рэпертуару Эрнста Буша—«Песню адзінага фронту» і «Калоны Тэльмана» кампазітара Г. Эйслера. Пасля канцэрта загадчык кафедры спеваў кансерваторыі прафесар Ганс Крэмерс прапанаваў кіраўніцтву ансамбля, каб я вучыўся мастацтву спеваў у Веймарскай кансерваторыі на дзённым аддзяленні.

— Цяжка было вучыцца?

— Вядома. Ніхто не вызваляў мяне ад службы ў Савецкай Арміі, ад канцэртаў, а іх было да трыццаці ў месяц, мне даводзілася спяваць па 5—6 песень у праграме, дый яшчэ рэпетыцыі. Акрамя таго, займаўся нямецкай мовай, бо здаваць экзамены па ўсіх прадметах трэба было на нямецкай. Вучоба ў кансерваторыі, якая сумяшчалася з выступленнямі ў канцэртах ансамбля, акадэмічныя канцэрты і іншыя выступленні загартавалі мяне, ды, лічу, што без належнай вакальнай школы такая нагрузка мне была б не па сілах.

— Вы гаворыце пра вакальную школу. А чым, па-вашаму, адрозніваецца нямецкая школа спеваў ад рускай?

— Перш за ўсё падыходам да справы. У нас у кансерваторыі вучаць, як мне здаецца, тэорыі мастацтва спеваў, а мне пашанцавала, я адначасова вучыўся спяваць і сваю вучобу правяраў на канцэртах. Мой прафесар літаральна шліфаваў кожны твор, які я выконваў. За пяць гадоў вучобы я праспяваў на нямецкай мове ўсе вакальныя цыклы Шуберта, Шумана, Моцарта, вялізную колькасць рускіх народных песень на нямецкай і рускай мовах. Мой дзяржаўны экзамен складаўся з двух аддзяленняў, дзе выканаў больш за 30 вакальных сачыненняў. Вы ж былі на маім дзяржаўным экзамене, бо самі займаліся ў аспірантуры гэтай жа кансерваторыі і як хормайстар-прафесіянал ведаеце, што без добрай вакальнай школы такой нагрузкі не вытрымаў бы ніводны голас, які б здаровы ад прыроды ён ні быў.

— Якія выступленні ў ГДР вам помняцца?

— Мне лягчэй назваць гарады, дзе я не выступаў... Больш за ўсё запомніліся канцэрты на Берлінскім фестывалі моладзі і студэнтаў у 1973 годзе і асабліва выступленне на трыццацігоддзі вызвалення лагера смерці «Бухенвальд». На тым канцэрце прысутнічалі былыя вязні «Бухенвальда», якія прыехалі з усіх краін свету.

— Помню гэта выступленне: мне давялося дырыжыраваць тады песняй В. Мурадэлі «Бухенвальдскі набат», дзе вы былі салістам.

— Цяжкія, хвалюючыя ўражанні. Калі прагучалі словы: «Люди мира, на минуту встаньте»,—уся зала адразу ўстала. Пабеленыя сівізной людзі плакалі, і на розных мовах спявалася гэта песня—разам з намі. Трэба было бачыць твары былых вязняў, на якіх — рашучасць і стойкасць, сіла і мужнасць. Лічу, што гэта песня актуальная і сёння. Думаю, з гэтага канцэрта самым маім любімым жанрам стала савецкая песня-плакат. У яе прапагандзе бачу свой абавязак як камуніст, грамадзянін і спявак. Задзе я ўжо больш за дзесяць гадоў працую як саліст і вядучы канцэртаў.

У народзе кажуць: «Чалавек нарадзіўся пад шчаслівай зоркай». Гэтай пуцяводнай зоркай для мяне стаў мастацкі кіраўнік ансамбля Л. Муранаў, чыёй дружбай, увагай, патрабавальнасцю і спагадай я шчыра даражу. Яго працаздольнасць, стаўленне да музыкі, высокі прафесіяналізм у спалучэнні з вялікімі чалавечымі вартасцямі — для мяне і стымул, і яркі прыклад. Я радуюся, што поруч са мной працуюць выдатныя людзі, добрыя артысты А. Кузняцоў, Л. Аксёнчыкаў, Б. Кір'янаў. М. Дуднік, Л. Некрашэвіч, Ю. Чарнецкі, П. Алейнік і іншыя. Мне здаецца, сапраўдны артыст заўсёды радуецца поспеху свайго калегі. Гэтую творчую радасць сваіх калег я адчуваю на кожным канцэрце, прыслухоўваюся да іх меркаванняў, за гэта ім шчырае дзякуй. Многім сваім поспехам я абавязаны сям'і. І хоць мая жонка інжынер, думкай яе я вельмі даражу. Яна — як сумленне ва ўсіх маіх справах.

— Уладзімір, а якімі выступленнямі ў ансамблі вы асабліва даражыце?

— Наш ансамбль удзельнічае ва ўсіх святочных канцэртах, выступае ва ўсіх падраздзяленнях Беларускай ваеннай акругі, перад насельніцтвам многіх гарадоў і вёсак Беларусі. Але я ніколі не забуду выступленні ў раёне Чарнобыльскай АЭС і гастролі ў Афганістане. Мы бачылі маладых хлопцаў, савецкіх салдат, якія сумленна выконваюць свой нялёгкі, а часам і небяспечны інтэрнацыянальны абавязак. Мы давалі па некалькі канцэртаў у дзень, не стамляючыся, з натхненнем,— на машынах, на ўзлётнай паласе пад гарачым афганскім сонцам, і ранічкой, і познім вечарам. Мы бачылі, як святлелі твары маладых, часам заўчасна пасівелых савецкіх салдат. Гэта незабыўныя канцэрты.

— А што сказалі б вы маладым спевакам, пачаткоўцам?

— Калі адкінуць забабоны і зразумець, што дамагчыся поспеху ў адзіночку немагчыма, бо спецыфіка нашай работы заключаецца ў найцесным супрацоўніцтве ўсяго калектыву, дык я на першае месца вылучыў бы чалавекалюбства як самую каштоўную якасць. Выходзіць на сцэну і спяваць, раўнадушна пазіраючы ў залу, захапіўшыся толькі сабой і сваім голасам,—немагчыма. Спявак павінен быць сумленны і шчыры ў жыцці і на сцэне. Асабіста я не люблю ў людзях падхалімаж і зайздрасць, бо яны спараджаюць падман, зласлівасць і беспрынцыповасць. Адказнасць і прынцыповасць, дабрата і чуласць, творчае гарэнне, а не самазаспакоенасць, задавальненне дасягнутым павінны быць абавязковымі для кожнага спевака. Тым больш, у наш час, калі краіна становіцца на шлях абнаўлення, трэба пазбаўляцца ад наяўных недахопаў, павярнуцца да людзей тварам, быць уважлівым да іх і прыслухоўвацца да іх думкі. Гэтага патрабуе сённяшні дзень, гэтага патрабуе само жыццё.

Гутарку вёў
Альберт КАШПУР.

НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

СВЕТ МАРЫ І ТВОРЧАСЦІ

Урачыстае шэсце на плошчы.

Юныя тэхнікі спяшаюцца на выстаўку.

Выстаўка станкабудавання.

Свята, на якім я гасцявала, не так даўно ў Барысаве, было незвычайнае. Шчодрае на сустрэчы, знаёмствы, песні, на шчырыя віншаванні і пажаданні, яно ад самага пачатку абяцала спатканне Будучыні з Мінулым. І абяцанне спраўджвалася, бо на тое яно і свята тэхнічнай творчасці, каб стаць днём адкрыццяў. Ці даводзілася вам калі сустракацца з іншапланецянамі, якія прыйшлі пасябраваць з жыхарамі Зямлі? А на гэтым свяце ладзіліся агульныя танцы, гульні, пацешкі, конкурсы для малых і дарослых. І цяжка было вызначыць мяжу між фантастыкай і рэальнасцю. Завіталі на плошчу на старадаўнім дырыжаблі знаёмыя героі папулярных дзіцячых кніжак, а потым падаў хрыплаваты голас робат, абвяшчаючы мір у Сусвеце — і прыдуманая гісторыя набывала адценні праўдзівага, шчырага пратэсту супраць вайны. Прыехаў да малечы Ямеля на ўдасканаленай печы-радыёстанцыі — і казка ператварылася ў рэалію: школьнікі адгадвалі загадкі, канструявалі новыя мадэлі, спрачаліся і знаходзілі правільныя адказы на фізічныя пытанні-задачы. І не было тут выдатнікаў і двоечнікаў. Быў творчы запал, імкненне спасцігнуць, вынайсці, сцвердзіць.

Я назірала за падлеткамі, якія вырашалі надзвычай важныя праблемы, верылі ў сваю дасведчанасць, і... шкадавала, што рэдка бываюць такімі вось творчымі школьныя ўрокі...

«Зўрыка!» — шмат стагоддзяў назад усхвалявана ўсклікнуў Архімед і даў жыццё фізічнаму закону. «Зўрыка!» — шматгалоса гукала свята, якое аб'яднала славутых майстроў-рацыяналізатараў і маладых няўрымслівых вынаходцаў. Побач з заслужанымі рабочымі, канструктарамі, інжынерамі ва ўрачыстым шэсці крочылі іх юныя паслядоўнікі — удзельнікі тэхнічных гурткоў, гаспадары станцый юных тэхнікаў. Побач з выстаўкай тавараў народнага спажывання, зробленых з адходаў прамысловасці, размясцілася выстаўка светлай мары, крылатай фантазіі: плылі ў туманную далеч караблі, расхіналі крылы самалёты, зладжана працавалі радыётэхнічныя прыборы — матэрыяльна ўвасобленыя хлапчуковыя летуценні. Хто ведае, можа, свята ў Барысаве стала першай прыступкай на творчай дарозе будучага вучонага...

Першае ў рэспубліцы свята тэхнічнай творчасці, якое яскрава адлюстравала дасягненні ў развіцці тэхнічнай адукацыі моладзі на Міншчыне, запаліла сімвалічную чашу майстэрства, якая надзеліць агнём натхнення кожнага, хто неўтаймоўны душой і думкай.

Спаборніцтвы картынгістаў і трыялістаў сталічнай вобласці, конкурс тэхнічных эрудытаў, мультлато «У краіне тэхнікі», віктарыны і канцэрты самадзейных артыстаў — багатай была палітра свята. І кожны зрабіў для сябе адкрыццё, трапіўшы ў свет тэхнічных цудаў і юначых захапленняў.

А. ЕМЯЛЬЯНАВА.

«АРХАНГЕЛЬСК» У МІНСКУ

Апошнім часам сфарміраваліся шматлікія джазавыя школы ў розных краінах свету. У СССР вылучаюць літоўскую, эстонскую, азербайджанскую школы, а таксама — паўночную, якую вось ужо на працягу 15 гадоў з гонарам прадстаўляюць на фестывалях у нашай краіне і за мяжой У. Разіцкі і яго калегі з джаз-групы «Архангельск». Сёлета гэты калектыў дэбютаваў на мінскай сцэне, хоць беларускім аматарам джазу ён ужо знаёмы па выступленнях на фестывалі «Віцебская восень».

У першым аддзяленні мінскага канцэрта джаз-група прадставіла кампазіцыю вялікай формы, якая, па сутнасці, не мае строгай канструкцыі, а грунтуецца на шэрагу імправізацыйных блокаў. Яны выконваюцца музыкантамі ў залежнасці ад многіх фактараў, галоўныя з якіх — іх уласны настрой і рэакцыя залы на тое, што прапануецца са сцэны.

Другая частка канцэрта — творы, якія спявае сёлетні выпускнік Архангельскага музычнага вучылішча па класе класічнага вакалу К. Сядовін. Ва ўсесаюзнай анкеце джазавых крытыкаў 1985 г. ён быў адзначаны ў катэгорыі «Адкрыццё года». Пераканальна выконвае К. Сядовін як сучасны, надзвычай складаны джазавы рэпертуар, так і класічныя блюзы і нават негрыцянскія спірычуэлсы.

З восені гэтага года джаз-група «Архангельск» пераходзіць на штатную філарманічную працу. І яшчэ: у 1985 годзе дыск з запісамі ансамбля быў выпушчаны ў Англіі — сведчанне высокага ўзроўню савецкіх музыкантаў.

Беларуская дзяржаўная філармонія ў апошні час значна пашырыла кола джазавых калектываў, што запрашаюцца ў рэспубліку. І гэта варта ўхвалы. Разам з тым хацелася б пажадаць, каб атрымалі магчымасць выступіць на філарманічнай сцэне і мінскія калектывы. Маю на ўвазе квінтэт І. Сафонава і квартэт А. Бурштэйна, які нядаўна пачаў рэгулярна выступаць у бары гасцініцы «Планета» з праграмамі класічнага джазу і з творамі ўдзельнікаў ансамбля. Чаму і гэтыя калектывы не могуць час ад часу выходзіць на шырокую публіку як штатныя ансамблі нашай філармоніі? Яны ж складаюцца з прафесійных і дасведчаных у джазе музыкантаў. Творчы лёс «Архангельска» пацвярджае плённасць такога супрацоўніцтва канцэртнай установы з джазавымі музыкантамі.

Ч. КАСІЧ.

НАШ КАЛЯНДАР

ПАМЯТАЮЦЬ КУПАЛУ ЛЯЎКІ

Да 25-годдзя філіяла Літаратурнага музея Янкі Купалы

Упершыню на Аршаншчыну Янка Купала прыехаў у красавіку 1935 года ў час творчай камандзіроўкі на чале групы беларускіх пісьменнікаў і адразу палюбіў гэты песенны край, працавітых і добразычлівых людзей, маляўнічыя мясціны з венавымі соснамі і сівым Дняпром.

Якраз адзначалася 30-годдзе творчай дзейнасці песняра. 25 мая 1935 года выйшла пастанова СНК БССР аб узнагароджанні паэта легкавым аўтамабілем, і ў Ляўках, у сувязі са знамянальнай датай, і згодна пастанове СНК БССР ад 11 снежня 1935 года, за кошт дзяржавы Купалу была пабудавана дача.

Пакуль будавалася яна, паэт жыў у доміку ляснічага Копыскага лясніцтва М. Шыманскага, а потым да чэрвеня 1941 года заўсёды прыязджаў сюды ранняй вясной і ад'язджаў позняй восенню.

Дача стала гасцінным прытулкам для многіх нашых беларускіх паэтаў і празаікаў, для гасцей з іншых рэспублік, з Масквы, Смаленска... У Ляўках бывалі Якуб Колас, К. Крапіва, М. Лынькоў, К. Чорны, П. Броўка, А. Александровіч, П. Глебка, С. Шушкевіч, Т. Масэнка і іншыя. У артыкуле «Слова пра сябра» Я. Колас прыгадваў: «У гэтых успамінах аб паэце нельга абмінуць нашых сустрэч на яго дачы ў Ляўках на Аршаншчыне. Дача была пабудавана ў надзвычай прыгожым кутку, на маляўнічай дняпроўскай кручы, на ўскрайку старадаўняга лесу».

Пятрусь Броўка, нават праз дзесяцігоддзі, бываючы ў музеі Янкі Купалы ў Мінску, заўсёды ўспамінаў, што «такі цудоўны куток, як Ляўкі, цяжка ўявіць». Купала часта сустракаўся з калгаснікамі сельгасарцелі «Х з'езд Саветаў», з рабочымі Копысі. Вясноўцы заўсёды запрашалі песняра на свае сходы. Да сустрэч паэт рыхтаваўся сур'ёзна, грунтоўна, лічыў абавязкам расказаць пра сваю працу, падзяліцца задумамі. А калі да яго завіталі калгаснікі і прынеслі першы сноп, то ўжо назаўтра раніцой удзячны паэт прачытаў ім свой верш «Госці»:

Ка мне у госці з прывітаннем
шчырым
І з песнямі калгаснікі
прыйшлі.
Сам старшыня прыйшоў і
брыгадзіры,
Настаўніца, даяркі й
пастухі...

...Такога гонару не меў ніколі,
Як я на гэтае зямлі жыву,
Каб так віталі мяне
хлебам-соляй
І то не ў сне якім, а наяву.

У Ляўках песняру працавалася надзіва плённа. Толькі за чэрвень-жнівень 1935 года ім напісана 18 вершаў, за чэрвень месяц каля 700 паэтычных радкоў. Творы гэтага перыяду ўвайшлі ў літаратуру як Ляўкоўскі цыкл вершаў песняра. Усе яны напісаны пад уражаннем таго, што пясняр бачыў вакол сябе, пад уплывам сустрэч з людзьмі, сувязі з жыццём. У вершы «Лён» ён, напрыклад, уславіў працалюбства народа, светлае каханне моладзі. Прачытаўшы гэты твор, Максім Горкі з захапленнем напісаў толькі адно слова «Слаўна». Міхась жа Лынькоў назваў верш «Лён» светлым гімнам працы і любві чалавечай. Дарэчы, штогод, па даўняй традыцыі, насупраць Купалаўскага запаведніка, які займае 19 гектараў, ранняй вясной засяваецца і ўсё лета радуе людзей, якія прыязджаюць сюды, блакітнае поле лёну.

Паэт часта гуляў па беразе Дняпра, бачыў зарослыя травою акопы першай сусветнай вайны. Неўзабаве нарадзіўся верш «Старыя акопы», у якім Купала папярэджваў чалавецтва аб фашысцкай чуме, верыў: «На іхніх землях з іхніх генералаў знімаць пагоны будзем, шаблі і крыжы».

Пра кожны верш гэтага цыкла можна гаварыць шмат, нельга не згадаць яшчэ два, лірычныя героі якіх мелі прататыпаў. Пад уражаннем сустрэчы на вясковай вуліцы з хлопчыкам, які вельмі ўдала падрабляў гукі самалёта, Купала напісаў верш «Хлопчык і лётчык». Алеся Александровіч успамінала, што паэт нават прыпыніў хаду і спытаў хлопчыка: «Кім быць хочаш?» А той адказаў: «Лётчыкам». Іменна гэты верш выхаваў цэлую плеяду праслаўленай моладзі якая ішла ў Асаавіяхім. Любіў твор і Юрый Гагарын. Пасля таго, як камандзір эскадрыллі Тамара Казарына з лётчыкамі свайго палка наведала Ляўкі, з'явіўся верш «Алеся».

Апошні раз Янка Купала прыехаў у Ляўкі 24 чэрвеня 1941 г., а 30 чэрвеня выехаў у Маскву. Дача згарэла ў полымі вайны.

Ажыццяўляючы пастанову СНК БССР і ЦК КП(б) Беларусі ад 4 жніўня 1945 года аб увекавечанні памяці Янкі Купалы, у 1962 годзе, у сувязі з 80-год-

ВІНШУЕМ

Міколу КАПЫЛОВІЧУ—50

10 ліпеня спаўняецца 50 гадоў празаіку Міколу Капыловічу. Праўленне СП БССР накіравала юбіляру прывітальны адрас, у якім, у прыватнасці, гаворыцца:

«Дарагі Мікалай Фаміч!

Горача віншуем Вас з 50-годдзем з дня нараджэння.

Вы з пакалення пісьменнікаў, якое шырока вядома як пакаленне, апаленае вайной. Дзяцінства і юнацтва прайшлі сярод людзей своеасаблівага палескага краю, павагу і любоў да якіх Вы ўзялі назаўсёды. Ад першага апавядання да твораў апошняга часу — усё напісанае — прысвечана прыгажосці Палесся, палешукам, іх трывогам і радасці, любові да працы. У творах яскрава праглядаецца антыфашысцкая, антываенная тэма.

Вашаму пяру належаць кнігі

апавяданняў і аповесцей «Скрозь жывуць людзі», «Засада», «Дні ціхай восені», «Чужы сваяк». Героі апошніх твораў — гэта «бязбацькавічы», якія сталі людзьмі сталага веку. Яны нясуць сёння галоўную дзяржаўную службу, вядуць бой, хоць і бяскроўны, але цяжкі, — бой з мяшчанствам, якому, акрамя сябе, ні да чаго няма справы. У гэтым баі праходзяць ачышчэнне і загартоўку людзі заўтрашняга дня, з імі тыя, каму перабудова бачылася даўно, з імі «чужым сваякам» не па дарозе.

Спадзяёмся, што вамі будзе напісана нямала новых таленавітых твораў.

Жадаем моцнага здароўя, вялікага асабістага шчасця, творчай радасці».

Супрацоўнікі «ЛіМа» далучаюцца да гэтых цёплых слоў.

Мікола КАПЫЛОВІЧ

СУСТРЭЧА

АПАВЯДАННЕ

ПЯТРО ВАРАНОВІЧ, настаўнік вясковай школы, нечакана трапіў з Палесся ў Мінск, у горад сваіх студэнцкіх і юнацкіх гадоў — прыехаў на курсы ўдасканалення. Адразу пасля курсаў, якія падаліся яму занадта доўгімі і слаба падрыхтаванымі, кінуўся ў магазіны па пакупкі. За дзве гадзіны да адыходу цягніка Пятро Васільевіч выйшаў з апошняга магазіна з авоськаю і сакваяжам у руках, напханымі школьнымі гатавальнямі, дапаможнікамі, схемамі па біялогіі. Чарапаху для заалагічнага гуртка, якую купіў у магазіне «Прырода», спехам засунуў у кішэню пінжака і забыў пра яе.

Пякло сонца. У горадзе быў абедзенны час «пік», пра які Пятро Васільевіч, жывучы ў вёсцы, даўно забыў і разам з усімі кінуўся да дзвярэй аўтобуса, калі той, дыхаючы чорным смуродлівым дымам, прытармазіў на прыпынку. Жаданне ўціснуцца ў аўтобус у яго было вялікае, але з гэтага нічога не выйшла. Пятро Васільевіч апошнім ускочыў на прыступку і павіснуў у дзверцах «Ікаруса», але далей працісну-ца не змог — перашкодзілі авоська і сакваяж. Вярановіча заклініла ў дзверцах, і ён ледзь вылузаўся з іх на тратуар. І тут жа аўтобус выпусціў на прыпынку жанчыну, рэзка ляпнуў створкамі і, цяжка прысядаючы, рушыў далей.

Жанчына падчапурыла рукамі пульхную прычоску, паклычаную ў аўтобусе, і раптам зірнула на Пятра Васільевіча знаёмымі вачыма. Гэта было так нечакана і неспадзявана для Вярановіча, што ён міжволі зморшчыўся і часта заміргаў вейкамі. Чырвоны, спацелы, з пакункамі ў руках, ён быў пацешны і бездапаможны. Дзіўнаю здавалася нават яго самавітасць, строга падкрэсленая чорным касцюмам, белай кашуляй і вузкім гальштукам.

— Пеця? — недаверліва спытала жанчына і яшчэ раз падчапурыла прычоску, асцярожна датыкнулася пальцамі да чорных завіткоў нядаўняй укладкі. Трохі сумелася, але потым з яшчэ большай цікаўнасцю і здзіўленнем паглядзела на Вярановіча, не зважаючы на яго збянтэжанасць, сакваяж і авоську, вузкі гальштук і самавітасць.

— Пеця! — яшчэ раз сказала яна, але ўжо цвёрда і больш упэўнена, не ведаючы, як сябе паводзіць далей. — Чаму ж ты не прызнаешся?

— Тома,— ціха азваўся Вярановіч і глыбока, на ўсе грудзі, уздыхнуў. — ...Як жа так, га?

Яны не бачыліся амаль дваццаць гадоў, з таго часу, калі скончылі універсітэт і цяпер выпадкова сустрэліся, пазнавалі і не маглі пазнаць адзін аднаго, не маглі толкам зразумець — дзякаваць ці клясці ім гэты выпадак. Але паступова ўсё колішняе і, здавалася, забытае пачало ўсплываць, яснець, і раптам яны здзівіліся, што сустрэліся як чужыя. Пра тое, што цяпер і на самай справе чужыя, яны неяк не падумалі, ліхаманкава шукаючы ў памяці тое, што некалі аб'ядноўвала іх.

— Пойдзем, Пеця, пойдзем, — пацягнула яго за рукаў Тамара,— божа, якія мы цяпер старыя.

Вось гэта сумнае і недарэчнае «старыя» абурыла на нейкі момант Пятра Васільевіча. Ён адчуў за гэтым словам нейкую крыўду.

— Ды якія мы старыя, Тома? Я вось убачыў цябе — і быццам не было гадоў. Хоць зноў едзь з курсам у калгас на бульбу.

— На бульбу старыя могуць ехаць,— усміхнулася Тамара,— я пра другое...

І Пятро Васільевіч прыгадаў усё. Праўдзівей, здагадаўся, што ніколі і не забыў...

— Куды мы? — раптам ціха спытаў ён.

— А бог яго ведае,— Тамара спынілася і зноў пільна паглядзела на Вярановіча. Яе вочы сумна і вільготна заблішчалі. — Можа, у рэстаран?

— У рэстаран? — Ён зірнуў на гадзіннік. — Давай у рэстаран. Час яшчэ ёсць.

Заняўшы столік і зрабіўшы заказ, яны зноў прымоўклі; цяпер ужо па-сапраўднаму пачалі прыглядацца адзін да аднаго, параўноўваючы сябе, цяперашніх, з тымі колішнімі маладымі. Глядзелі адзін аднаму ў твар і сумавалі па тых далёкіх ужо гадах, калі яны былі бесклапотнымі, вясёлымі студэнтамі. І тое далёкае раптам нечакана пачало выплываць з памяці, набліжацца і ўжо не здавалася такім далёкім. Яны прыгадвалі нейкія дробязі з колішняга свайго жыцця і здзіўляліся з іх, як здзіўляюцца з дзіцячага свавольства.

Заказ прынеслі, і яны адзначылі сустрэчу, чамусьці збянтэжана пазбягаючы позірку адзін на аднаго. Пятро Васільевіч таропка палез у пінжак па цыгарэты і раптам яго рука натыкнулася ў кішэні на чарапаху. Перапалохаўся, што яна там задушылася, і хутка выняў яе на святло, слаба пстрыкнуў па цвёрдым панцыры і вінавата ўсміхнуўся Тамары.

— Што гэта? — здзівілася яна.

— Чарапаха,— адказаў Пятро Васільевіч.

— Чарапаха? У кішэні? Ну, Пеця, ты зусім не змяніўся! — засмяялася і зноў з цікаўнасцю паглядзела на Вярановіча. — А на выгляд нібыта другі, падобны на нейкага чыноўніка. Задаволены, чысцюткі і кругленькі...

— Мы ў школе заалагічны гурток стварылі. Вось будуць юннаты радавацца, калі прывязу ім чарапаху.

Гэтая чарапаха і сам Вярановіч, збянтэжаны і нейкі нават вінаваты, з недарэчным па цяперашняй модзе гальштукам, з трохі лупаватымі вачыма на поўным твары, расчулілі жанчыну, і яна нечакана для сябе спытала:

— Пеця, а памятаеш, як я цябе выклікала на вуліцу?

Пятро Васільевіч устрапянуўся, падняў вочы і здзіўлена паглядзеў на Тамару. Быццам нейкая цень прабегла па яго твары, і Вярановіч пачаў зноў запіхваць чарапаху ў кішэню, але ў апошні момант спахапіўся, уціснуў яе ў авоську паміж скруткамі і закурыў, не пытаючы дазволу. Ён ніяк не чакаў, што Тамара згадае пра даўнейшае, і цяпер з болем і смуткам прыгадваў той дзіўны выпадак.

Тома, тая, ранейшая, аднакурсніца Тома сядзела насупраць. Усё тыя ж спрытныя, гарэлівыя і трохі кплівыя вочы, маленькі рот і кірпаты нос. Пятро Васільевіч захалялзаўся, і боль, ужо сённяшні боль, раптам кальнуў яму ў сэрца, пранізаў усё цела, і Вярановіч заплюшчыў на момант вочы, здушваючы яго ў сабе.

Ці памятае ён? Што за пытанне, калі ён усе апошнія гады і жыў успамінамі пра той выпадак! Інакш проста быць не магло, бо ён кахаў Тому, кахаў таемна і моцна, кахаў усе пяць гадоў, калі яны разам вучыліся, і кахаў усе астатнія гады, калі ўжо скончылі універсітэт і раз'ехаліся хто куды. А выпадак? Ды што выпадак? Дзіўны ён быў. Зрэшты, як і ўсе астатнія. А было ж шмат выпадкаў, а сапраўдны так і не надарыўся. А чаму ж не надарыўся? Ды таму, што вакол яе заўсёды ўвіхаліся хлопцы, больш спрытныя і разумныя. Выпадкі... Той быў асаблівы. Усе астатнія прыдумваў сам, а гэты прыдумала яна. Ён добра памятае, як рана яна пакінула пагулянку ў кватэры Некрашэвічаў, а потым раптам пачуўся званок, і нехта папрасіў яго да тэлефона. Гэта была Тома. Яна весела і бесклапотна спытала, ці не зможа ён пабыць з ёю пяць хвілін, і Пеця адразу ўцягнуў галаву ў каўнер, чакаючы новага падвоху Тамары, потым баязліва зіркнуў на аднакурснікаў і адказаў — не. Тады Тома папрасіла перадаць трубку Толіку Гаркаваму, і той адразу ж збег з пагулянкі, а ён увесь вечар быў сам не свой, на чым свет стаіць кляў сябе за нерашучасць.

Вось і ўвесь выпадак. Нічога асаблівага. У горшым выпадку — для яе. Чаму ж яна зараз пытаецца пра даўняе? Можа, і цяпер хоча пакпіць з яго? Навошта? Вярановіч зірнуў на яе весела, з робленым смехам, нібы прыгадаў дзіцячае блазенства, адказаў:

— Як жа не памятаць? Памятаю. Я тады разгубіўся ў першы момант, а потым сунуў трубку ў рукі Толіку ды хутчэй за стол. Зрэшты, ты не ведаеш, дзе ён цяпер?

— Не, не ведаю,— суха адказала Тамара і пільна паглядзела на Пятра Васільевіча.

Ёй было непрыемна і самотна, што Пятро так па-блазенску адказаў на яе пытанне. Тым больш пытанне, якое выпадкова сарвалася з языка, было далёка для яе не выпадковым. Але ў гэтых словах яна пазнала ранейшага Вярановіча, пазнала яго ўпартасць і задзірлівасць, якія так дзіўна былі ў ім змешаны з гонарам і сарамлівасцю. Не, нічога ў гэтым свеце не мяняецца. Усё засталося ранейшым, калі не звяртаць увагі на яго ўзрост, паважнасць і

Філіял Літаратурнага музея Янкі Купалы ў Ляўках.

дзем з дня нараджэння песняра, у будынку былой канторы Копыскага лясніцтва адкрыўся філіял Літаратурнага музея Янкі Купалы, была ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Музей да 1977 года існаваў на грамадскіх пачатках. Пасля таго, як ён стаў дзяржаўнай установай, адкрылася новая экспазіцыя, а ў 1978 годзе ў тутэйшых мясцінах быў створаны Купалаўскі мемарыяльны запаведнік.

У 1982 годзе, калі шырока адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы, была адноўлена дача паэта, дзе створана мемарыяльная экспазіцыя. Адноўлены таксама домік шафёра, гараж... З ліпеня таго ж года была ўрачыста адкрыта паркавая скульптура «Восень паэта», аўтар якой Анатоль Анікейчык.

Кожны год у Ляўках праходзяць святы паэзіі і працы. З усіх куткоў нашай неабсяжнай краіны едуць сюды людзі, каб дакрануцца да невычэрпнай крыніцы Купалаўскай паэзіі.

Навуковыя супрацоўнікі філіяла ў Ляўках сустракаюцца з калгаснікамі, наладжваюць сустрэчы з вучнямі Копыскай, Зубаўскай, Ляўкоўскай і іншых школ. На шчасце, жывыя яшчэ людзі, якія вучнямі сустракалі Янку Купалу і Петруся Броўку на выпускным вечары ў Копыскай школе. Гэтымі днямі цікавыя ўспаміны аб тым незабыўным часе перадала ў музей жыхарка Копысі Н. Поклад.

Памятаюць Купалу Ляўкі.

Л. ДАВІДОЎСКАЯ,
старшы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Янкі Купалы.

раннюю сівізну на скронях. Усё жыццё Пятра яна магла б цяпер угадаць, бо Тамары здавалася, што пражыла гэтае жыццё разам з ім. І ўсе гэтыя гады кахала яго. Цяпер можна і прызнацца. Нават і сказаць яму зараз. А ён, ці кахаў яе ён? Наўрад. Нават тады, у студэнцкія гады, усё больш дзьмуўся, як індык, не заўважаў яе. Вось і тады не прыйшоў на спатканне, калі яна паклікала яго па тэлефоне. Яму з Лёлькай было лепш, у турпаходы разам хадзілі, у тэатр, на каток. Ці ходзяць цяпер куды-небудзь разам? А некалі Лёлька казала: «У нас, дзяўчаткі, толькі сяброўства, і больш нічога». «А ўсё-ткі, калі прызнацца, сказаць яму? А можа, сам ужо здагадаўся? І чарапаха гэтая, і касавурыцца гэтак жа, як тады».

— Пачастуй мяне цыгарэтай, — раптам папрасіла Тамара.

— У мяне «Прыма», без фільтру, — замітусіўся Пятро Васільевіч. — Можа, у буфет скочыць, га?

— Ды якая розніца! Давай, што ёсць.

Яна закурыла і адхілілася да спінкі крэсла. Нага на нагу, лёгкае прыжмурванне вачэй, локаць чулліва адтапыраны ўбок. Яна ўмела так трымаць сябе. І тут жа, нібы струменьчыкі дыму ў фортку, да яе пацягнуліся позіркі з другіх сталоў. Пятро Васільевіч зморшчыўся і адвярнуўся, адчуваючы, як зайшлося, закалацілася ў яго сэрца і даўняя непрыязь да мужчын, якія некалі заўсёды звярталі на Тому ўвагу, прачнулася ў ім. Асабліва было яму непрыемна, што вылупілі на яе зрэнкі і два нейкія зялёныя яшчэ юнакі. Ён быццам бы зноў бачыў Тому маладой, гарэзлівай, і ад гэтага рабілася Варановічу неяк вусцішна і радасна.

— А ведаеш, Пеця, — роўна і спакойна сказала Тамара, — я цябе кахала.

Ён не адразу зразумеў сэнс яе слоў і па даўняй звычцы недаверліва, падазрона паглядзеў на Тамару. Потым да яго дайшло, што сказала яна гэта сур'ёзна, і нечакана для сябе густа пачырванеў. Хаваючы збянтэжанасць і не ведаючы, што сказаць, дзе сябе падзець, Пятро Васільевіч сумеўся, азірнуўся па баках — баяўся, каб хто не пачуў іх размовы. У грудзях раптам стала горача, засмягла, і Варановіч пацягнуўся рукою да бутэлькі, наліў у фужэр піва і выпіў, праганяючы смагу. І папярхнуўся, натужліва і суха закашляў.

— Можа, не верыш?—усміхнулася Тома. — Тады спытай у сваёй Лёлі. Яна ведае.

Пачуўшы такое, Пятро жахнуўся, крутнуўся на крэсле, быццам яму было мулка сядзець. Каб яго жонка, самы блізкі чалавек, ведала пра гэта? Не можа такога быць! Яна, калі б ведала, даўно яму б сказала... А зрэшты... Далей ён думаць баяўся.

Дзіва, яна яго кахала!

Варановіч ледзь не застагнаў. Боль, горкі і тужлівы боль, перапоўніў яго. І не было куды ад яго падзецца. І тады ён, адчайна і груба, сказаў:

— І я цябе кахаў, Тома.

Цяпер ужо яна са здзіўленнем паглядзела на Варановіча. Пятро Васільевіч сядзеў жаласлівы і разгублены, і раптам здаўся ёй такім блізкім і дарагім, што Тамары захацелася працягнуць руку, дакрануцца да яго, пагладзіць па галаве. Але стрымалася і толькі ўздыхнула, думаючы пра тое, што і сёння б пайшла за Варановічам куды вочы глядзяць. Пайшла б, ні пра што не думаючы, нічога не ўспамінаючы. Але... але...

— Вось такая справа, дарагі Пеця,—самотна сказала яна, — нічога ў нас не выйшла, не атрымалася. А магло б тады атрымацца. Хто вінаваты? Абодва вінаватыя. Ты дзьмуўся, касавурыўся на мяне, а я дурэла... Так вось і пракасавурылі, прадурэлі сваё... Зрэшты, усё да лепшага робіцца на гэтым свеце... Так, Варановіч?

Вочы яе раптам зноў хітравата прыжмурыліся, і яна ўстрасянула галавою.

«Смяецца, — абпякла думка Варановіча, — зноў смяецца... Кпіць і здзекуецца. Колькі гадоў мінула... Калі што і было, дык даўно з душы выветрылася. Што ім, жанчынам? Ім каханне — раз плюнуць, два расцерці. Іншая справа ў мужчын. Яны больш надзейныя. Што тут хаваць, што казаць — кахае ён Тому і цяпер. Магчыма, яшчэ і мацней, як некалі... І на ўсё цяпер згадзіўся б, але яна...»

Варановіч зірнуў раптам на гадзіннік, тужліва ўсміхнуўся і зноў ненатуральна-робленым голасам бадзёра сказаў:

— Так, Тома, было ў нас каханне, было, але мне пара на цягнік.

— А пешшу пайшоў бы? — усміхнулася Тамара.

— Куды? — не зразумеў ён.

— Дамоў, да Лёлькі, канечне.

— Навошта? — шчыра здзівіўся Варановіч.

— Я жартую. Так і быць, — Тома хутка паднялася з крэсла. — Пойдзем, Варановіч.

Яны выйшлі на вуліцу і пачалі лавіць таксі.

Мільгануў зялёны агеньчык, машына спынілася. Пабеглі да яе абодва. Варановіч смешна размахваў авоськаю і сквапяжам. Умасціліся на задняе сядзенне, выпадкова селі вельмі блізка адзін да аднаго. І заціхлі, напружыліся, штосьці пільна разглядвалі кожны ў сваім акне. А што было разглядваць? Мільгалі аднолькавыя дамы з аднолькавымі балконамі, адбягалі, адскоквалі назад курчастыя, стомленыя ад пылу і спёкі ліпы. Але яны, сумуючы і ўздыхаючы, нічога гэтага не заўважалі.

У нейкі момант Тамары падалося, што зараз трэба пра ўсё, што насіла гэтыя доўгія гады ў сваім сэрцы, яму сказаць, аслабаніць душу, бо такой сустрэчы, мабыць, ужо ніколі не будзе; павярнула твар да Варановіча і памкнулася была да яго абазвацца, але Пятро Васільевіч раптам выцягнуў з авоські чарапаху і ўсміхнуўся.

— Вось жа істота, — задумліва сказаў ён, — жыве і нічога ёй не трэба. Іншыя ад адзіноты паміраюць, а ёй хоць бы што.

— Ага, — незаўважана адхінулася на сядзенні, адсунулася ад яго Тамара, — сапраўды, нічога ёй не трэба.

На перон яны прыйшлі маўклівыя і засяроджаныя. Цягнік яшчэ не прыйшоў, і час для абодвух цягнуўся марудна і доўга. Варановіч раптам успомніў, што Тамара нічога не сказала яму пра сваё жыццё і спытаў:

— Ну, а чым ты, Тома, цяпер займаешся?

— Сабою, — сумна ўсміхнулася яна, — сабою і сынам.

— Вялікі ён?

— Чатырнаццаць ужо гадоў.

— А муж?

— Мужа ў мяне няма, Пеця. Не пашанцавала мне выйсці замуж. Ты вось што, Пеця, Лёльцы лепш не кажы пра мяне. Не гавары, што сустрэў мяне ў Мінску, не трэба.

— Ды што ты? — абурыўся быў Варановіч. — Яна ж рада будзе ведаць, што...

Але Тома схавала вочы і зноў папрасіла:

— Не трэба, Пеця.

Пастукваючы на рэйках, да перона падышоў і спыніўся цягнік. Тамара раптам выняла з сумкі хусцінку, прыклала яе да вачэй і адвярнулася. Варановіч разгублена глядзеў на яе.

— Сыну вось, — раптам пачаў спяшацца Пятро Васільевіч, — сыну падарунак ад мяне перадай.

Ён выхапіў з авоські чарапаху, сунуў Тамары ў рукі і нешта хацеў сказаць, але нічога не сказаў, хваравіта зморшчыўся і палез у вагон.

Кастусь (Канстанцін) Лявонцьевіч ГУБАРЭВІЧ

3 ліпеня 1987 года пасля цяжкай працяглай хваробы на 81-м годзе жыцця памёр вядомы беларускі драматург, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння Кастусь (Канстанцін) Лявонцьевіч Губарэвіч.

К. Л. Губарэвіч нарадзіўся 23 снежня 1906 года ў вёсцы Радучы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1927 годзе скончыў Магілёўскі педагагічны тэхнікум, працаваў настаўнікам у в. Бабовічы Гомельскага раёна, затым вучыўся на сцэнарным аддзяленні кінаінстытута ў Маскве. З 1931 года працаваў рэдактарам на кінастудыі «Белдзяржкіно» ў Ленінградзе. У гады Вялікай Айчыннай вайны—рэдактар на радыёстанцыі «Савецкая Беларусь». У пасляваенныя гады загадваў аддзелам літаратурна-драматычных перадач на Беларускім радыё, аддзелам мастацтва ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», з'яўляўся членам рэпертуарнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм», быў галоўным рэдактарам рэпертуарнай калегіі Міністэрства культуры БССР.

Пісаць Кастусь Губарэвіч пачаў будучы студэнтам тэхнікума. Першая кніга — зборнік апавяданняў «Гайда туды і Жывыя шрубы» — выйшла ў 1930 годзе.

Шырокую вядомасць пісьменніку прынеслі яго драматычныя творы для тэатра і кіно. Ён аўтар п'ес «Брэсцкая крэпасць» («Цытадэль славы»), «Простая дзяўчына», «На крутым павароце» і іншых. Шырынёй паказу рэвалюцыйных падзей, глыбінёй характараў вызначаецца п'еса Кастуся Губарэвіча «Галоўная стаўка». Выдадзена некалькі кніжак п'ес драматурга.

Значны ўклад Кастусь Губарэвіч унёс у развіццё беларускага кіно. Ён адзін з саўтараў кінафільма «Баям насустрач» («Пераможцы»). Па яго сцэнарыях зняты «Неадкрытыя астравы», некалькі дакументальных фільмаў.

За сцэнарыі мастацкіх фільмаў «Дзяўчынка шукае бацьку» (разам з Я. Рысам), «Анюціна дарога» і «Паланез Агінскага» Кастусю Губарэвічу прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР. Ён—лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Уся творчасць пісьменніка прысвечана ўслаўленню савецкага чалавека — героя рэвалюцыі, актыўнага будаўніка і мужнага абаронцы сацыялістычнай Радзімы, служыць выхаванню падрастаючага пакалення ў духу савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму.

К. Л. Губарэвіч актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці—выбіраўся членам праўлення Саюза пісьменнікаў і Саюза кінематаграфістаў БССР, з'яўляўся членам рэдкалегіі газеты «Літаратура і мастацтва». Яго вызначалі сумленнасць і прынцыповасць, высокая адказнасць за даручаную справу.

Працоўныя заслугі К. Л. Губарэвіча высока ацэнены Радзімай. Ён узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалём, Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Светлая памяць аб таленавітым пісьменніку, сумленным працаўніку, шчодрай душы чалавеку Кастусю Лявонцьевічу Губарэвічу назаўсёды захаваецца ў памяці тых, хто ведаў яго.

В. А. Пячэннікаў, Н. М. Мазай, І. І. Антановіч, Я. І. Скурко (Максім Танк), У. В. Мацвееў, Ю. М. Міхневіч, В. А. Нікіфараў, М. М. Яроменка, К. К. Атраховіч (Кандрат Крапіва), Р. І. Барадулін, І. А. Брыль, Г. М. Бураўкін, В. У. Быкаў, А. І. Вярцінскі, Н. С. Гілевіч, А. С. Грачанікаў, А. А. Дудараў, А. А. Жук, С. І. Законнікаў, В. В. Зуёнак, В. А. Казько, Ц. В. Крысько (Васіль Вітка), А. П. Кудравец, А. А. Лужанін-Каратай (Максім Лужанін), І. Я. Навуменка, П. Е. Панчанка, Б. І. Сачанка, І. Г. Чыгрынаў, І. П. Шамякін, В. С. Гігевіч, М. Я. Матукоўскі.

Калектыў Міністэрства культуры БССР глыбока смуткуе з прычыны смерці вядомага беларускага драматурга, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Канстанціна Лявонцьевіча ГУБАРЭВІЧА, выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Саюз пісьменнікаў БССР глыбока смуткуе з прычыны смерці вядомага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Кастуся ГУБАРЭВІЧА і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Саюз тэатральных дзеячаў БССР глыбока смуткуе з прычыны смерці члена СТД БССР, пісьменніка-драматурга, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР ГУБАРЭВІЧА Канстанціна Лявонцьевіча і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

З АСАБІСТАГА АРХІВА ІЛЬІ ГУРСКАГА

Фонды Цэнтральнага дзяржаўнага архіва - музея літаратуры і мастацтва БССР папоўніліся асабістым фондам актыўнага ўдзельніка рэвалюцыйных падзей у Петраградзе І. Гурскага, які перадала ўдава пісьменніка Марыя Якаўлеўна. У фондзе рукапіс рамана - хронікі «Вецер веку». У аснову першай і другой кнігі «Мір хацінам», «Улада Саветам», як вядома, пакладзены гістарычныя факты і падзеі, пачынаючы ад Лютаўскай буржуазна - дэмакратычнай рэвалюцыі ў Петраградзе, Беларусі і на Заходнім фронце і канчаючы ўтварэннем Беларускай ССР. У трэцяй і чацвёртай — «Народжаныя бурай», «Агнявыя гады» — расказваецца пра барацьбу беларускага народа пад кіраўніцтвам партыі на чале з У. І. Леніным за абарону заваёў Кастрычніка.

Сярод паступленняў — рукапісы раманаў «У агні», «Чужы хлеб», аповесці «Лясныя салдаты», камедыі «Свае людзі», драмы «Хлеб», многіх апавяданняў, лісты ваеннага часу Я. Коласа, К. Крапівы, Я. Маўра, П. Панчанкі, А. Стаховіча да Гурскага, нумары газет, у выпуску якіх прымаў удзел пісьменнік.

Многія з гэтых дакументаў будуць выкарыстаны на выстаўцы, прысвечанай 70-годдзю Вялікага Кастрычніка, якую рыхтуюць супрацоўнікі архіва-музея.

Л. БАЛЫНІНА,
загадчык аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў ЦДАМЛМ БССР.

НЯСВІЖ—ТУРЫСЦКІ ГАРАДОК?

У адрозненне ад многіх іншых старажытных гарадоў Беларусі ў Нясвіжы захавалася шмат помнікаў гісторыі і культуры. Згадаю замак, ратушу, два паркі, жылыя дамы з XVIII стагоддзя, старадаўнюю Слуцкую браму, былы манастырскі комплекс. Яны прываблівоюць мноства турыстаў, якім вандроўка па горадзе дае незабыўныя ўражанні. Але, пакідаючы Нясвіж, турыст адчувае і пэўны сум, бо знаёмства з гісторыяй і культурай горада абмяжоўваецца знешнім аглядам архітэктурных помнікаў. Былая ратуша аддадзена пад Дом піянераў, Слуцкая брама адрэстаўрыравана, але зачынена на замок, у замку размешчаны санаторый — уваход туды забаронены, замкавы двор гадоў дваццаць назад засадзілі хвоямі, якія вымахалі пад неба і закрылі фасады. Добра яшчэ, калі турыстам даводзіць пра нясвіжскую даўніну дасведчаны экскурсавод, але для большасці прыезджых мінулае горада застаецца невядомым. Бо ў Нясвіжы няма музея. Гэта тым больш дзіўна, што краязнаўчыя музеі ёсць нават у такіх райцэнтрах, якія ніколі не былі культурнымі асяродкамі і ў якіх часам не захавалася ніводнага даваеннага будынка. З гісторыяй Нясвіжа злучаны імёны выдатных дзеячаў культуры — Сымона Буднага, Бенеша Буднага, Данілы Набароўскага, Андрэя Рымшы, Яна Чачота, Адама Міцкевіча, Уладзіслава Сыракомлі, Якуба Коласа. Тут бывалі К. Рылееў, К. Паустоўскі, А. Талстой, В. Катаеў. Над будынкамі Нясвіжа працавала шмат выдатных архітэктараў. Памяць пра С. Буднага ўшанавана помнікам, але ўявіць па помніку значэнне асветніцкай дзейнасці Буднага даволі цяжка. Не зашкодзіла б хоць маленькая экспазіцыя, прысвечаная Нясвіжскай друкарні, выданням Буднага. Заслугоўвае музейнага адлюстравання гісторыя горада і замка, што зведалі шведскую навалу, разбурэнні ў час вайны з Напалеонам. У Вялікую Айчынную вайну нясвіжскі раён страціў кожнага трэцяга жыхара. Летась выдавецтва «Полымя» выдала цікавую кнігу К. Я. Шышыгінай «Музы Нясвіжа» (серыя «Па родным краі»). Але яна пры ўсіх сваіх вартасцях не можа зрабіць тую справу патрыятычнага і культурнага выхавання, якую штодзённа павінен рабіць музей.

Помнікам прыроды рэспубліканскага значэння з'яўляецца Нясвіжскі парк. На ягоных алеях сустракаюцца замшэлыя камяні. Гэта пастаменты пад скульптуры, якія страчаны. Чаму б нашым скульптарам не ўвайсці нанова ў прастору парку з сучаснымі работамі, якія адпавядаюць духу часу і сённяшняй эстэтыцы? На маю думку, парк дае ўсе падставы аб'явіць конкурс на скульптурны ансамбль. Дарэчы, чакаюць такой аздобы і іншыя нашы лепшыя паркі.

Ля падножжа замкавага пагорка пастаўлены помнік воіну-вызваленцу і гарыць вечны агонь. На мармуровых дошках высечаны імёны салдат, якія аддалі сваё жыццё за перамогу над фашызмам. Можа, прозвішчы гэтых людзей падышлі б больш для назвы нясвіжскіх вуліц, чым, напрыклад, распаўсюджаныя па нашых мястэчках «завулкі Суворава»?

Лепшым месцам для музея ўяўляецца ратуша, размешчаная на галоўнай плошчы горада. Для нейкай экспазіцыі можна выкарыстаць памяшканні Слуцкай брамы ці стары жылы будынак. Яшчэ на пачатку XIX стагоддзя Нясвіж меў вялікія зборы мастацкіх твораў. Многія з іх сёння знаходзяцца ў Эрмітажы, у іншых музеях, у тым ліку і ў беларускіх. Мяркую, што мае сэнс правесці ў Нясвіжы хоць бы выстаўку партрэтаў з былой нясвіжскай калекцыі, якія адрадзілі нашы рэстаўратары.

Э. ПУГАЧОВА,
мастацтвазнаўца.

г. Мінск.

ЁСЦЬ ЛЯ СТАХОЎЦАЎ МОГІЛКІ...

Кожны, хто прыязджае летам на аўтабазу «Нарачанка», не праміне ў першы ж дзень зрабіць прагулку ў лес, пазбіраць грыбы і ягады, якіх тут удосталь. Але не толькі дарамі прыроды багатыя тутэйшыя бары і светлыя бярозавыя гаі, што падступаюць упрытык да турбазы. Уздоўж і ўпоперак зрэзаны яны зарослымі хмызняком, драбналессем і ўсё яшчэ глыбокімі траншэямі і хадамі зносін, ямамі з-пад бліндажоў, воспінамі шматлікіх варонак. Не рэдкасць тут на завораных палянках пражжавелыя, але па-ранейшаму небяспечныя снарады.

Летам мінулага года ў час прагулкі я ледзь не наступіў на два: на плоскім камені ляжалі снарады калібрам 122 і 76 міліметраў. Сустрэўшы на ўзлеску дзядулю, які збіраў на засеянай бульбай паляне каларадскіх жукоў, пацікавіўся, з якой вайны гэтыя небяспечныя штуковіны, і паказаў на знаходку.

— З першай сусветнай, мікалаеўскай, як мы калісьці гаварылі, — загаманіў дзядуля. — Кожную вясну нашы трактарысты выворваюць іх па некалькі штук. Тут, сынок, фронт стаяў аж тры гады — з пятнаццатага па васемнаццаты. Вёска Занарач, месца, дзе цяпер аўтатурбаза, — усё гэта было пад германцам, тут пазіцыі іх знаходзіліся. Вось і гваздзіла іх руская анцілерыя. І снарады, што вы знайшлі, рускія. Трэба ў ваенкамат пазваніць, каб прыслалі сапёраў, а то яшчэ дзеці натрапяць і можа быць бяда...

Ад дзядулі даведаўся, што ў трох кіламетрах адсюль, паблізу вёскі Пронькі, ёсць могілкі, дзе пахаваны тысячы загінуўшых у тых баях нямецкіх салдат. Выбраўшы момант, я ўзяў на пракат веласіпед і адправіўся ў Пронькі. Вёска знаходзіцца ў кіламетры ад шашы, што вядзе з Мядзеля па заходняму берагу возера да пасёлка Нарач. На яе ўскраіне ў рэдкім сасонніку — тыя могілкі. У густым малінніку — складзены з камянёў-валуноў пірамідальны чатырохметровы абеліск з надпісам па-нямецку: «Тут пахаваны героі 80-й пяхотнай дывізіі. 1916 г.» Побач, у радок — некалькі меншых каменных помнікаў вышэйшым чынам кайзераўскай арміі. А далей, у глыбіні сасонніку, з нямецкай акуратнасцю выкладзены ў радкі адлітыя з бетону помнічкі - пліты на магілах радавых «мушкеціраў». Кожнаму — асобная пліта. На ёй прозвішча, дата смерці, вайсковае званне. Большасць салдат загінулі ў веснавых і летніх баях 1916 года. Нават па самых сціплых маіх падліках, іх тут не менш як дзве тысячы. Вядома, многія пліты за доўгія гады разбурыліся, былі выкарыстаны мясцовым насельніцтвам на фундаменты пад будынкі. Справа ў тым, што прыйшоўшыя сюды ў сорак першым годзе дзеці і ўнукі тых «мушкеціраў» спалілі вёску Пронькі дашчэнту — за сувязь яе жыхароў з партызанамі. Не палічыліся гітлераўцы і з тым, што многія гады сяляне ў нейкай меры былі ахоўнікамі тых могілак...

Для чаго аб гэтым я так падрабязна расказваю? Калі, падумалася, ёсць нямецкія захаванні, то павінны ж быць недзе і рускія. Але дзе яны? Адказ на гэтае пытанне рашыў пачуць ад старажылаў вёскі. Накіраваўся надвячоркам да сельскага магазіна — там звычайна збіраюцца пасля працоўнага дня хлебаробы. Выбраў двух самых старэйшых, на мой погляд, дзядкоў і спытаў, дзе знаходзяцца могілкі рускіх салдат з той, «мікалаеўскай», вайны.

— Э, няма, браток, такіх, — пачуўся адказ.

— Як так?...

— А вельмі проста, — працягваў размову словаахвотлівы дзядуля.

— Рускія дывізіі стаялі за суседняй вёскай Стахоўцы, гэта кіламетры чатыры адсюль. Забітых сваіх і памёршых ад ран хавалі ў невялікіх брацкіх магілах, раскіданых па ўсяму фронту. А як адышла наша мясцовасць у дваццатым годзе пад панскую Польшчу, дык тыя захаванні і забылі. Ды і калі б хто захацеў паставіць там хоць крыжы, дазволу ад мясцовых улад не атрымаў бы. Вось і зараслі брацкія магілы быльнягом — і знаку нідзе не знойдзеце. Памятаю, як мы, хлапчукі, хадзілі пад Стахоўцы збіраць патроны, гранаты. Я сам бачыў тады раскапаныя кімсьці магілы. Напэўна, мараздёры шукалі зброю, боты салдацкія, рамяні. Польскія ўлады глядзелі на ўсё гэта праз пальцы. А захавана там не адна тысяча рускіх салдат. Толькі ў час газавай атакі немцаў ля вёскі Занарач іх загінула каля тысячы.

Вось так і атрымалася: з аднаго боку колішняга фронту, што кіпеў баямі тры доўгія гады, магілы чужынцаў, якія тапталі нашу зямлю, палілі гарады і вёскі, захаваліся; з другога, дзе змагаліся нашы рускія людзі, сярод якіх было нямала і беларусаў, не засталося і следу ад загінуўшых.

Будзем аб'ектыўнымі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны тутэйшыя вёскі, пацярпеўшыя ад акупантаў, доўга залечвалі раны, нанесеныя ворагам. Трэба было прывесці ў парадак дзесяткі і сотні магіл савецкіх воінаў і партызан. І гэта было зроблена. Цяпер да месц іх захавання, да былых партызанскіх стаянак праляглі маршруты турыстычных аўтобусаў з адпачываючымі на турбазах, у дамах адпачынку і санаторыях, што выраслі пасля вайны вакол цуда-возера. Усё правільна: ніхто не забыты і нішто не забыта.

Але чаму ж ніхто ні ў Мядзельскім райвыканкоме, ні ў мясцовым аддзяленні таварыства аховы помнікаў не падумаў аб неабходнасці неяк увекавечваць месцы масавых захаванняў рускіх салдат з той першай сусветнай вайны? Размова ідзе не аб збудаванні дорагакаштоўных мемарыялаў—аб звычайных абеліскам, памятных дошках. Стаяць жа яны на Куліковым полі, на месцы Барадзінскай бітвы 1812 года і ў іншых мясцінах, дзе рускія воіны праявілі мужнасць у барацьбе з іншаземнымі захопнікамі. Паблізу вёскі Леніна ў Слуцкім раёне, дзе летам таго ж 1812 года казакі генерала Платава разграмілі полк французскіх кірасір, пастаўлен абеліск у памяць аб гэтай падзеі. Узвялі яго на сродкі мясцовага калгаса і сельсавета.

Так, мы ведаем, што першая сусветная вайна, развязаная краінамі Антанты і кайзераўскай Германіяй, была антынароднай, імперыялістычнай. Але будзем лічыцца і з тым, што тры гады рускія салдаты ля берагоў Нарачы стрымлівалі націск адборных кайзераўскіх дывізій, якія рваліся на ўсход, абаранялі ад чужынцаў нашу з вамі зямлю. І не ўшанаваць памяць тых, хто загінуў тут у жорсткіх баях, значыць, упадобіцца «Іванам, не помнящим родства».

Хочацца спадзявацца, што несправядлівасць гэтая будзе ў рэшце рэшт выпраўлена і да магіл рускіх воінаў, што захаваны паблізу вёсак Стахоўцы, Занарач, будуць ездзіць турысты, прыходзіць мясцовыя жыхары, як яны ходзяць да магіл савецкіх воінаў і партызан.

М. ТЫЧЫНА,
журналіст.

г. Слуцк.

НА ЭКРАНЕ

з 13 па 19 ліпеня

13 ліпеня, 20.15

II УСЕСАЮЗНЫ ФЕСТЫВАЛЬ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ, ПРЫСВЕЧАНЫ 70-ГОДДЗЮ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

Выступаюць удзельнікі мастацкай самадзейнасці Магілёўскай вобласці: народны хор народнай песні Кіраўскага РДК, народны ансамбль танца «Юнацтва» Бабруйскага ГДК, вакальная група ансамбля песні і танца «Прасніца» Палаца культуры вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» імя Леніна, народны ансамбль танца Палаца культуры вытворчага аб'яднання шаўковых тканін г. Магілёва, народны хор народнай песні Бялыніцкага РДК.

15 ліпеня, 19.50

Адбудзецца сустрэча з калектывам Омскага акадэмічнага тэатра драмы.

16 ліпеня, 18.15

ЗАПРАШАЕ ЧАСОПІС «БЕЛАРУСЬ»

«Бюракратам не патрэбна культура. Культура развіваецца па законах свабоды і творчасці, а ў яе асяроддзі вырастаюць людзі, якія супраць бюракратыі», — гаворыць удзельнік перадачы кандыдат мастацтвазнаўства З. Пазняк. Яго нарыс «Вежы старых муроў», надрукаваны ў сёмым нумары часопіса, узнімае праблему аховы нашай нацыянальнай культурнай і гістарычнай спадчыны.

Вядучы — галоўны рэдактар А. Шабалін.

16 ліпеня, 20.10

«ЗГАДКІ БЫВАЛАГА СЕЛЯНІНА»

Інсцэніроўка паводле гумарыстычных апавяданняў Ядвігіна Ш. Ролю селяніна выконвае народны артыст БССР Г. Аўсяннікаў.

18 ліпеня, 13.05

«СЛОВА — ПАЭЗІІ»

У перадачы «У шуме жытняга святла» вы сустрэнецеся з паэзіяй лаўрэата Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы Я. Янішчыц. Стваральнікі перадачы падрыхтавалі міні-спектакль па лірычных вершах паэтэсы, якія прачытае артыстка Г. Кухальская.

18 ліпеня, 17.05

«НЕЗАБЫЎНАЯ СТАРОНКА ГІСТОРЫІ»

4-га мая 1917 года ў Петраградзе пачаў работу Першы ў гісторыі Расіі Усерасійскі з'езд сялянскіх дэпутатаў, сярод якіх было амаль 80 паслянцоў Беларусі. Узначальваў дэлегацыю «беспартыйны Міхайлаў» — Міхаіл Васільевіч Фрунзе, які быў у той час на нелегальным становішчы.

Пра гэтыя дні і падзеі пойдзе размова ў перадачы. І вы пачуеце таксама расказ пра аднаго з беларускіх дэлегатаў, якім быў ураджэнец Глуска — Ф. М. Караткевіч, чалавек цікавага і складанага лёсу.

18 ліпеня, 19.55

ТЭЛЕВІЗІЙНЫ ВЕРНІСАЖ.

Дэбют. У. Солтан. Канцэрт для віяланчэлі з аркестрам.

18 ліпеня, 22.55

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ»

Вы сустрэнецеся з пераможцамі конкурсу сімпатый гледачоў: Я. Сіпавічусам, Л. Вайкуле, групамі «Блюз», «Ронда», «Модэн токін», «Брэйк», У. Кузьміным, ансамблем «Еўропа», ансамблем «Караван».

19 ліпеня, 15.55

«ТЭАТР І ЧАС».

Дыялогі з лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР драматургам А. Петрашкевічам.

Размова пойдзе аб месцы тэатра і драматурга ў грамадстве ў час перабудовы.

Гутарку вядзе кандыдат мастацтвазнаўства В. Ракіцкі.

19 ліпеня, 19.50

«У НЯДЗЕЛЮ ВЕЧАРАМ».

Выступае ансамбль «Валачобнікі» Мінскага інстытута культуры.

19 ліпеня, 21.40

«МІНСК-87».

Рэпартаж аб мастацка-спартыўным свяце горада.

У «КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА»

П. БРОЎКА. Збор твораў у дзевяці тамах. Том І. Мн., «Мастацкая літаратура», 1987. — 2 р. 40 к.

А. КАВАЛЮК. Імгненняў след. Мн., «Мастацкая літаратура», 1987.— 35 к.

Б. КЛЕЙН. Час выбару. На рускай мове. Мн., «Народная асвета», 1987. — 35 к.

Я. СІПАКОЎ. І сёння стане заўтра. Пераклад з беларускай. М., «Советский писатель», 1987. — 2 р. 10 к.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 02221 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела публіцыстыкі і нарыса — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела культуры і выяўленчага мастацтва — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і тэлебачання — 33-21-53, аддзела музыкі — 33-21-53, аддзела пісьмаў — 33-24-62, аддзела інфармацыі—33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і фотаілюстрацый — 33-44-04, 33-24-62, карэктарскай — 32-20-64, бухгалтэрыі — 23-73-37.

Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы (праз два інтэрвалы). Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Рычард СМОЛЬСКІ, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.